БЕЛАРУСКАЯ МОВА

ФАКУЛЬТАТЫЎНЫЯ ЗАНЯТКІ

Г. М. Валочка, В. У. Зелянко

# ВЫВУЧАЕМ БЕЛАРУСКІ ПРАВАПІС

## 5—9 КЛАСЫ

Вучэбна-метадычны комплекс

*Рэкамендавана*
*Навукова-метадычнай установай*
*«Нацыянальны інстытут адукацыі»*
*Міністэрства адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2010

УДК 373.5.016:811.161.3
ББК 74.286.1Беи
В15

*Серыя заснавана ў 2010 годзе*

**Валочка, Г. М.**

В15 Вывучаем беларускі правапіс. 5—9 кл. : вучэб.-метад. комплекс / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2010. — 176 с. — (Беларуская мова. Факультатыўныя заняткі).

ISBN 978-985-465-767-7.

Вучэбна-метадычны комплекс «Вывучаем беларускі правапіс» прызначаны для правядзення факультатыўных заняткаў па беларускай мове ў пераходны перыяд па рэалізацыі палажэнняў Закона Рэспублікі Беларусь «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» ад 23 ліпеня 2008 г. Змешчаны ў комплексе тэарэтычны і практычны матэрыял спрыяе засваенню змен, якія адбыліся ў беларускай арфаграфіі, і забяспечвае замацаванне і сістэматызацыю ведаў, уменняў і навыкаў вучняў, удасканаленне арфаграфічнай пісьменнасці.

**УДК 373.5.016:811.161.3**
**ББК 74.286.1Беи**

**ISBN 978-985-465-767-7**

© Валочка Г. М., Зелянко В. У., 2010
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2010

# ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА

## Тлумачальная запіска

З 1 верасня 2010 г. уступае ў дзеянне Закон Рэспублікі Беларусь «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі», прыняты Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 24 чэрвеня 2008 г., адобраны Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 28 чэрвеня 2008 г. і падпісаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь 23 ліпеня 2008 г. Міністэрствам адукацыі вызначаны пераходны перыяд па рэалізацыі палажэнняў Закона — 3 гады (з верасня 2010 г. па жнівень 2013 г.). Праграма прызначана для арганізацыі і правядзення факультатыўных заняткаў па беларускай мове ў пераходны перыяд і можа быць выкарыстана ў 5—9 класах.

Арфаграфічная пісьменнасць з'яўляецца адным з паказчыкаў маўленчай і агульнай культуры чалавека. Для таго каб авалодаць арфаграфіяй, неабходны добра развіты маўленчы слых, веданне граматыкі, валоданне аналітыка-сінтэтычнымі ўменнямі, актыўнае валоданне дастатковым запасам лексікі, развітыя памяць, мысленне.

Праца па арфаграфіі можа праходзіць паспяхова толькі тады, калі яна праводзіцца ў непарыўным адзінстве з вывучэннем фанетыкі, лексікі, словаўтварэння, граматыкі, развіццём маўлення вучняў. Недахопы ў арфаграфічнай пісьменнасці, як правіла, сведчаць пра недастатковае развіццё маўлення вучняў, неразуменне імі значэнняў слоў, іх частак, сэнсавых і граматычных адносін паміж словамі. Таму паслабленне ўвагі да любога ўзроўню моўнай сістэмы ўплывае на фарміраванне канкрэтных маўленчых уменняў, у прыватнасці, арфаграфічных уменняў і навыкаў.

Ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму навучанне арфаграфіі беларускай мовы павінна арыентавацца на пераадоленне міжмоўнай інтэрферэнцыі, у прыватнасці, на размежаванне фанетычнага прынцыпу беларускага правапісу і марфалагічнага прынцыпу рускай арфаграфіі (бел. *жыццярадасны* — рус. *жизнерадостный*).

**Мэта** прапанаваных факультатыўных заняткаў заключаецца ў павышэнні арфаграфічнай пісьменнасці вучняў, развіцці культуры пісьма.

**Задачы** факультатыўных заняткаў:

• замацаваць, паглыбіць і сістэматызаваць веды вучняў па арфаграфіі беларускай мовы з апорай на веды па іншых раздзелах (фанетыка, лексіка, састаў слова і словаўтварэнне, граматыка, тэкст);

• удасканальваць арфаграфічную пісьменнасць вучняў;

• сфарміраваць разуменне таго, што арфаграфічная пісьменнасць з'яўляецца адным з паказчыкаў маўленчай і агульнай культуры асобы, сведчыць пра адукаванасць чалавека.

Тэарэтычны матэрыял, вывучаны ў папярэдніх класах, паўтараецца на факультатыўных занятках шляхам арганізацыі падагульняльных гутарак і арфаграфічнага разбору слоў, які прадугледжвае выяўленне ўзаемасувязі фанетычнай і (або) марфалагічнай характарыстык слова з яго правапісам. Пры выкананні разнастайных відаў моўнага разбору ўзмацняецца іх практычная накіраванасць на авалоданне арфаграфічнай пісьменнасцю: аналізуючы фанетычны склад слова, вучань указвае магчымыя варыянты яго пераносу, называе арфаграмы, якія падпарадкоўваюцца фанетычнаму, марфалагічнаму прынцыпам правапісу; пры марфемным, словаўтваральным і марфалагічным разборы слоў тлумачацца асаблівасці іх напісання, абумоўленыя марфемнай будовай (напрыклад, пасля прыставак, якія заканчваюцца на зычны, перад літарамі ***е***, ***ё***, ***ю***, ***я***, ***і*** пішацца апостраф: *без'языкі*), словаўтварэннем (напрыклад, пішуцца праз злучок словы, утвораныя шляхам паўтору: *ціха-ціха*).

Праца па арфаграфіі праводзіцца паралельна з працай над тэкстам (у форме тлумачэння арфаграм, спісвання (выбарачнага, ускладненага і інш.), групоўкі прыкладаў на пэўныя правілы арфаграфіі і да т. п.).

Сістэматызацыя ведаў па арфаграфіі і ўдасканаленне на гэтай аснове адпаведных уменняў і навыкаў прадугледжвае выкарыстанне на факультатыўных занятках разнастайных ***метадаў*** і ***прыёмаў***:

• арфаграфічны разбор слоў, які праводзіцца ў наступнай паслядоўнасці:

1) запіс слова, абазначэнне націску, падкрэсліванне арфаграм;

2) вызначэнне тыпу арфаграмы (якому правілу падпарадкоўваецца);

3) фармулёўка правіла, падбор прыкладаў на гэтае правіла;

4) указанне прынцыпу напісання;

• пабудова абагульняльных схем і складанне табліц (напрыклад, схема «Правапіс спалучэнняў зычных на стыку марфем», табліца «Правапіс і вымаўленне звонкіх і глухіх, шыпячых і свісцячых зычных»);

• семантычны аналіз выказвання і пошук адэкватных пісьмовых сродкаў для выражэння сэнсу (напрыклад, *Белае возера* — назва возера, *Белы Двор* — назва вёскі);

• праца з арфаграфічнымі слоўнікамі і даведнікамі;

• арфаграфічны аналіз структурна-семантычных схем слоў (або словаўтваральных мадэлей), які развівае здольнасць прадбачыць арфаграфічныя цяжкасці, абумоўленыя марфемнай будовай слова;

• пабудова алгарытмаў дзеянняў па размежаванні моўных з'яў (напрыклад, алгарытмы «Мяккі знак у прыметніках перад суфіксам -*ск*-») з наступным выкананнем практыкаванняў на іх аснове;

• выкананне тэставых заданняў па арфаграфіі і інш.

## Змест курса
## (35 гадзін на год)

### Уводзіны
### (1 гадзіна)

Арфаграфія як сістэма агульнапрынятых правілаў напісання слоў і іх формаў. Прынцыпы сучаснай беларускай арфаграфіі: фанетычны прынцып, яго апора на беларускае літаратурнае вымаўленне; марфалагічны прынцып, яго значэнне для хуткага разумення і асэнсавання напісанага; традыцыйныя і дыферэнцыйныя напісанні.

Замацаванне арфаграфічных нормаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы ў арфаграфічных слоўніках і даведніках.

### Правапіс галосных
### (10 гадзін)

Правапіс галосных ***о***, ***э***, ***а***. *Роля націску пры напісанні* ***о***, ***э***, ***а***. *Адлюстраванне на пісьме чаргаванняў* [ро] — [ры], [ло] — [лы] (*бровы — брыво, глотка — глытаць*). *Перадача на пісьме ненаціскнога* [э] *ў запазычаных словах* (*экзамен, рэкорд*).

Правапіс галосных ***е***, ***ё***, ***я***. *Роля націску пры выбары арфаграм* ***е — я***. *Нарматыўнае вымаўленне часціцы* ***не*** (*не сеяў — не пасеяў*), *прыназоўніка* ***без*** (*без солі — без вады*).

Правапіс галосных ***о***, ***э***, ***а***, ***е***, ***ё***, ***я*** ў складаных словах. *Роля націску ў другой частцы складанага слова пры напісанні арфаграм* ***о — а***, ***ё — е*** *ў першай частцы* (*добразычлівы — дабраякасны, лёгкаатлетычны — легкадумны*). *Умовы выбару злучальных галосных* ***о***, ***ё***, ***а***, ***е***, ***я*** (*ільновалакно, баяздольны*).

Правапіс спалучэнняў галосных ***іё*** (***ыё***), ***ія*** (***ыя***), ***іе*** (***ые***), ***іо*** (***іа***), ***ео*** (***еа***), ***эо*** (***эа***) у іншамоўных словах. *Напісанне* ***іо*** (***іа***) *у пачатку слоў* (*іон, іанізацыя*). *Перадача гукавога спалучэння* **[й]** *з галоснымі ў словах іншамоўнага паходжання ётаванымі галоснымі* (*маянэз, ёгурт, Нью-Ёрк*).

Правапіс прыстаўных галосных ***і***, ***а***.

Правапіс літар ***і***, ***ы***, ***й***.

*Цяжкія выпадкі ў прымяненні арфаграфічных правілаў, якія рэгулююць правапіс галосных. Вызначэнне правапісу такіх слоў па слоўніку.*

## Правапіс зычных
## (10 гадзін)

Правапіс і вымаўленне звонкіх і глухіх, шыпячых і свісцячых зычных.

Правапіс спалучэнняў зычных на стыку кораня і суфікса, прыстаўкі і кораня.

Правапіс ***д*** і ***дз***, ***т*** і ***ц***. *Захаванне **д** у складзе прыстаўкі і **т** у складзе суфікса перад мяккім* **[в']** (*адвезці, у агенцтве*). *Напісанне* ***дз, ц*** *перад суфіксамі* (*спалучэннямі*) ***-ін-***, ***-ір-***, ***-ік-***, ***-ёр-***, ***-еец-***, ***-ейск-*** (*камандзір, білецёр, гвардзейскі*). ***Дз*** *і* ***ц*** *у некаторых словах іншамоўнага паходжання* (*бардзюр, уверцюра*).

Правапіс падоўжаных зычных. *Адсутнасць падвоеных літар у запазычаных словах (тэрыторыя, піца).*

Правапіс некаторых спалучэнняў зычных. Спрашчэнне спалучэнняў зычных ***здн — зн***; ***згн — зн***; ***стн***, ***сцн — сн***; ***скн — сн***; ***стл***, ***сцл — сл***; ***рдн — рн*** (*праязны*, *кантрасны*, *міласэрны*).

Правапіс прыстаўных і ўстаўных літар ***в***, ***г***.

Правапіс літар ***у***, ***ў***.

*Цяжкія выпадкі ў прымяненні арфаграфічных правілаў, якія рэгулююць правапіс зычных. Вызначэнне правапісу такіх слоў па слоўніку.*

## Правапіс мяккага знака і апострафа
## (3 гадзіны)

Змякчальны мяккі знак як сродак абазначэння мяккасці папярэдняга зычнага.

Правапіс раздзяляльнага мяккага знака і апострафа.

*Цяжкія выпадкі ў прымяненні арфаграфічных правілаў, якія рэгулююць правапіс мяккага знака і апострафа. Вызначэнне правапісу такіх слоў па слоўніку.*

## Ужыванне вялікай і малой літар
## (4 гадзіны)

Вялікая і малая літары ў асабовых назвах; у прыметніках, утвораных ад асабовых назваў; у геаграфічных і астранамічных назвах.

Вялікая і малая літары ў назвах дзяржаўных органаў і іншых арганізацый; у найменнях пасад і званняў.

Вялікая і малая літары ў назвах дзяржаўных і нацыянальных сімвалаў, рэліквій, дзяржаўных узнагарод; у назвах дакументаў, унікальных прадметаў, твораў.

Вялікая і малая літары ў назвах знамянальных падзей і дат, перыядаў і эпох, свят.

*Цяжкія выпадкі ў прымяненні арфаграфічных правілаў, якія рэгулююць ужыванне вялікай і малой літар.*

## Агульныя правілы напісання слоў разам і праз злучок (2 гадзіны)

## Правілы пераносу слоў (1 гадзіна)

## Падагульненне вывучанага (4 гадзіны)

Падагульняльны тэст па арфаграфіі і яго аналіз.

## Прагназуемыя вынікі

Вучні павінны **ведаць**:

- сістэму правілаў беларускай арфаграфіі;
- прынцыпы беларускай арфаграфіі;
- арфаграфічныя слоўнікі і даведнікі беларускай мовы.

Вучні павінны **ўмець**:

- захоўваць арфаграфічныя нормы ва ўласных выказваннях;
- размяжоўваць фанетычныя, марфалагічныя, традыцыйныя, дыферэнцыйныя напісанні;
- выяўляць асаблівасці слоў (фанетычныя, структурныя, марфалагічныя, семантычныя), ад якіх залежыць выбар арфаграмы;
- карыстацца арфаграфічнымі слоўнікамі і даведнікамі;
- аналізаваць асаблівасці ўжывання адзінак мовы ў пісьмовым маўленні з пункта погляду захавання арфаграфічных нормаў;
- валодаць разнастайнымі прыёмамі прымянення правілаў; адрозніваць націскныя і ненаціскныя склады; правільна ўспрымаць фанетычны і марфемны склад слова; кваліфікаваць ролю слова ў словазлучэнні, сказе і тэксце.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ

## Прыкладнае тэматычнае планаванне вучэбнага матэрыялу (35 гадзін на год)

| №<br>п/п | Тэма заняткаў | Коль-<br>касць<br>гадзін |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| 1 | Уводзіны | 1 |
| | ***Правапіс галосных***<br>(*10 гадзін*) | |
| 2, 3 | Правапіс галосных ***о***, ***э***, ***а*** | 2 |
| 4, 5 | Правапіс галосных ***е***, ***ё***, ***я*** | 2 |
| 6, 7 | Правапіс галосных ***о***, ***э***, ***а***, ***е***, ***ё***, ***я*** ў складаных словах | 2 |
| 8, 9 | Правапіс спалучэнняў галосных ***іё*** (***ыё***), ***ія*** (***ыя***), ***іе*** (***ые***), ***іо*** (***іа***), ***ео*** (***еа***), ***эо*** (***эа***) у іншамоўных словах | 2 |
| 10 | Правапіс прыстаўных галосных ***і***, ***а*** | 1 |
| 11 | Правапіс літар ***і***, ***ы***, ***й*** | 1 |
| | ***Правапіс зычных***<br>(*10 гадзін*) | |
| 12 | Правапіс і вымаўленне звонкіх і глухіх, шыпячых і свісцячых зычных | 1 |
| 13 | Правапіс спалучэнняў зычных на стыку кораня і суфікса, прыстаўкі і кораня | 1 |
| 14, 15 | Правапіс ***д*** і ***дз***, ***т*** і ***ц*** | 2 |
| 16 | Правапіс падоўжаных зычных | 1 |
| 17 | Правапіс некаторых спалучэнняў зычных | 1 |
| 18, 19 | Правапіс прыстаўных і ўстаўных літар ***в***, ***г*** | 2 |
| 20, 21 | Правапіс літар ***у***, ***ў*** | 2 |

| 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|
| ***Правапіс мяккага знака і апострафа*** (*3 гадзіны*) | | |
| 22 | Змякчальны мяккі знак як сродак абазначэння мяккасці папярэдняга зычнага | 1 |
| 23, 24 | Правапіс раздзяляльнага мяккага знака і апострафа | 2 |
| ***Ужыванне вялікай і малой літар*** (*4 гадзіны*) | | |
| 25 | Вялікая і малая літары ў асабовых назвах; у прыметніках, утвораных ад асабовых назваў; у геаграфічных і астранамічных назвах | 1 |
| 26 | Вялікая і малая літары ў назвах дзяржаўных органаў і іншых арганізацый; у найменнях пасад і званняў | 1 |
| 27 | Вялікая і малая літары ў назвах дзяржаўных і нацыянальных сімвалаў, рэліквій, дзяржаўных узнагарод; у назвах дакументаў, унікальных прадметаў, твораў | 1 |
| 28 | Вялікая і малая літары ў назвах знамянальных падзей і дат, перыядаў і эпох, свят | 1 |
| ***Агульныя правілы напісання слоў разам і праз злучок*** (*2 гадзіны*) | | |
| 29, 30 | Агульныя правілы напісання слоў разам і праз злучок | 2 |
| ***Правілы пераносу слоў*** (*1 гадзіна*) | | |
| 31 | Правілы пераносу слоў | 1 |
| ***Падагульненне вывучанага*** (*4 гадзіны*) | | |
| 32—35 | Падагульненне вывучанага | 4 |

## Уводзіны

**Мэта заняткаў** — узнавіць і сістэматызаваць веды вучняў пра арфаграфію як раздзел мовазнаўства і сістэму правілаў перадачы вуснага маўлення на пісьме; развіваць уменне размяжоўваць напісанні, заснаваныя на фанетычным і марфалагічным прынцыпах беларускай арфаграфіі.

Азнаямленне школьнікаў з тэарэтычным матэрыялам, змешчаным у дапаможніку для вучняў, можа суправаджацца складаннем схемы «Прынцыпы арфаграфіі»:

**Фанетычны прынцып**
(напісанне слова адпавядае яго літаратурнаму вымаўленню: *б**я**роза*, *к**а**лоссе*)

**Марфалагічны прынцып**
(прадугледжвае аднастайнае напісанне марфем; вымаўленне і напісанне слова не супадаюць: *про**с**ьба*, *добру**ш**скі*)

**ПРЫНЦЫПЫ АРФАГРАФІІ**

**Традыцыйныя напісанні**
(перадаюцца па традыцыі і не адпавядаюць сучасным нормам пісьма: *г**е**рой*, *ра**с**ада*)

**Дыферэнцыйныя напісанні**
(служаць для графічнага адрознення слоў з аднолькавым гучаннем, але розным значэннем: ***т**анк* — ***Т**анк* (*псеўданім*), *Барысав**ы**м* (*прозвішча*) — *Барысав**а**м* (*горад*))

Паколькі ў дапаможніку для вучняў паведамляецца пра асноўныя прынцыпы беларускага правапісу (фанетычны і марфалагічны), настаўніку варта пазнаёміць вучняў з традыцыйнымі і дыферэнцыйнымі напісаннямі.

*Традыцыйныя напісанні* ўсталяваліся ў мінулым і не адпавядаюць сучасным нормам пісьма (выключэнні з правілаў): *рады**у**с*, *да **У**ладзіслава*, *к**е**фір*, *п**е**рсона*, *ра**с**ол*, *ра**с**аднік* ‘месца, скрынка для вырошчвання расады’ і інш.

*Дыферэнцыйныя напісанні* служаць для графічнага адрознення слоў (формаў слоў), якія гучаць аднолькава, але маюць розныя значэнні: *ліпень* (месяц) і *Ліпень* (прозвішча), *зрабіў збольшага* (прыслоўе) і *сабраў парэчкі з большага куста* (прыназоўнік з прыметнікам) і інш.

На ўводных занятках удакладняецца разуменне вучнямі тэрміна **арфаграма** (грэч. orthos 'правільны', gramma 'пісьмовы знак, літара') — правільнае напісанне, якое выбіраецца з шэрагу магчымых і адпавядае правілам арфаграфіі або традыцыі.

Трэба пазнаёміць школьнікаў з **парадкам і ўзорам арфаграфічнага разбору слова**:

1. Запісаць слова, абазначыць націск, падкрэсліць арфаграмы.
2. Вызначыць тып арфаграмы (на якое правіла).
3. Сфармуляваць правіла напісання арфаграмы. Прывесці прыклады на гэтае правіла.
4. Указаць прынцып напісання[1].

***Узор***: *с п а з н і́ ц ц а*

— напісанне літары *с* адпавядае правілу «Правапіс прыставак на з-, *с*-»: прыстаўка *с*- пішацца перад літарай, якая абазначае глухі зычны гук (*скінуць*, *схапіць*, *стрымаць*); фанетычны прынцып;

— напісанне літары *а* адпавядае правілу «Перадача акання на пісьме»: не пад націскам пішацца літара *а* (*халады*, *пчала*, *чарнець*); фанетычны прынцып;

— напісанне спалучэння *зн* адпавядае правілу «Правапіс спалучэнняў *зн*, *сн*, *сл*, *рн*, *нц*, *рц*»: на месцы гістарычнага спалучэння *здн* пішацца *зн* (*праязны*, *выязны*, *позна*); фанетычны прынцып;

— напісанне спалучэння *зн* адпавядае таксама правілу «Правапіс мяккага знака»: пасля літары *з* мяккі знак не пішацца, таму што ў аднакаранёвым слове *позна* мяккасць зычных не захоўваецца (*у сне — сны*, *звінець — звон*, *шэсць — шосты*); марфалагічны прынцып;

— напісанне спалучэння *цц* адпавядае правілу «Напісанне *цц* у зваротнай форме інфінітыва»: у зваротнай форме інфінітыва пішуцца літары *цц* (*клапаціцца*, *ажаніцца*, *хвалявацца*).

На кожных занятках варта прапаноўваць вучням для арфаграфічнага разбору 2—3 словы, у якіх ёсць не менш за дзве арфаграмы (можна выкарыстоўваць словы, уключаныя ў тэарэтычны або практычны матэрыял дапаможніка для вучняў).

У выказванні В. Віткі (практыкаванне 1) гаворка ідзе пра фанетычны прынцып беларускай арфаграфіі («як гаворыцца, так і пішацца»). Важна, каб вучні ўсвядомілі, што беларускі правапіс грунтуецца не толькі на фанетычным, але і на марфалагічным прынцыпе, які патрабуе аднастайнай, незалежнай ад вымаўлення перадачы марфем на пісьме.

[1]*Кулікові, У.* Урокі арфаграфіі: Урок 1. Арфаграфія як раздзел мовазнаўства / У. Кулікович // Роднае слова. — 2008. — № 11. — С. 41.

Пры размеркаванні вучнямі слоў па групах у адпаведнасці з фанетычным і марфалагічным прынцыпамі арфаграфіі (практыкаванне 2) настаўніку варта звярнуць увагу школьнікаў на тое, што ў адным слове могуць сустракацца напісанні, заснаваныя як на фанетычным, так і на марфалагічным прынцыпах. Напрыклад, у слове *нясвіжскі* напісанне літары *я* заснавана на фанетычным прынцыпе арфаграфіі, напісанне спалучэнняў зычных *св* (адсутнасць мяккага знака) і *жс* — на марфалагічным прынцыпе.

У словах-адгадках (практыкаванне 3) школьнікі знаходзяць арфаграмы і вусна тлумачаць іх (а д г а д к і: 1 — *дождж*, 2 — *грыб*, 3 — *ледзяшы*, 4 — *воблака*, 5 — *лыжка*, 6 — *год*, 7 — *снег*). ***Узор*** тлумачэння: «У слове *дождж* адбываецца аглушэнне звонкага зычнага [дж] на канцы слова (вымаўляем [ч]) і аглушэнне звонкага [ж] перад глухім [ч] (вымаўляем [ш]), што на пісьме не адлюстроўваецца».

З тэксту паводле М. Маляўкі (практыкаванне 4) вучні павінны выпісаць словы, напісанне якіх заснавана на фанетычным (*цешацца*, *вяскоўцы*, *пры хаце* і інш.) і марфалагічным (*высцілаюць*, *зверху*, *дождж* і інш.) прынцыпах. Змест тэксту дае падставу звярнуць увагу школьнікаў на тое, што бусел — сімвал Беларусі. Настаўнік можа працытаваць радкі з нарыса У. Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі»: «Над усёй нашай краінай, наставіўшы белыя ветразі крылаў, плануюць буслы. Іх многія і многія тысячы — хто лічыў? На вільчыках сялянскіх хат, на дрэвах, на калонах старых разбураных палацаў, на слупах капліц сярод маладога зялёнага жыта. Гнёзды паўсюль. І таму мне здаецца, што... зямлю нашу, Беларусь, можна назваць “зямлёю пад белымі крыламі”... Да пэўнай ступені бусел — сімвал Беларусі... Вось так і плануюць, плануюць буслы. Ветразі іхнія раскрылены над дрэвамі, пушысты хвост, як веерам, накрыў выцягнутыя ногі»[2].

Варта пазнаёміць вучняў з зычэннем «*Няхай жыве беларуская птушка бацян!*», якое ўжываецца як пажаданне поспеху каму-небудзь у справах, росквіту чаго-небудзь; прыказкай «*Дзе бусел вядзецца, там шчаслівае месца*».

Практыкаванне 5 прапануецца для самастойнага выканання. Дадатковае заданне можа заключацца ў падрыхтоўцы вучнямі вусных выказванняў на тэму «Цікавыя мясціны роднага горада (роднай вёскі)». Пры неабходнасці рэкамендуецца выкарыстаць літаратурна-мастацкія выданні з серыі «Твае гарады, Беларусь».

[2] *Караткевіч, У.* Зямля пад белымі крыламі / У. Караткевіч // Зямля пад белымі крыламі : нарыс. Дзікае паляванне караля Стаха : аповесць. — Мінск, 1995. — С. 4.

# Правапіс галосных

## Правапіс галосных *о, э, а*

**Мэта заняткаў** — узнавіць і ўдакладніць веды вучняў аб правапісе галосных ***о***, ***э***, ***а***; удасканальваць навык перадачы акання на пісьме.

Пры засваенні правіла правапісу галосных *о*, *э*, *а* неабходна асаблівую ўвагу звярнуць на тое, што зараз гэтае правіла не мае выключэнняў, як у «Правілах» 1959 года. Словы з ненацiскным канцавым *о* (*адажыо*, *сальфеджыо*, *трыо* і інш.), якія паводле правілаў 1959 года пісаліся з *о*, перастаюць быць выключэннямі і пішуцца з канцавым *а*: *адажыа*, *сальфеджыа*, *трыа*, *партфоліа*, *Токіа*, *Ватэрлоа* і г. д.

Змены адбыліся і ў правапісе слоў іншамоўнага паходжання з канцавымі ненацiскнымі -*эль*, -*эр*, у якіх паводле правілаў 1959 г. захоўвалася нязменнае напісанне гэтых частак. У новай рэдакцыі «Правілаў» на напісанне гэтых слоў і вытворных ад іх паслядоўна распаўсюджваецца агульны прынцып адлюстравання акання на пісьме: *аўтсайдар* (*аўтсайдарскі*), *бартар* (*бартарны*), *бухгалтар*, *дэкодар, майстар*, *прынтар* (*прынтарны*), *камп'ютар* (*камп'ютарны*, *камп'ютаршчык*), *кандытар* (*кандытарскі*), *світар*, *фарватар* (*фарватарны*), *шніцаль*, *эспандар* і г. д.

Пры знаёмстве са змешчаным у дапаможніку для вучняў тэарэтычным матэрыялам можна прапанаваць школьнікам дапоўніць яго ўласнымі прыкладамі слоў, што ілюструюць розныя выпадкі правапісу літар *о*, *э*, *а*. У сшытках вучняў можа з'явіцца наступны запіс:

1) *слоўнік*, *паліто*, *оптыка*; 2) б) *гэтакі*; в) *пачэсны*, *цэгла*, *крэйда*; г) *этыка*, *эстрада*, *элементарны*; д) *рэзюмэ, Морзэ*; е) *мэтанакіраваны*, *рэдказубы*, *тэлебачанне*; 3) *добры — дабрыня*, *шэры — шараваты*; *баранаваць*, *папараць*, *фальварак*; 4) *крошка — крышыць*, *гром — грымоты*, *брод — брысці*; *брызентавы*, *бесцырымонна*, *канцылярскі*; 5) *шніцаль*, *форталь*, *тэндар*.

Для таго каб удакладніць разуменне вучнямі сэнсу некаторых іншамоўных слоў, даецца заданне знайсці сярод прыкладаў, што прыводзяцца ў тэарэтычным матэрыяле, назоўнікі, якія маюць наступныя лексічныя значэнні:

а) 'шыйная хустка або шалік' (*кашнэ*); б) 'афіцыйнае паведамленне, пераважна па пытаннях міжнароднага значэння' (*камюніке*); в) 'невялікая чыгуначная платформа або ваганетка, якая прыводзіцца ў рух уручную або рухавіком; выкарыстоўваецца для перавозкі людзей і грузаў на невялікую адлегласць' (*дрызіна*); г) '1) гераічныя народ-

ныя паданні; 2) апавядальны род мастацкай літаратуры ў адрозненне ад лірыкі ці драмы' (*эпас*); д) '1) павольны музычны тэмп; 2) музычны твор або яго частка ў такім тэмпе; 3) павольная частка сольнага або дуэтнага балетнага танца' (*адажыа*).

На аснове тэксту паводле У. Бутрамеева (практыкаванне 6) вучні практыкуюцца ў знаходжанні слоў, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс галосных *о*, *э*, *а*». Для таго каб школьнікі правільна назвалі арфаграмы ў выдзеленых словах (*магнацкі*, *Княстве*, *мясцін*, *развітанне*), варта акцэнтаваць іх увагу на тым, што арфаграма ёсць там, дзе ёсць выбар: у пэўнай частцы слова трэба выбраць адзін варыянт з шэрагу магчымых. Так, у слове *магнацкі* арфаграмай з'яўляецца літара *ц* (выбіраем, што пісаць: *ц* ці *тс*).

Пры выкананні вучнямі дадатковага задання (растлумачыць розніцу ў лексічных значэннях слоў *скарбніца* і *скарбонка*) настаўніку трэба звярнуць увагу на тое, што пары слоў тыпу *скарбніца* 'сукупнасць культурных каштоўнасцей; месца іх захоўвання; крыніца чаго-небудзь' і *скарбонка* 'невялікая скрыначка з вузкай шчылінай для апускання манет з мэтай іх накаплення' называюцца паронімамі. Замацаванню ўмення адрозніваць лексічныя значэнні паронімаў будзе спрыяць заданне запісаць сказы пад дыктоўку, выбіраючы з дужак патрэбнае па сэнсе слова, і растлумачыць правапіс галосных *о*, *э*, *а* ў гэтых словах:

1) *Утраіх спыніліся каля* (*рэгуліровачнага / рэгулярнага*) *паста, дзе сярод вуліцы стаяла русявая загарэлая дзяўчына са сцяжкамі* (І. Мележ). 2) *Мужчына хутка, па-вайсковаму надзеў* (*трэніраваны / трэніровачны*) *касцюм, абуў кеды і лёгенька, паволі пабег па сцежцы* (А. Жук). 3) *За мястэчкам* (*стральба / стрэльба*) *чутна была да самай раніцы* (К. Чорны). 4) *Пусцеў бераг, знікалі з вачэй* (*здробненыя / здрабнелыя*) *кропкі баркасаў...* (В. Карамазаў). 5) (*Вытворчыя / вытворныя*) *майстэрні вучылішча размяшчаюцца ў дрэваапрацоўчым цэху завода* (М. Даніленка).

Адказы: 1) *рэгуліровачнага*, 2) *трэніровачны*, 3) *стральба*, 4) *здрабнелыя*, 5) *вытворчыя*.

Практыкаванні 7—9 могуць быць прапанаваны для самастойнага выканання. Пасля праверкі правільнасці выканання практыкавання 7 настаўнік дае заданне падкрэсліць сярод слоў тыя, што адпавядаюць наступным лексічным значэнням:

а) 'музычны твор для трох галасоў або музычных інструментаў з самастойнай партыяй у кожнага выканаўцы; ансамбль з трох выканаўцаў (спевакоў або музыкантаў)' (*трыа*);

б) 'узорны, выдатны твор мастацтва' (*шэдэўр*);

в) ‘белыя рыхлыя крышталікі, формай падобныя да сняжынак, якія нарастаюць пры значным марозе і тумане на галінах дрэў, дроце і пад.; *перан.* сівізна; змрок, цемра’ (*шэрань*);

г) ‘хлеў або павець для дроў’ (*дрывотня*).

**Рубрыка «Назвы роднага краю»** знаёміць вучняў з тапонімамі, якія з’яўляюцца, згодна з Л. У. Юлдашавай, «люстэркам гісторыі малой радзімы»[3]. Іх вывучэнне цесна звязана з матэрыяльнай і духоўнай культурай народа і таму патрабуе ўліку не толькі лінгвістычных, але і гістарычных, геаграфічных, прыродных, сацыяльна-эканамічных і іншых фактараў, у выніку чаго «прачытваюцца невядомыя старонкі гісторыі народа, выяўляюцца забытыя словы роднай мовы, словы чужых і нават “мёртвых” моў, помнікі матэрыяльнай культуры, былыя арэалы рассялення таго ці іншага віду жывёл ці раслін, радовішчы карысных выкапняў»[4] і інш.

**Рубрыка «Правільнасць маўлення»** спрыяе ўсведамленню вучнямі таго, што арфаграфічныя нормы дазваляюць размяжоўваць сэнс аднолькавых або блізкіх па гучанні слоў і іх формаў. Так, пры знаёмстве школьнікаў са значэннямі слоў *ордэн* і *ордар* трэба звярнуць увагу на тое, што названыя словы з’яўляюцца паронімамі, а словы *ордэн* ‘асобы знак узнагароды за выдатныя заслугі’ і *ордэн* ‘арганізацыя, таварыства з пэўным статутам’, *ордар* ‘пісьмовае распараджэнне; дакумент на атрыманне, выдачу чаго-небудзь’ і *ордар* ‘разнавіднасць спалучэння, парадак размяшчэння частак архітэктурных канструкцый’ — амонімамі.

Выконваючы практыкаванне 10, вучні пры неабходнасці могуць карыстацца руска-беларускімі слоўнікамі.

Са словамі, выпісанымі з практыкавання 11, школьнікам можна прапанаваць скласці словазлучэнні (*вопытны тэрапеўт*, *сакавіты грэйпфрут*, *драўляны стэлаж* і інш.) і вызначыць від сінтаксічнай сувязі слоў у іх.

Практыкаванне 12 вучні выконваюць самастойна, пасля чаго адбываецца ўзаемаправерка ў парах. Можна прапанаваць школьнікам знайсці ў тэксце слова, амонімам да якога з’яўляецца назоўнік са значэннем ‘матчына або бацькава маці’ (*бабка* ‘грыб з цёмна-бурай шапкай на высокай ножцы; падбярозавік’).

---

[3] *Юлдашева, Л. В.* Методологические и методические аспекты проблемы языка как культурно-исторической среды / Л. В. Юлдашева // Рус. язык в школе. — 1990. — № 4. — С. 45.

[4] *Лемцюгова, В. П.* Анамастыка / В. П. Лемцюгова // Беларуская мова : энцыкл. / пад рэд. А. Я. Міхневіча. — Мінск, 1994. — С. 33.

Выкананне тэставых заданняў можа завяршацца складаннем вучнямі індывідуальных «Слоўнікаў арфаграфічных цяжкасцей», у якіх фіксуюцца словы (формы слоў), дзе былі дапушчаны памылкі.

## Правапіс галосных *е, ё, я*

**Мэта заняткаў** — узнавіць і ўдакладніць веды вучняў аб правапісе галосных ***е***, ***ё***, ***я***; удасканальваць навык перадачы якання на пісьме.

Пры засваенні правіла правапісу галосных *е*, *ё*, *я* неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на напісанне *я* замест *е* (*ё*) у першым складзе перад націскам у словах *дзявя́ты*, *дзяся́ты*, *дзяся́тка*, *дзяся́тнік*, *сямна́ццаць*, *сямна́ццаты*, *васямна́ццаць*, *васямна́ццаты*, *пяцьдзяся́т*, *пяцідзяся́ты*, *шэсцьдзяся́т*, *шасцідзяся́ты*, *сямідзяся́ты*, *васьмідзяся́ты* і некаторых іншых словах іншамоўнага паходжання.

Пасля вывучальнага чытання тэарэтычнага матэрыялу школьнікам даецца заданне запісаць па памяці 15—20 слоў, што прыводзяцца ў якасці прыкладаў для ілюстрацыі палажэнняў правіла аб правапісе галосных *е*, *ё*, *я*.

**Рубрыка «Правільнасць маўлення»** знаёміць вучняў з семантыкай першых частак складаных слоў *радыё-* 'які мае адносіны да радыё' і *радые-* (*радыя-*) 'які адносіцца да радыю, радыяцыі'. Для фарміравання ў школьнікаў умення размяжоўваць названыя часткі настаўнік прапануе запісаць пад дыктоўку словы ў два слупкі: 1) словы з першай часткай *радыё-*; 2) словы з першай часткай *радые-* (*радыя-*):

*Радыёрэпартаж*, *радыеэкалогія*, *радыёпрыёмнік*, *радыёрубка*, *радыебіялогія*, *радыяхімія*, *радыёантэна*, *радыеактыўнасць*, *радыёхваля*, *радыевугляродны*, *радыеадчувальны*, *радыёсігнал*, *радыёспектакль*, *радыяметрыя*, *радыёпазыўныя*, *радыеўстойлівы*, *радыёканцэрт*, *радыелячэнне*.

Практыкаванне 13 спрыяе фарміраванню ў вучняў умення знаходзіць у тэксце словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс галосных *е*, *ё*, *я*». Перад чытаннем тэксту трэба ўдакладніць разуменне вучнямі семантыкі слова *кушне́р* 'рамеснік, які вырабляе шкуры на футра і шые з футра'.

Выкананне практыкавання 14 можа суправаджацца **вусным каменціраваннем**: адзін з вучняў сцісла тлумачыць правапіс слоў з прапушчанымі літарамі. Заўважым, што каменціраванне нельга атаясамліваць з паскладовым прагаворваннем, якое «не звязана з актывізацы-

яй мысліцельнай дзейнасці, выкарыстоўваецца толькі тады, калі тую ці іншую арфаграму ніяк нельга растлумачыць, пракаменціраваць»[5].

Пасля выканання практыкавання 15 настаўнік можа прапанаваць вучням знайсці сярод прыведзеных слоў такі назоўнік, пры падборы адпаведніка да якога неабходна ўжыць словазлучэнне (*верашчака* — рус. *жидкое мучное блюдо*). Школьнікаў можа зацікавіць **этымалагічная даведка**:

— *Слова* апельсін *запазычана з галандскай мовы*, *дзе* апель — *яблык*, Сіна — *Кітай*; *літаральна* апельсін — *кітайскі яблык* (Паводле І. Шпадарука, В. Рудакоўскага).

Спісванне слоў з практыкавання 16 можа завяршыцца ўзаемаправеркай у парах (вучні алоўкам выпраўляюць памылкі, дапушчаныя аднакласнікамі), пасля чаго адбываецца калектыўная праверка правільнасці выканання задання.

Практыкаванні 17—19, 21 прапануюцца для самастойнага выканання. Сярод слоў, выпісаных з практыкавання 19, настаўнік прапануе знайсці тыя, што адпавядаюць наступным схемам (шэрым колерам пазначаны націскны склад, колькасць складоў у словах на схемах не адлюстравана):


(словы, у якіх у першым складзе перад націскам захоўваецца літара *е*: *Тэгеран*, *Херсон*, *манекен* і інш.);


(словы, у якіх *е* пішацца не ў першым пераднаціскным складзе: *верацяно*, *зазелянець*, *серыял* і інш.);


(словы, у якіх *е* пішацца ў паслянаціскным складзе: *высеяць*, *попел*, *вогнетушыцель*).

Дадатковыя заданні:

• Падбярыце сінонім да прыметніка *цягавіты* (*працавіты*).

• Які з прыведзеных у практыкаванні назоўнікаў ужываецца ў параўнанні «*глухі як...*»? (*цецярук*).

Пры падборы да слоў рускай мовы беларускіх адпаведнікаў (практыкаванне 20) настаўніку варта акцэнтаваць увагу вучняў на тым, што дзеясловы абодвух спражэнняў з націскнымі канчаткамі ў 2-й асобе множнага ліку маюць націск на апошнім галосным канчатка: *несяце́*, *ведзяце́*, *берац́е*, *крычыце́*, *маўчыце́*, *гледзіце́*[6]. Рускаму слову *смесь* у бе-

[5] *Власенков, А. И.* Обучение русской орфографии в школе с белорусским языком преподавания / А. И. Власенков. — Минск : Народная асвета, 1980. — С. 126.

[6] Кароткая граматыка беларускай мовы : у 2 ч. / навук. рэд. А. А. Лукашанец. — Мінск, 2007. — Ч. 1 : Фаналогія. Марфаналогія. Марфалогія. — С. 215.

ларускай мове адпавядаюць два назоўнікі: *мешаніна* (сукупнасць чагонебудзь разнароднага) і *сумесь* (сукупнасць рэчываў).

Праца над тэкстам паводле М. Маляўкі «Вячоркі» (практыкаванне 22) уключае адказ вучняў на пытанне «Чаму вячоркі маюць другую назву — попрадкі?» (*таму што ў такія вечары дзяўчаты звычайна пралі воўну або лён*). Настаўнік можа паведаміць, што вячоркі мелі яшчэ адну назву — *зборні*, бо вясковыя дзяўчаты збіраліся разам у адной хаце.

Тэкст паводле У. Караткевіча «Русальны тыдзень» (практыкаванне 23) прапануецца для **самадыктанта**: вучні спачатку запісваюць тэкст, афармляючы яго ў адпаведнасці з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі, пасля выконваюць самаправерку. Тэкст суправаджаецца дадатковым пытаннем «Калі ў народзе адзначаецца Русальны тыдзень?» (*Русальны тыдзень — гэта тыдзень пасля Тройцы*). Настаўнік можа паведаміць пра святкаванне Русальнага тыдня:

— *У народзе верылі, што на Русальным тыдні русалкі могуць зацягнуць людзей у свае ўладанні* (*таму ў гэтыя дні забаранялася купацца*), *а таксама могуць паспрыяць таму, каб на зямлю праліўся неабходны для палеткаў дождж. На працягу ўсяго Русальнага тыдня дзяўчаты плялі вянкі, якія надзявалі падчас свята, прысвечанага праводзінам русалак, варажылі на гэтых вянках. Не пачыналі ніякай новай работы, не аралі, не сеялі, не вілі вяроўкі, не ставілі плот* (Паводле А. Катовіч, Я. Крука).

## Правапіс галосных *о, э, а, е, ё, я* ў складаных словах

**Мэта заняткаў** — сістэматызаваць веды вучняў аб правапісе галосных ***о***, ***э***, ***а***, ***е***, ***ё***, ***я*** ў складаных словах; замацоўваць уменне правільна пісаць літары ***о***, ***э***, ***а***, ***е***, ***ё***, ***я*** ў складаных словах.

Знаёмства вучняў з тэарэтычным матэрыялам можа суправаджацца складаннем схем, якія адлюстроўваюць правілы напісання літар *о*, *э*, *а*, *е*, *ё*, *я* ў складаных словах, напрыклад:




(калі ў другой частцы складанага слова націск падае на першы склад, то ў першай частцы замест *о* пішацца *а*);




(калі ў другой частцы націск падае не на першы склад, то ў першай частцы захоўваецца *о*);




(літара *о* пішацца ў першай частцы складаных слоў, калі другая частка пачынаецца з *ў*);




(калі першай часткай з’яўляецца аснова *велік-/вялік-*, то напісанне літары *е* або *я* залежыць ад таго, які склад у другой частцы націскны: калі першы, то пішацца *е*, калі другі — пішацца *я*) і да т. п.

На аснове тэксту паводле А. Бензерука (практыкаванне 24) вучні практыкуюцца ў знаходжанні слоў, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс галосных у складаных словах» (*старадаўнія*, *краязнаўчым*, *мнагабожжа*).

Са словамі, выпісанымі з практыкавання 25, вучням можна прапанаваць скласці словазлучэнні (*вольналюбівы народ*, *Чарнаморскі флот*, *Чыжоўскае вадасховішча* і інш.).

Выкананне практыкавання 26 спрыяе замацаванню ўмення вучняў правільна пісаць галосныя літары ў складаных словах, перадаваць на пісьме аканне і яканне.

Рашэнне словаўтваральных «прыкладаў» (практыкаванне 27) накіравана не толькі на замацаванне ў школьнікаў навыку правільна пісаць галосныя *о*, *э*, *а*, *е*, *ё*, *я* ў складаных словах, але і на развіццё ўмення вызначаць спосаб утварэння складаных слоў (з гэтай мэтай настаўнік дае заданне вызначыць, якім спосабам утвораны словы *дабрадушны*, *добрасумленны*, *вастралісты*, *востравугольны*, *сямнаццацітонны* і інш.). Варта звярнуць увагу вучняў на тое, што слова *вастралісты* ўтворана складана-бяссуфіксным спосабам (асноваскладанне з адначасовым выкарыстаннем нулявога суфікса): *вастр-а-ліст-*∅*-(ы)*.

Выкананне практыкавання 28 можа суправаджацца вусным каменціраваннем: вучні ўтвараюць ад словазлучэнняў, запісаных у дужках, складаныя прыметнікі і дапасоўваюць іх да назоўнікаў (*шыракалапых елак*, *жаўталістая ліпа*, *рознагалосых птушак* і інш.), тлумачаць правапіс галосных у складаных словах.

Практыкаванне 29 можа быць выканана па варыянтах: 1-ы варыянт — утварэнне і запіс складаных слоў з першымі часткамі *жыцце-*, *добра-*, *мота-*, *ільно-*, *поўна-*; 2-і варыянт — утварэнне і запіс складаных слоў з першымі часткамі *жыцця-*, *дабра-*, *мата-*, *ільна-*, *паўна-*. Узаемаправерка правільнасці выканання задання адбываецца ў парах.

Практыкаванне 30 вучні выконваюць самастойна, пасля чаго адбываецца калектыўная праверка. Правільна запісаны ўсе словы ў 2-м і 3-м радках.

Тэкст паводле У. Коваля (практыкаванне 31) узбагачае веды вучняў пра сімволіку дрэў (*дуб*, *явар*, *каліна*, *бяроза*, *вярба*). Школьнікі дапаўняюць устойлівыя параўнанні словамі — назвамі дрэў (*дрыжыць як асіна* (*асінавы ліст*), *гарыць чырванню як каліна*, *абдзерці як ліпку*, *здаравенны як дуб*, *нахілілася як вярба*). Фарміраванню ўмення тлумачыць сэнс сімвалаў культуры будзе спрыяць заданне вызначыць, каго сімвалізуе вярба ў народнай песні (*вярба сімвалізуе нявесту*):

Адхілілася вярба
Ад лазовага карча,
Прыхілілася яна
Да белай бярозкі.

Адхілілася Ганначка
Ад роду, ад племені,
Ад роднага баценькі,
Прыхілілася яна
Да маладога Андрэйкі.

## Правапіс спалучэнняў галосных *іё* (*ыё*), *ія* (*ыя*), *іе* (*ые*), *іо* (*іа*), *ео* (*еа*), *эо* (*эа*) у іншамоўных словах

**Мэта заняткаў** — узнавіць і сістэматызаваць веды вучняў аб правапісе спалучэнняў галосных ***іё*** (***ыё***), ***ія*** (***ыя***), ***іе*** (***ые***), ***іо*** (***іа***), ***ео*** (***еа***), ***эо*** (***эа***) у іншамоўных словах; удасканальваць уменне правільна пісаць іншамоўныя словы са спалучэннямі галосных ***іё*** (***ыё***), ***ія*** (***ыя***), ***іе*** (***ые***), ***іо*** (***іа***), ***ео*** (***еа***), ***эо*** (***эа***).

Асэнсаванню вучнямі тэарэтычнага матэрыялу будзе спрыяць калектыўнае складанне табліцы «Правапіс спалучэнняў галосных у іншамоўных словах» на аснове прыведзенай у дапаможніку для вучняў інфармацыі:

| **Спалучэнне галосных** | **Месца ў слове** | **Прыклады** |
|---|---|---|
| **1** | **2** | **3** |
| *іо* (*іа*) | Пачатак слова | ***Іо****н*, ***іа****нізацыя* |

| 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|
| *іё* (*ыё*), *ія* (*ыя*) | Сярэдзіна слова | *Б**іё**лаг*, *б**ія**логія*, *патр**ыё**т*, *патр**ыя**тызм* |
| *ео* (*еа*), *эо* (*эа*) | | *Архе**о**лаг*, *архе**а**логія*, *хар**эо**граф*, *хар**эа**графія* |
| *іе* (*ые*) | | *Кл**іе**нт*, *д**ые**та* |

У працэсе спісвання вучнямі слоў з устаўкай прапушчаных літар (практыкаванне 32) варта ўдакладняць разуменне сэнсу некаторых назоўнікаў (*сацыялогія* — навука аб грамадстве, аб адносінах у грамадстве; *абрэвіяцыя* — утварэнне складанаскарочаных слоў; *біёніка* — навука, якая вывучае будову жывых арганізмаў, каб ствараць машыны, якія набліжаюцца да характарыстык гэтых арганізмаў, *стацыянар* — 1) установа з пастаянным месцам знаходжання (напрыклад, бібліятэка-стацыянар); 2) лячэбная ўстанова, якая мае пастаянныя ложкі для хворых; 3) дзённае аддзяленне ў ВНУ і інш.).

Выкананне вучнямі практыкавання 33 можа быць дапоўнена **этымалагічным каментарыем** настаўніка (паведамленнем пра паходжанне слова *маянэз*):

— *У 1756 г. на востраў Менорку* (*Міжземнае мора*) *прыехаў адзін з французскіх вяльмож. На званым абедзе ў порце Маон быў пададзены новы соус. Яго назвалі* маянэзам — *г. зн. маонскім* (І. Шпадарук).

Пры выкананні практыкавання 34 (падбор да прапанаваных слоў аднакаранёвых) варта звярнуць увагу вучняў на правільнае вымаўленне слова *кіяскёр* ‘прадавец у кіёску’ (націск падае на трэці склад). Запіс паронімаў *метэор* і *метэарыт* суправаджаецца тлумачэннем іх значэнняў (школьнікі могуць звярнуцца да «Слоўніка паронімаў беларускай мовы» (1994) С. М. Грабчыкава): *метэор* — распаленае цела касмічнага паходжання, якое ярка свеціцца і хутка рухаецца ў зямной атмасферы (сінонім *знічка* ‘падаючая зорка’); *метэарыт* — цвёрдае цела касмічнага паходжання, якое ўпала на Зямлю з міжпланетнай прасторы. Настаўнік прапануе вучням выправіць маўленчую памылку ў сказе «*А зараз даводзяць, што яны* [*кратары*] *ад падзення метэораў!..*» (А. Карпюк) (правільна: *метэарытаў*).

Практыкаванне 35 спрыяе не толькі замацаванню арфаграфічных навыкаў вучняў, але і фарміраванню ўмення размяжоўваць лексічныя

значэнні паронімаў. Запіс у сшытках школьнікаў мае наступны выгляд: *ідэальны* (2), *ідэалізаваны* (1), *рэалістычны* (3), *рэальны* (4), *рацыяналістычны* (6), *рацыянальны* (5), *нацыянальны* (7), *нацыяналістычны* (8).

Практыкаванні 36—38 вучні выконваюць самастойна з наступнай калектыўнай або ўзаемнай праверкай.

Дадатковае заданне да практыкавання 36 можа заключацца ў тым, каб знайсці сярод прыведзеных слоў назоўнікі, якім адпавядаюць наступныя даведкі пра паходжанне:

— слова паходзіць з грэчаскай мовы і абазначае *кніжнае сховішча* (*бібліятэка*);

— слова паходзіць з французскай мовы і абазначае *першапраходзец* (*піянер*).

Пераклад тэксту «Астероиды» на беларускую мову (практыкаванне 39) дазволіць не толькі замацаваць уменне вучняў правільна пісаць іншамоўныя словы (*дыяметр*, *метэорны*, *метэарыт*), але і ўдасканаліць навык падбіраць да рускіх моўных адзінак адэкватныя беларускія адпаведнікі: рус. *вращающиеся вокруг Солнца* — бел. *якія круцяцца вакол Сонца*; рус. *более 250 км* — бел. *больш за 250 км*; рус. *согласно одной из версий* — бел. *паводле адной з версій*; рус. *из-за удара астероида* — бел. *з-за ўдару астэроіда*, *з прычыны ўдару астэроіда*.

## Правапіс прыстаўных галосных *і*, *а*

**Мэта заняткаў** — замацаваць веды вучняў аб правапісе прыстаўных галосных ***і***, ***а***; удасканальваць уменне правільна пісаць словы з прыстаўнымі галоснымі; выпрацоўваць уменне размяжоўваць словы з прыстаўным ***і*** (*ільдзіна*, *ілгун*, *ільняны*, *іржаны*, *іржавы* і г. д.) і з ***і***, якое не з'яўляецца прыстаўным (*імперыя*, *імпульсіўны*, *імпарт*, *імправізаваць*).

Пры замацаванні правіла правапісу прыстаўных галосных варта адзначыць, што гэта з'ява не мае ўніверсальнага характару. Прыстаўныя галосныя з'яўляюцца толькі перад некаторымі спалучэннямі зычных з першымі санорнымі *л*, *м* і *р* у спрадвечнабеларускіх словах (прыстаўныя галосныя, напрыклад, не з'яўляюцца ў словах *млын*, *млявы*, *мроіцца*, *мсцівец*, *ртуць*). Асаблівай увагі патрабуе варыянтнасць правапісу прыстаўных галосных (*ірваць* і *рваць*, *іржанне* і *ржанне*, *іржаны* і *ржаны*, *ільняны* і *льняны*), напісанне якіх залежыць ад месца слова ў сказе, ад знакаў прыпынку і г. д.

Пасля чытання тэарэтычнага матэрыялу вучням даецца заданне падрыхтаваць вуснае лінгвістычнае паведамленне аб правапісе прыстаўных галосных на аснове наступных схем:

| *і* | ***м*** + зычныя |
|---|---|

(прыстаўная *і* пішацца ў пачатку слова перад спалучэннямі зычных з першай літарай *м*);

| зычны | | *і* | ***р/л*** + зычныя |
|---|---|---|---|

(прыстаўная *і* пішацца ў пачатку слоў перад спалучэннямі зычных з першымі літарамі *р*, *л*, калі словы з такімі спалучэннямі зычных стаіць пасля слова, што заканчваецца на зычны);

| галосны | | ~~*і*~~ | ***р/л*** + зычныя |
|---|---|---|---|

(калі слова з пачатковым спалучэннем зычных з першымі літарамі *р*, *л* стаіць пасля слова, якое заканчваецца на галосны, то прыстаўная літара *і* не пішацца);

| ¬ на галосны | ~~*і*~~ | ***м/р/л*** + зычныя |
|---|---|---|

(пасля прыставак, якія заканчваюцца на галосны, прыстаўныя літары *і* і *а* перад *р*, *л*, *м* не пішуцца).

Практыкаванне 40 фарміруе ў вучняў уменне адрозніваць словы з прыстаўнымі галоснымі *і*, *а* (*ільвіны*, *імчацца*, *аржаны* і інш.) ад слоў, у якіх *і*, *а* не з'яўляюцца прыстаўнымі (*ілюмінатар*, *арбіта*, *азёры* і інш.).

Практыкаванні 41—43 вучні выконваюць самастойна. У практыкаванні 43 прыводзіцца фрагмент з аповесці У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» (школьнікам даецца заданне вызначыць аўтара тэксту).

Праца над практыкаваннем 44 можа адбывацца ў парах: адзін вучань складае сказы са словамі, дзе ёсць прыстаўныя галосныя (*ірваны*, *ільвяня*, *іржавець*, *ільдзіна*), другі — са словамі, дзе прыстаўных галосных няма (*рваны*, *львяня*, *ржавець*, *льдзіна*).

Вынікам знаёмства вучняў з семантыкай слоў *імшыць* 'класці мох між бярвення ў новым зрубе; канапаціць мохам', *імшэць* 'зарастаць мохам', *імжэць* 'ісці, падаць, асядаць дробнымі кропелькамі (пра дождж)' (рубрыка «Правільнасць маўлення») стане выкананне задання ўставіць у сказы прапушчаныя дзеясловы ў форме прошлага часу:

1) *Ноччу ляпіў мокры снег, раскісалі дарогі, а ўвесь дзень ... не то дождж, не то снег* (С. Грахоўскі). 2) *Дзе ... гнілое балота — сцяной ста-*

*яла густая, высокая пшаніца* (А. Якімовіч). 3) *Вось і хата: дзед яшчэ ... зруб яе смалісты, сукаваты* (М. Танк).

А д к а з ы: 1) *імжэў*, 2) *імшэла*, 3) *імшыў*.

## Правапіс літар *і, ы, й*

**Мэта заняткаў** — узнавіць веды вучняў аб правапісе літар ***і***, ***ы***, ***й***; замацоўваць уменні правільна пісаць словы з літарамі ***і***, ***ы***, ***й***, вымаўляць згодна з арфаэпічнымі нормамі злучнік ***і*** ў розных пазіцыях.

Засваенне правілаў правапісу слоў з літарамі *і*, *й*, *ы*, у якіх на пісьме адлюстроўваюцца асаблівасці чаргавання галоснага *і* з *й* і *ы*, а таксама правапісу іншамоўных слоў з зыходным *й* у іх фанемным складзе абумоўлена наступным:

— пашырэннем у сучаснай пісьмовай практыцы ненарматыўнага напісання *й* у выпадках, не прадугледжаных гэтым параграфам;

— уплывам рускай мовы, згодна з правапіснымі нормамі якой у словах іншамоўнага паходжання захоўваецца напісанне *й* перад наступнай галоснай. Параўн.: бел *маёр*, *раён*, *маянэз*, *фае*, *параноя*, *маяран* — рус. *майор*, *район*, *майонез*, *фойе*, *паранойя*, *майоран*. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на тое, што змянілася напісанне слоў *Нью-Ёрк*, *Ёфе* (замест: *Нью-Йорк*, *Йофе*).

Неабходна асаблівую ўвагу акцэнтаваць на тым, што ў адпаведнасці з новай рэдакцыяй правілаў з ліку прыставак, пасля якіх захоўваецца напісанне літары ***і***, калі з яе пачынаецца аснова слова, выключаюцца *суб-* і *дэз-*. Таму трэба пісаць: *субынспектар*, *дэзынтэгратар*, *дэзынтэграцыя*, *дэзынфармаваць*, *дэзынфармацыйны*, *дэзынфармацыя*, *дэзынфекцыйны*, *дэзынфіцыраванне*, *дэзынфіцыраваны*, *дэзынфіцыраваць* (было *субінспектар*, *дэзінтэгратар*, *дэзінтэграцыя*, *дэзінфармаваць*, *дэзінфармацыйны*, *дэзінфармацыя*, *дэзінфекцыйны*, *дэзінфіцыраванне*, *дэзінфіцыраваны*, *дэзінфіцыраваць*). Пры гэтым варта запомніць, што ***і*** захоўваецца пасля прыставак *звыш-*, *між-*, *пан-*, *супер-*, *транс-*, *контр-: звышіндустрыяльны*, *звышінфляцыя*, *міжірыгацыйны*, *панісламізм*, *контрідэя*, *контрігра*, *суперінтэлект*, *трансіндыйскі*. У складанаскарочаных словах, першая частка якіх заканчваецца на цвёрды зычны, пачатковае ***і*** другога слова пішацца нязменна: *педінстытут*, *дзяржінспектар*, *палітінфармацыя*, *санінструктар*, *цяжіндустрыя*, *медінструменты*, *спецінструктаж*, *гарінспекцыя*.

Для таго каб замацаваць веды вучняў аб правапісе літар *і*, *ы*, *й* пасля прыставак, даецца заданне суаднесці словы са схемамі, якія графічна тлумачаць іх правапіс:

| | | |
|---|---|---|
| 1 | на галосны | й... |
| 2 | на зычны | ы... |
| 3 | звыш-, між-, пан-, супер-, транс-, контр- | і... |

а) узышоў
б) зайсці
в) контрігра
г) адысці
д) міжінстытуцкі
е) перайначыць
ж) звышімклівы
з) суперінтэлект
і) займеннік
к) абыграць
л) разысціся
м) выйграць

А д к а з ы: 1 — б, е, і, м; 2 — а, г, к, л; 3 — в, д, ж, з.

Практыкаванне 45 накіравана на фарміраванне ўмення вучняў знаходзіць у тэксце словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс літар *і*, *ы*, *й*» (*прайсціся*, *выйшаў*, *перайсці*, *узышоўшы*, *пайсці*).

Практыкаванне 46 школьнікі выконваюць самастойна.

Выкананне практыкавання 47 можа суправаджацца складаннем сказаў з фразеалагізмамі *выйсці сухім з вады*, *адысці ў нябыт*, *прыйшло ў рукі*, *абысці бокам*, *адыгрываць ролю*, *займае дух*, *разыгрываць камедыю*, *перайсці дарогу*. Вучні павінны устанавіць адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх значэннямі (а д к а з ы: а — 2, б — 4, в — 6, г — 1, д — 7, е — 3, ж — 8, з — 5). У якасці дадатковага задання настаўнік прапануе вучням адказаць, якая народная прымета пакладзена ў аснову верша М. Маляўкі «Суседка»:

*— Добры дзень, суседка!*
*— Добры дзень!*
*— Заходзіш рэдка.*
*Як здароўе?*
*— Дзякуй богу.*
*— Перайшла з пустым дарогу,*
*Нешчаслівы буду, Насця.*
*Не шкада?*
*— У студні шчасце...*

(*Згодна з народнымі ўяўленнямі, сустрэча з чалавекам, які нясе пустыя вёдры, прыносіць няўдачу, няшчасце*)

Варта звярнуць увагу вучняў на тое, што ўжытае ў вершы словазлучэнне *перайшла дарогу* не з'яўляецца фразеалагічным.

Пісьмо па памяці верша С. Грахоўскага (практыкаванне 48) стымулюе запамінанне вучнямі напісанняў слоў з літарамі *й*, *ы* пасля прыставак (*перайсці*, *прайсці*, *узысці*). Школьнікі павінны растлумачыць сэнс уключанай у верш прыказкі «Жыццё пражыць — не поле перайсці» (*жыццё пражыць — не такая лёгкая справа*). Настаўнік можа паведаміць, што сінонімам да гэтай прыказкі з’яўляецца прыказка «Век зжыць — не мех сшыць».

З мэтай фарміравання ў вучняў умення правільна вымаўляць злучнік *і* ў розных становішчах настаўнік дае заданне прачытаць запісаныя на дошцы спалучэнні слоў і прыказкі ў адпаведнасці з нормамі літаратурнага вымаўлення:

*Лес і поле, прыназоўнік і назоўнік, песня і танец, Антон і Васіль, Ганна і Вера, Алег і Максім, месяц і зоркі, агуркі і памідоры, хлеб і малако, слоўнік і падручнік, прыказка і прымаўка, прыбег і паклікаў.*

*Не рабі ліхога і не бойся нікога. Як не пасееш, то і збіраць не будзе чаго. Без надзеі і жыццё не жыццё. Не наеўся, дык і не наліжашся. З ліхім чалавекам і гадзіна векам. Калі ёсць хлеб і вада, то не бяда.*

Пры чытанні прыказак неабходна звярнуць увагу вучняў на правільнае вымаўленне часціцы *не*, прыназоўніка *без*.

Запісваючы словы, прыведзеныя ў транскрыпцыі (практыкаванне 49), вучні звяртаюць увагу на правільнае вымаўленне злучніка *і* ў розных пазіцыях. Запіс у сшытках павінен быць такім: *Нёман і Днепр*, *Алег і Вольга*, *святло і цемра*, *па Івана*, *бацька і дзядзька*, *сцяг і герб*, *бульба і агуркі*, *доўгі і кароткі*, *мёд і малако*.

Чытаючы ўрывак з трылогіі Я. Коласа «На ростанях» (практыкаванне 50), вучні замацоўваюць уменні вымаўляць згодна з арфаэпічнымі нормамі злучнік *і* ў розных пазіцыях (*мацнелі* [й] *набіралі*, *так* [і] *паверацъ* і да т. п.), а таксама правільна ўжываць склонавыя формы займеннікаў *табе*, *цябе*. Акрамя таго, школьнікі павінны знайсці ў тэксце словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс літар *і*, *ы*, *й*» (*разышліся*, *пайшлі*, *пайшла*, *займалася*). Пасля адказаў вучняў на пытанне «Ці згодны вы з Я. Брылём у тым, што ў праклёнах ёсць “паэзія, хай сабе грубая, але ж і хлёсткая”?» настаўнік можа паведаміць:

*— Праклёны звычайна чуваць з вуснаў чалавека раззлаванага, разнерваванага, якому зрабілі якую-небудзь непрыемнасць, зло. Наогул народ асуджальна ставіцца да злосных, «смяртэльных» праклёнаў, асабліва калі яны скіраваны да сваіх бліжніх, аднавяскоўцаў. У такім выпадку можна часта пачуць: «Навошта так ужо клясці?»*[7].

[7] *Грынблат, М. Я.* Выслоўі / М. Я. Грынблат // Выслоўі. — Мінск, 1979. — С. 16—18.

На аснове тэксту «Песняры» паводле Я. Сіпакова (практыкаванне 51) вучні замацоўваюць правапісныя ўменні, якія адпрацоўваліся пры вывучэнні раздзела «Правапіс галосных», і інш.

## Правапіс зычных

### Правапіс і вымаўленне звонкіх і глухіх, шыпячых і свісцячых зычных

**Мэта заняткаў** — узнавіць і сістэматызаваць веды вучняў аб правапісе і вымаўленні звонкіх і глухіх, шыпячых і свісцячых зычных; удасканальваць уменне правільна вымаўляць і пісаць словы, у якіх адбываецца асіміляцыя зычных гукаў.

Азнаямленне вучняў з тэарэтычным матэрыялам суправаджаецца запаўненнем табліцы ўласнымі прыкладамі слоў, у якіх адбываецца прыпадабненне зычных гукаў:

| Прыпадабненне зычных | Прыклады |
|---|---|
| аглушэнне звонкіх зычных перад глухімі | *бегчы* — бе[х]чы, *вокладка*— вокла[т]ка |
| азванчэнне глухіх зычных перад звонкімі | *касьба* — ка[з’]ба, *лічба* — лі[дж]ба |
| прыпадабненне цвёрдых зычных да мяккіх | *каснік* — ка[с’]нік, *змест* — [з’]мест |
| прыпадабненне свісцячых да шыпячых | *расчуліць* — ра[ш]чуліць, *зжаўцелы* — [ж]жаўцелы |
| прыпадабненне шыпячых да свісцячых | *кланяешся* — кланяе[с’с’]я, *у хустачцы* — у хуста[цц]ы |
| прыпадабненне [д], [т] да [ч] | *дарадчык* — дара[чч]ык, *лётчык* — лё[чч]ык |
| прыпадабненне [д], [т] да [ц] | *адцурацца* — а[цц]урацца, *нітцы* — ні[цц]ы |
| прыпадабненне [дс] да [ц] | *аўтазаводскі* — аўтазаво[ц]кі, *суседскі* — сусе[ц]кі |
| прыпадабненне [жс], [шс], [зс] да [с] | *парыжскі* — пары[с]кі, *латышскі* — латы[с]кі, *каўказскі* — каўка[с]кі |

На аснове тэксту паводле Я. Брыля (практыкаванне 52) вучні практыкуюцца ў знаходжанні слоў, у якіх адбываюцца розныя віды асіміляцыі зычных гукаў. Варта звярнуць увагу школьнікаў на тое, што ў слове *нарэшце* літара *ш* абазначае гук [с’]: адбылося прыпадабненне шыпячага зычнага да свісцячага, а таксама цвёрдага зычнага да мяккага.

Практыкаванне 53 спрыяе замацаванню ўмення вучняў адрозніваць віды асіміляцыі (прыпадабнення) зычных гукаў і правільна перадаваць на пісьме звонкія і глухія, шыпячыя і свісцячыя зычныя.

На аснове інфармацыі, прыведзенай у рубрыцы «Назвы роднага краю» (пра тапонімы, утвораныя ад слова *пруд*), школьнікам прапануецца пракаменціраваць выказванне У. Юрэвіча: «Народ вельмі вынаходлівы на тое, каб падабраць назву, адпаведную характару ўзнікнення і існавання паселішча»[8].

Пры выкананні практыкавання 54 (запіс прыказак у адпаведнасці з арфаграфічнымі нормамі) вучні павінны вусна тлумачыць сэнс алегарычных прыказак.

Пасля знаёмства з рубрыкай «Правільнасць маўлення» (раскрыццё семантыкі слоў *упераменшку* ‘у перамяшаным выглядзе, у беспарадку’ і *ўперамежку* ‘папераменна чаргуючыся адно з другім, размяшчаючыся ў пэўным парадку’) вучням даецца заданне ўставіць у сказы словы *ўперамешку*, *уперамежку*:

1) *Спалі дзяўчаты ў сенцах. Раз уставала адна, другі раз — другая, ..., каб устаць з жаваранкамі* (М. Лобан). 2) *І бульба была ... з камянямі, і нават у бохан траплялі яны* (П. Панчанка).

А д к а з ы: 1) *уперамежку*, 2) *уперамешку*.

Практыкаванні 55, 56 вучні выконваюць самастойна, пасля чаго адбываецца ўзаемаправерка ў парах.

## Правапіс спалучэнняў зычных на стыку кораня і суфікса, прыстаўкі і кораня

**Мэта заняткаў** — узнавіць і замацаваць веды вучняў аб правапісе спалучэнняў зычных на стыку кораня і суфікса, прыстаўкі і кораня; удасканальваць уменне правільна пісаць спалучэнні зычных на стыку марфем.

З мэтай замацавання ведаў вучняў аб правапісе спалучэнняў зычных на стыку кораня і суфікса, прыстаўкі і кораня пасля чытання тэарэтычнага матэрыялу даецца заданне сфармуляваць правілы, якія могуць быць праілюстраваны наступнымі прыкладамі:

---

[8] *Юрэвіч, У.* Слова жывое, роднае, гаваркое... : навукова-папулярная кніга / У. Юрэвіч. — Мінск : Юнацтва, 1992. — С. 243.

I. 1) *сусед — суседскі*; 2) *ракета — ракетчык*; 3) *у лодцы, пры дачцэ*; 4) *латыш — латышскі*;

II. 1) *узняцца, бязмежны*; 2) *спустошыць, расклеіць*; 3) *дысгармонія, дыспрапорцыя*; 4) *надкусіць, абтрэсці*;

III. *з кошыкам, без пярсцёнка.*

Тэарэтычны матэрыял дапаможніка для вучняў можа быць дапоўнены наступнай інфармацыяй аб правапісе суфіксаў -*ск*- і -*ств*-:

Спалучэнне *цтв* пішацца ў назоўніках, утвораных з дапамогай суфікса -*ств*- ад слоў, якія заканчваюцца на *ц*, *т*, *ч*, *к* (для запамінання: ***цётачка***): *выдавец — выдавецтва*, *студэнт — студэнцтва*, *ткач — ткацтва*, *чалавек — чалавецтва*.

Зычныя *г*, *ж*, *х*, *ш* перад суфіксам -*ств*-, згодна з вымаўленнем, на пісьме не перадаюцца: *многа — мноства*, *прыгожы — прыгоства*, *птах — птаства*, *хораша — хараство*.

Пры ўтварэнні прыметнікаў ад назоўнікаў з дапамогай суфікса -*ск*-:

— зычныя асновы *ц*, *т*, *ч*, *к* (***цётачка***) у спалучэнні з суфіксальным *с* у вымаўленні зліваюцца ў адзін гук [ц], які на пісьме перадаецца літарай *ц*: *брат — бра*(*т* + *с*)*кі — брацкі*; *ткач — тка*(*ч* + *с*)*кі — ткацкі*; *рыбак — рыба*(*к* + *с*)*кі — рыбацкі*;

— каранёвы зычны *д* у спалучэнні з суфіксальным *с* вымаўляецца як [ц], але на пісьме літара *д* захоўваецца: *горад — гара*[ц]*кі — гарадскі*; *сусед — сусе*[ц]*кі — суседскі*;

— зычныя *с*, *ш* у спалучэнні з суфіксальным *с* у вымаўленні зліваюцца ў адзін гук [с], які на пісьме перадаецца літарай *с*: *беларус — белару*(*с* + *с*)*кі — беларускі*; *таварыш — тавары*(*ш* + *с*)*кі — таварыскі*;

— зычныя ў прыметніках, утвораных ад геаграфічных назваў, а таксама назваў нацыянальнасцей і народнасцей з асновай на *г*, *к*, *х*, *з*, *ж*, *ш*, у спалучэнні з суфіксальным *с* даюць спалучэнні *гс*, *кс*, *хс*, *зс*, *жс*, *шс*, якія захоўваюцца і ў вымаўленні, і ў напісанні: *Гамбург — гамбургскі*, *узбек — узбекскі*, *казах — казахскі*, *Каўказ — каўказскі*, *Добруш — добрушскі* (але: *Волга — Волжскі*, *Рыга — рыжскі*, *чэх — чэшскі*, *турак — турэцкі*, *славак — славацкі*, *калмык — калмыцкі*).

Вывучэнне дадатковага тэарэтычнага матэрыялу можа суправаджацца складаннем схем, напрыклад:

ц, т, ч, к + с... = Ц

(спалучэнне зычных асновы *ц*, *т*, *ч*, *к* з суфіксальным *с* перадаецца на пісьме літарай *ц*) і да т. п.

Мэта практыкаванняў 57, 58 — замацаваць уменне вучняў правільна пісаць зычныя ў прыстаўках. Настаўнік можа паведаміць, што прыстаўка *дыс-* утварае словы са значэннем адсутнасці або процілегласці: *дыскамфорт* ‘умовы жыцця, знаходжання, якія не забяспечваюць зручнасцей і спакою’, *дысгармонія* ‘1) парушэнне гармоніі, адсутнасць сугучнасці; немілагучнасць; 2) разлад, няўзгодненасць, парушэнне адпаведнасці чаго-небудзь чаму-небудзь’.

Практыкаванне 58 спрыяе ўзбагачэнню фразеалагічнага слоўніка школьнікаў (неабходна ўстанавіць адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх значэннямі; а д к а з ы: а — 5, б — 8, в — 2, г — 6, д — 1, е — 7, ж — 3, з — 4). Можна прапанаваць вучням скласці і запісаць сказы з прыведзенымі фразеалагізмамі.

Практыкаванне 59 вучні выконваюць самастойна.

Практыкаванне 60 накіравана не толькі на ўдасканаленне ўменняў вучняў правільна пісаць словы, у якіх адбываецца асіміляцыя зычных гукаў, але і на замацаванне ўмення падбіраць сінонімы да слоў.

Пасля спісвання тэксту паводле Х. Гурыновіча (практыкаванне 61) школьнікі павінны растлумачыць лексічныя значэнні выдзеленых слоў: *гарышча* ‘памяшканне, прастора паміж столлю і дахам у будынку’, *лецішча* ‘дом у загараднай мясцовасці для летняга адпачынку’ (настаўніку варта звярнуць увагу вучняў на тое, што зразумець сэнс гэтых слоў дапамагае іх марфемная будова). Слоўнікавая работа над тэкстам можа ўключаць таксама:

— тлумачэнне сэнсу паронімаў *камін* ‘пакаёвая печ з шырокай адкрытай топкай’ (гэта слова ўжыта ў тэксце) і *комін* ‘труба для адводу дыму з печы’;

— адказ на пытанне «Як называецца калекцыя засушаных раслін?» (*гербарый*).

Пасля выбарачнага спісвання (практыкаванне 62) можна прапанаваць вучням пытанні і заданні, накіраваныя на раскрыццё культурнага патэнцыялу тэксту «Жаночая мова»:

— Чаму аўтар тэксту сцвярджае, што беларускі ручнік можна «паставіць у адзін рад з фрэскамі егіпецкіх пірамід або з кельцкімі рунамі»? (*Егіпецкія фрэскі даюць уяўленне пра культуру старажытнага Егіпта; у кельцкіх рунах асноўныя сілы прыроды прадстаўлены ў выглядзе малюнкаў — піктаграм. Як і егіпецкія фрэскі ці кельцкія руны, ручнік «змяшчае інфармацыю пра тое, як жылі людзі, як уяўлялі сабе свет, прыгажосць»* (В. Мядзведзева)).

— Карыстаючыся кнігай-альбомам В. Лабачэўскай «Повязь часоў — беларускі ручнік» (2009), дакажыце, што «ў кожным рэгіёне,

а часам і ў асобнай вёсцы ствараліся ручнікі, якія адлюстроўвалі асаблівасць менавіта гэтай мясцовасці».

Настаўнік можа зацікавіць вучняў інфармацыяй пра згаданыя ў тэксце мотальскія ручнікі, якія «вылучаюцца не толькі складаным тканым узорам, але і вузельчыкавымі карункамі на канцах»:

*— Ёсць меркаванне, што тэхніка ўтварэння плеценага дэкору мотальскіх ручнікоў бярэ пачатак ад старажытнага вузельчыкавага пісьма — сродку перадачы інфармацыі з дапамогай камбінацыі вузлоў. Мотальскія ручнікі адрозніваюцца таксама шляхетнасцю, што можна патлумачыць ужо іншым гістарычным перыядам. Калісьці каралева Бона прывезла ў Моталь нямецкіх і італьянскіх майстроў, а мясцовыя жыхары ўзялі ад іх умення лепшае і спалучылі гэта са сваёй традыцыяй ткацтва* (Паводле В. Мядзведзевай).

## Правапіс *д* і *дз*, *т* і *ц*

**Мэта заняткаў** — удакладніць і замацаваць веды вучняў аб правапісе літар ***д*** і ***дз***, ***т*** і ***ц***; удасканальваць уменне правільна пісаць словы з літарамі ***д*** і ***дз***, ***т*** і ***ц***.

Правіла звязана з адлюстраваннем на пісьме такой спецыфічнай асаблівасці беларускага вымаўлення, як дзеканне і цеканне. Правіла адносіцца да найбольш складаных у сучасным беларускім правапісе, бо ў пераважнай большасці слоў, у прыватнасці іншамоўнага паходжання, гэтая фанетычная з'ява праяўляецца непаслядоўна. Таму правапіс слоў з літарамі *д* і *дз*, *т* і *ц* у значнай ступені вызначаецца па слоўніку.

Замацаванне ведаў вучняў аб правапісе літар *д* і *дз*, *т* і *ц* можа адбывацца ў форме гутаркі:

1. Што такое дзеканне і цеканне? (*чаргаванне цвёрдых зычных гукаў* [д], [т] *з мяккімі* [дз'], [ц']).
2. Перад якімі галоснымі літарамі замест *д*, *т* пішуцца адпаведна *дз*, *ц*? (*перад галоснымі* е, ё, ю, я, і).
3. Перад якім мяккім зычным гукам адбываецца дзеканне і цеканне? (*перад мяккім* [в']).
4. У якіх выпадках гукі [д] і [т] перад мяккім [в'] на пісьме перадаюцца адпаведна літарамі *д* і *т*? (*калі* д *уваходзіць у склад прыстаўкі*, т — *у склад суфікса*, *а таксама ў словах* мардва '*карэннае насельніцтва Рэспублікі Мардовіі*' — мардве, Літва — у Літве).
5. Перад якімі суфіксамі і спалучэннямі суфіксальнага паходжання адбываецца дзеканне і цеканне? (*перад* -ін-, -ір-, -ік-, -ёр-, -еец, -ейск-).

6. У якіх словах *д* і *т* пішуцца нязменна? (*у большасці слоў іншамоўнага паходжання*).

Параўнанне асаблівасцей вымаўлення слоў *церці — тереть*, *сцяна — стена*, *Радзіма — Родина*, *дзевяць — девять* і іншых у беларускай і рускай мовах (практыкаванне 63) прывядзе вучняў да высновы аб тым, што ў адрозненне ад рускіх мяккіх зычных [д’] і [т’] беларускія [дз’] і [ц’] вызначаюцца свісцячым характарам вымаўлення. Настаўнік можа прапанаваць школьнікам пракаменціраваць выказванне А. В. Багдановіча — аўтара падручніка «Беларуская мова» (1927): «Беларусы вымаўляюць расійскае мяккае [д’] і [т’], як беларускія [дз’] і [ц’], на свой капыл... Для беларуса вымаўленне мяккага [д’] і [т’] па-расійску амаль немагчыма. Гэта ёсць тая адзнака, па якой заўсёды можна пазнаць беларуса...»[9].

На аснове тэксту «Вятры» паводле Я. Сіпакова (практыкаванне 64) вучні практыкуюцца ў знаходжанні слоў, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс літар *д* і *дз*, *т* і *ц*». Дадатковае заданне да тэксту можа заключацца ў тым, каб школьнікі назвалі фразеалагізмы з кампанентам *вецер*, якія маюць наступныя значэнні:

- ‘хто-небудзь бясследна, імгненна знік, схаваўся’ (*як ветрам здзьмула*);
- ‘хто-небудзь вельмі легкадумны, несур’ёзны’ (*вецер у галаве*; *падбіты ветрам*; *як у полі вецер*);
- ‘назад не вернеш, не знойдзеш каго-небудзь’ (*лаві вецер у полі*; *шукай ветру ў полі*).

Практыкаванні 65, 66 вучні выконваюць самастойна, пры неабходнасці звяртаючыся да арфаграфічных і руска-беларускіх слоўнікаў.

Дадатковае заданне:

- Падкрэсліце словы, якія адпавядаюць наступным лексічным значэнням: а) ‘пясчаны пагорак, нанесены ветрам на марскім узбярэжжы’ (*дзюна*); б) ‘аб’яднанне асоб пэўнай спецыяльнасці (рамяства) для сумеснай працы з удзелам у даходах паводле дамоўленасці і агульнай адказнасцю’ (*арцель*); в) ‘магутны электрычны асвятляльны прыбор, які выкарыстоўваецца пры кіназдымках’ (*юпітар*); г) ‘вялікае памяшканне перад уваходам ва ўнутраныя часткі будынка грамадскага прызначэння’ (*вестыбюль*); д) ‘буйное вайсковае злучэнне з некалькіх палкоў або брыгад у розных відах узброеных сіл’ (*дывізія*).

---

[9]*Багдановіч, А. В.* Беларуская мова : падручнік для тэхнікумаў і самаадукацыі / А. В. Багдановіч. — Мінск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1927. — С. 77—78.

З мэтай фарміравання ўмення правільна ўжываць у маўленні паронімы *тэлевізарны* 'які мае адносіны да тэлевізара, прызначаны для яго; звязаны з вырабам тэлевізараў' і *тэлевізійны* 'які перадаецца ці прымаецца па тэлебачанні; прызначаны для перадачы або прыёму відарысаў з дапамогай сродкаў тэлебачання' (рубрыка «Правільнасць маўлення») вучням прапануецца ўтварыць словазлучэнні з галоўнымі словамі *вежа*, *рэпартаж*, *корпус*, *каментатар*, *тумба*, *спектакль*, дапасаваўшы да іх прыметнік *тэлевізарны* або *тэлевізійны*.

Практыкаванне 67 можа быць выканана па варыянтах: 1-ы варыянт — запіс слоў з літарамі *д*, *т* (*дэпо*, *практыкант*, *дэпутат* і інш.); 2-і варыянт — запіс слоў з літарамі *дз*, *ц* (*дзверы*, *бамбардзіраваць*, *Целяханы* і інш.).

Практыкаванне 68 вучні выконваюць самастойна з наступнай узаемаправеркай у парах.

Перакладаючы тэкст з рускай мовы на беларускую (практыкаванне 69), школьнікі замацоўваюць уменне правільна пісаць словы з літарамі *т* і *ц*, *д* і *дз*. Варта ўдакладніць разуменне вучнямі сэнсу ўжытага ў тэксце слова *мініяцюра* — невялікая карціна або партрэт тонкай работы на паперы, метале, фарфоры і інш.

Пасля спісвання тэксту паводле М. Касцюка пра талерантнасць як вызначальную рысу нацыянальнага характару беларусаў (практыкаванне 70) вучням даецца дадатковае заданне — устанавіць адпаведнасць паміж якасцямі характару беларусаў — складальнікамі талерантнасці і прыказкамі, у якіх знайшлі адбітак гэтыя рысы (а д к а з ы: а — 1, б — 5, в — 4, г — 3, д — 2). У сувязі з тым, што ў тэксце ідзе гаворка пра міфічных асілкаў, школьнікам прапануецца назваць імёны вядомых ім беларускіх казачных асілкаў (*Вярнідуб*, *Пакацігарошак*, *Хведар Набілкін* і інш.).

### Правапіс падоўжаных зычных

**Мэта заняткаў** — узнавіць веды вучняў аб правапісе падоўжаных зычных; замацоўваць уменні правільна пісаць словы з падоўжанымі зычнымі, адрозніваць падаўжэнне зычных ад падваення.

Пасля чытання тэарэтычнага матэрыялу вучням прапануецца прывесці прыклады:

а) слоў з падоўжанымі зычнымі гукамі [з'], [л'], [н'], [с'], [дз'], [ц'], [ж], [ш], [ч];

б) запазычаных слоў, у якіх (у параўнанні з рускай мовай) падаўжэнне зычных не адбываецца;

в) запазычаных слоў з падоўжанымі зычнымі гукамі [н], [ц], [к].

На аснове тэксту Х. Гурыновіча (практыкаванне 71) вучні практыкуюцца ў знаходжанні слоў, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс падоўжаных зычных».

Практыкаванне 72 вучні выконваюць самастойна з наступнай калектыўнай праверкай.

Перад выкананнем практыкавання 73 неабходна растлумачыць школьнікам розніцу паміж падаўжэннем і падваеннем зычных. Варта, каб вучні ўсвядомілі, што для беларускай мовы характэрна ўжыванне падоўжаных зычных паміж галоснымі ў межах адной марфемы. Напісанне падвоеных зычных назіраецца толькі на стыку марфем:

• прыстаўкі і кораня: *рассыпаць*, *раззлавацца*, *аббегчы*, *аддаць*, *паддобрыць*;

• кораня і суфікса: *каменны*, *кішэнны*, *насценны*, *белакачанны*, *пераменны*;

• суфікса і постфікса: *весяліцца*, *вучыцца*, *старацца* (дзе першае *ц* з'яўляецца суфіксам, а другое *ц* — часткай постфікса): *вучыць* + *ца* = *вучыцца*, *весяліць* + *ца* = *весяліцца*.

Для размежавання падоўжаных і падвоеных зычных вучні могуць карыстацца «Школьным марфемным слоўнікам беларускай мовы» А. М. Бардовіча, Л. С. Мормыш, Л. М. Шакуна (2005).

Практыкаванне 74 можа быць выканана па варыянтах: 1-ы варыянт выпісвае з тэксту словы з падаўжэннем зычных, 2-і варыянт — з падваеннем зычных.

Рубрыка «Правільнасць маўлення» акцэнтуе ўвагу вучняў на тым, што ўжыванне зборных назоўнікаў (*калоссе*, *карэнне*, *крылле*, *валоссе* і інш.) у форме множнага ліку (*калоссі*, *карэнні*, *крыллі*, *валоссі* і да т. п.) з'яўляецца парушэннем літаратурнай нормы. Школьнікам даецца заданне выправіць граматычныя памылкі ў сказах:

1) *Гарачыя каменні былі пакрыты пылам.* 2) *Хатка на дзіцячай пляцоўцы была зроблена з сасновых бярвенняў.* 3) *Сонечныя праменні асвятлілі верхавіны дрэў.* 4) *У купальскія вянкі дзяўчаты ўплятаалі калоссі і стужкі.* 5) *Хлопцы назбіралі сухіх голляў для вогнішча.*

Практыкаванні 75, 76 прапануюцца для самастойнага выканання.

Практыкаванне 77 спрыяе развіццю ў вучняў цікавасці да беларускай тапанімікі, фарміраванню ўмення тлумачыць паходжанне назваў населеных пунктаў з празрыстай унутранай формай (*Заполле*, *Прылессе*, *Падлужжа*, *Надрэчча* і пад.).

Змест тэксту паводле А. Васілевіч (практыкаванне 78) дае падставу для абмеркавання маральна-этычнай праблемы: вучням прапануецца ацаніць учынак Грышы.

## Правапіс некаторых спалучэнняў зычных

**Мэта заняткаў** — узнавіць веды вучняў аб правапісе спалучэнняў зычных ***зн***, ***сн***, ***сл***, ***рн***, ***шч***, ***сч***; удасканальваць уменне правільна пісаць словы з гэтымі спалучэннямі зычных.

Пры вывучэнні правіла, якое перадае асаблівасці напісання некаторых спалучэнняў зычных у адпаведнасці з літаратурным вымаўленнем, неабходна звярнуць увагу на тое, што ў новай рэдакцыі правілаў такая норма распаўсюджваецца і на шэраг слоў іншамоўнага паходжання, якія раней былі выключэннямі: *кампосны* (параўн.: *кампост*), *кантрасны* (параўн.: *кантраст*), *фарпосны* (параўн.: *фарпост*), *баласны* (параўн.: *баласт*), *аванпосны* (параўн.: *аванпост*). Асаблівую ўвагу трэба звярнуць і на правапіс слоў іншамоўнага паходжання з канцавымі спалучэннямі зычных *дт*, якія ў адпаведнасці з беларускім літаратурным вымаўленнем перадаюцца праз *т*: *Гумбальт*, *Краншат*, *Рэмбрант*, *Шміт*, *Клот* (параўн. рус.: *Гумбольдт*, *Кронштадт*, *Рембрандт*, *Шмидт*, *Клодт*).

У працэсе чытання тэарэтычнага матэрыялу вучні складаюць схемы:



На аснове тэксту паводле Я. Маўра (практыкаванне 79) вучні практыкуюцца ў знаходжанні слоў, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс некаторых спалучэнняў зычных».

Выкананне практыкавання 80 можа суправаджацца вусным каменціраваннем.

З мэтай размежавання значэнняў паронімаў *пясчаны* ‘пакрыты пяском; з аднаго пяску; з вялікай прымессю пяску; у якім шмат пяску’ і *пясочны* ‘які мае адносіны да пяску; з пяску; шаравата-жоўты, колеру пяску; прыгатаваны з сухога, рассыпістага цеста’ (рубрыка «Правільнасць маўлення») школьнікам даецца заданне ўказаць, у якіх словазлучэннях парушана лексічная спалучальнасць:

а) *пясчаны бераг*; б) *пясочная бура*; в) *пясочнае пячэнне*; г) *пясчаны колер*; д) *пясчанае дно*; е) *пясчаны гадзіннік* (а д к а з ы: *б*, *г*, *е*).

Практыкаванні 81, 82 вучні выконваюць самастойна. Настаўнік удакладняе разуменне школьнікамі сэнсу слова *вашчэнне* — дзеянне паводле значэння дзеяслова *вашчыць* ‘націраць або насычаць воскам’.

Практыкаванне 83 (пошук слоў, у якіх дапушчаны памылкі) спрыяе развіццю арфаграфічнай пільнасці вучняў. Правільна запісаны ўсе словы ў 1-м і 5-м радках.

Пры падвядзенні вынікаў заняткаў можна даць вучням заданне ўставіць у прыказкі прапушчаныя словы (іх напісанне адпавядае правілу «Правапіс спалучэнняў зычных»):

1) *Загляне ... і ў наша аконца.* 2) *... не камень.* 3) *Ранняя птушачка крылкі цярэбіць, а ... вочы праціраe.* 4) *Паны б’юцца, а ў мужыкоў чубы ...*

А д к а з ы: 1) *сонца*, 2) *сэрца*, 3) *позняя*, 4) *трашчаць*.

На гэтых занятках можа быць праведзены **слоўнікавы дыктант**, што ўключае словы, напісанне якіх адпавядае вывучаным правілам:

*Стагоддзе, узысці, Мацвей, сальфеджыа, радыёантэна, спортінвентар, маянэз, нясвіжскі, іанізацыя, кантрасны, чарнавокі, спадчына, саванна, велікарослы, подзвіг, вогнеўстойлівы, пясчаны, ёгурт, вокамгненна, пяцярня, у вопратцы, харэаграфія, фотаздымак, жамчужына, беспадстаўна, дзясяты, дысгармонія, кашнэ, счарсцвелы, заінтрыгаваць, інжынер, хвалюешся, Емяльян, ільнаводства, праязны, камп’ютар, зерняслад, пайменны, гушчар.*

## Правапіс прыстаўных і ўстаўных літар *в, г*

**Мэта заняткаў** — сістэматызаваць веды вучняў аб правапісе прыстаўных і ўстаўных літар ***в***, ***г***; развіваць уменне правільна пісаць словы з прыстаўнымі і ўстаўнымі зычнымі.

Пры вывучэнні гэтага правіла неабходна засвоіць спісы слоў, у якіх прыстаўное (устаўное) *в* пішацца ва ўсіх выпадках без выключэння (напрыклад, *во́ка*, *во́стры*, *вако́л*; *ву́гал*, *ву́да*, *ву́галь*, *вуж*, *ву́зел*, *ву́ліца*, *вунь*, *вус*, *ву́сны*, *ву́ха*, *ву́чань*), і спісы слоў, у якіх правапіс прыстаўнога *в* залежыць ад месца націску (*во́зера*, *во́сень*, *во́кны*, *во́блака*, *во́бласць*, *во́страў*; **але**: *азёры*, *асе́нні*, *ако́нны*, *абло́кі*, *абласны́*, *астравы́*). Асаблівую ўвагу патрэбна звярнуць на тое, што ўстаўное *в* пішацца цяпер у словах *есавул*, *есавульскі*, якія раней пісаліся без устаўнога *в*.

Пасля чытання тэарэтычнага матэрыялу вучні складаюць **вуснае лінгвістычнае паведамленне** аб правапісе прыстаўных і ўстаўных літар *в*, *г* з апорай на наступныя прыклады:

I. 1) *восень, увосень*; *окаць*, *одум*; 2) *вобласць — абласны*; 3) *вокліч*, *вобземлю*, *водсвет*; 4) *вохра*, *воцат*; 5) *вузел*, *вузлаваты*; 6) *вупраж*, *вусцішна*; 7) *вока — вачэй*, *вострым — вастрыць*, *восем — васьмёрка*, *вакол — ваколіца*, *воспа — васпаваты*, *навокал — наваколле*;

II. 1) *офіс*, *Орша*; 2) *ультрафіялетавы*, *Узбекістан*; *вустрыца*; 3) *угнаенне*, *унук*;

III. 1) *ніводны*; 2) *павук*, *павуцінне*; 3) *Тадэвуш*;

IV. 1) *гэты*, *гэтакі*, *гэтулькі*; 2) *гэтак*, *гэтаксама*, *адгэтуль*, *дагэтуль*; 3) *гэй*, *го*, *га*, *гэ*.

На аснове тэксту паводле В. Віткі (практыкаванне 84) вучні практыкуюцца ў знаходжанні слоў, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс прыстаўной і ўстаўной літары *в*». Дадатковае заданне патрабуе растлумачыць сэнс ужытага ў тэксце фразеалагізма *як вока ў ілбе* (‘самае дарагое, што ёсць, засталося ў каго-небудзь’).

Мэта практыкавання 85 — сфарміраваць у вучняў уменне адрозніваць словы з прыстаўнымі *в*, *г* ад слоў, у якіх *в* і *г* не з’яўляюцца прыстаўнымі (*горкі*, *воля*, *гушчар* і інш.). Выконваючы практыкаванне, вучні могуць падбіраць да слоў адпаведнікі ў рускай мове: *вулей* — рус. *улей* (*в* прыстаўны); *гора* — рус. *горе* (*г* не з’яўляецца прыстаўным).

Практыкаванне 86 накіравана не толькі на ўдасканаленне ўмення вучняў правільна пісаць словы з прыстаўной і ўстаўной літарай *в*, але і на замацаванне ўмення падбіраць сінонімы да слоў.

Выкананне практыкавання 87 можа суправаджацца вусным каменціраваннем.

Пасля ўдакладнення значэнняў слоў *вуж* ‘адна з неядавітых змей сямейства паўзуноў’ і *вужака* ‘агульная назва паўзуноў з доўгім гнуткім целам без ног; змяя; ліхі, каварны чалавек’ (рубрыка «Пра-

вільнасць маўлення») можна прапанаваць вучням растлумачыць сэнс фразеалагізмаў:

а) *як вуж* (*уюн*) *на гарачай патэльні* (пры гэтым фразеалагізме ўжываюцца словы-суправаджальнікі *круціцца*, *выкручвацца*; значэнне фразеалагізма — ‘бесперастанку і не знаходзячы выйсця з цяжкіх абставін’); б) *звівацца вужам* (‘хітрыць, спрытна выкручвацца’); в) *вуж галавы не ўткне* (‘занадта густа’ — пра густа парослыя дрэвы, кусты, травы).

Практыкаванні 88—91 вучні выконваюць самастойна.

Перад выкананнем практыкавання 92 варта ўдакладніць разуменне вучнямі сэнсу фразеалагізма *бабіна лета* (‘1) ранняя восень з яснымі цёплымі днямі; 2) серабрыстае павуціннe, што плыве над зямлёй у дні бабінага лета; 3) астра новабельгійская; 4) час прыліву новых сіл, творчай энергіі або ўзнікненне кахання ў пажылыя гады’) і прапанаваць вызначыць, у якім значэнні ўжыта гэта словазлучэнне ў тэксце паводле А. Васілевіч (*у 3-м значэнні*).

Пры спісванні тэксту паводле М. Грынблата «Народныя параўнанні» (практыкаванне 93) вучні ўстаўляюць у яго прапушчаныя народныя параўнанні, прыведзеныя ў рубрыцы «Для даведкі» (прыём **рэканструкцыі лінгвакультуразнаўчага тэксту**). Дадатковае заданне патрабуе прывесці прыклады параўнанняў, у якіх знайшлі адбітак асаблівасці народнага побыту (з дапамогай зборніка «Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы» (1992) вучні могуць назваць параўнанні *схапіў як абцугамі*; *рыпіць як нямазанае кола*; *прыбраўся як хата перад вяселлем*; *гола як на таку*; *робіцца як у млынавым коле* і інш.).

## Правапіс літар *у*, *ў*

**Мэта заняткаў** — удакладніць і сістэматызаваць веды вучняў аб правапісе ***у*** складовага і ***ў*** нескладовага; удасканальваць уменне правільна пісаць словы з ***у*** складовым і ***ў*** нескладовым.

Пры засваенні правілаў правапісу *ў* нескладовага неабходна звярнуць увагу на тое, што чаргаванне [у] з [ў] у словах іншамоўнага паходжання значна пашырылася: *царква ўніяцкая*, *дзяржаўны ўніверсітэт*, *каля ўніверсама*, *на ўнікальным матэрыяле*, *пасля ўрагану*, *здаць ва ўтыль*, *глыбокая ўтопія* і інш. Асаблівай увагі патрабуе засваенне тых слоў іншамоўнага паходжання, у якіх раней гэта чаргаванне не назіралася, а таксама новых запазычанняў, правапіс якіх яшчэ

не знайшоў замацавання ў нарматыўных слоўніках беларускай мовы: *раўнд*, *даўн*, *фаўна*, *андэграўнд*, *саўна*, *клоўн*, *шоўмен*, *ноўтбук*, *джоўль*, *ноўмен*, *пакгаўз*, *лакаўт*, *раўт*, *трэшкоўт*, *чаўш*, *скаўт* і інш.

Пасля знаёмства з тэарэтычным матэрыялам вучням прапануецца завяршыць выказванні:

1. У пачатку ўласных назваў пішацца... (*у* складовае). 2. Пад націскам пішацца... (*у* складовае). 3. На канцы запазычаных слоў пішацца... (*у* складовае). 4. У запазычаных словах, якія заканчваюцца на *-ум*, *-ус*, і вытворных ад іх пішацца... (*у* складовае). 5. Літара *ў* нескладовае пішацца пасля злучка ці двукосся, калі папярэдняе слова заканчваецца... (на галосны).

На аснове тэксту «Музей-парк» паводле Я. Сіпакова (практыкаванне 94) вучні практыкуюцца ў знаходжанні слоў, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс літар *у*, *ў*».

Са словамі, выпісанымі з практыкавання 95, вучням можна прапанаваць скласці словазлучэнні (*радыус акружнасці*, *доўгая паўза*, *ветлівая фраў* і інш.).

Практыкаванне 96 спрыяе ўзбагачэнню слоўніка вучняў беларускімі народнымі параўнаннямі: *надзьмуўся як мыш на крупы*, *трапіў як лісіца ў саладуху*, *спіць як пшаніцу прадаўшы*, *круціцца як уюн на гарачай патэльні*, *баіцца як воўк ягняці*, *бегае як з вуглямі ў нагавіцах*, *вые як воўк у піліпаўку*, *лезе як аса ў вочы*, *ляпнуў як лапцем па балоце пляснуў*, *маўчыць як воцату выпіўшы*.

Пры выкананні практыкаванняў 97, 98 варта растлумачыць лексічныя значэнні слоў *браўнінг* ‘аўтаматычны пісталет асобай сістэмы’ (паходзіць ад прозвішча амерыканскага канструктара); *гаўптвахта* ‘памяшканне для ўтрымання пад арыштам ваеннаслужачых; каравульнае памяшканне ў крэпасці, горадзе (XVII—XIX стст.)’; *сімпозіум* ‘нарада па якім-небудзь навуковым пытанні, звычайна міжнародная’. Практыкаванне 98 (выпісванне слоў з літарамі *у* і *ў*) можа быць выканана па варыянтах.

Практыкаванне 99 вучні выконваюць самастойна з наступнай узаемаправеркай у парах.

Перад спісваннем тэксту «Стваральнік уніі» (практыкаванне 100) трэба ўдакладніць разуменне вучнямі лексічных значэнняў слоў *унія* ‘аб’яднанне праваслаўнай і каталіцкай цэркваў на ўмовах прызнання праваслаўнай царквой вяршэнства Папы Рымскага з захаваннем сваіх абрадаў’, *епіскап* ‘вышэйшае духоўнае званне ў праваслаўнай царкве’.

Практыкаванне 101 выконваецца вучнямі самастойна з апорай на рубрыку «Для даведкі» (адказы: 1 — *кансіліум*, 2 — *шоу*, 3 — *аўдыторыя*, 4 — *баул*, 5 — *соус*, 6 — *раўнд*, 7 — *фаўна*, 8 — *каўбой*, 9 — *аул*, 10 — *аўт*).

## Правапіс мяккага знака і апострафа

### Змякчальны мяккі знак як сродак абазначэння мяккасці папярэдняга зычнага

**Мэта заняткаў** — узнавіць і сістэматызаваць веды вучняў аб правапісе змякчальнага мяккага знака; удасканальваць уменне правільна пісаць словы са змякчальным мяккім знакам.

Пры засваенні правапісу мяккага знака неабходна звярнуць увагу на ўдакладненне, якое ўніфікуе правапіс прыметнікаў, утвораных ад назоўнікаў на *-нь*: мяккі знак не пішацца ў прыметніках, утвораных ад кітайскіх назваў (*чань-чунскі*, *цянь-шанскі*, *уханскі*), якія раней пісаліся з мяккім знакам.

Пасля чытання тэарэтычнага матэрыялу вучням даецца заданне запісаць пад дыктоўку словы (яны прыводзяцца ў якасці прыкладаў для ілюстрацыі палажэнняў правіла аб напісанні змякчальнага мяккага знака), размеркаваўшы іх у два слупкі: 1) словы, у якіх пішацца мяккі знак; 2) словы, у якіх мяккі знак не пішацца:

*Стольк*і, *агледзься*, *голуб*, *шэсцьсот*, *старэнькі*, *цянь-шанскі*, *мядзведзь*, *дзьмуць*, *рэдзька*, *збіраць*, *любанскі*, *дзесьці*, *агеньчык*, *голле*, *жнівеньскі*, *ледзьве*, *стагоддзе*, *сем*, *людзьмі*, *Чэрвеньскі раён*, *дзверы*, *станьце*, *песенька*.

Пры праверцы правільнасці выканання задання школьнікі тлумачаць правапіс слоў з апорай на тэарэтычны матэрыял дапаможніка для вучняў.

На аснове тэксту паводле Я. Брыля (практыкаванне 102) вучні практыкуюцца ў знаходжанні слоў, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс змякчальнага мяккага знака».

Выкананне практыкавання 103 суправаджаецца вусным каменціраваннем, напрыклад: у слове *Віцьба* мяккасць зычнага гука [в’] абазначана на пісьме літарай *і*, мяккасць гука [ц’] — мяккім знакам; у слове *смех* мяккасць гука [с’] перад мяккім [м’] на пісьме не перадаецца, мяккасць гука [м’] абазначана на пісьме літарай *е*.

Пры ўтварэнні ад дзеясловаў формаў 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку загаднага ладу (практыкаванне 104) настаўніку варта

нагадаць вучням, што многія дзеясловы ўтвараюць формы 2-й асобы адзіночнага ліку загаднага ладу з дапамогай нулявога суфікса: *кінь*, *сып*, *стой* і да т. п. Формы 2-й асобы множнага ліку ўтвараюцца ад формаў адзіночнага ліку шляхам дабаўлення постфікса *-це*: *кіньце*, *сыпце*, *стойце* і да т. п. Увага школьнікаў акцэнтуецца на тым, што дзеяслоў закончанага трывання *глянуць* утварае форму 2-й асобы адзіночнага ліку загаднага ладу з дапамогай нулявога суфікса — *глянь*; дзеяслоў незакончанага трывання *глядзець* утварае форму 2-й асобы адзіночнага ліку загаднага ладу з дапамогай формаўтваральнага суфікса *-і* — *глядзі*.

Падчас выканання практыкавання 105 настаўнік звяртае ўвагу вучняў не толькі на правапіс мяккага знака перад суфіксам *-ск-*, але і на правапіс вялікай і малой літар у прыметніках (*Казанскі* — *казанскі*, *Любанскі* — *любанскі* і да т. п.): з вялікай літары пішацца першае слова ў адміністрацыйна-тэрытарыяльных назвах (*Чэрвеньскі раён*), назвах арганізацый, устаноў (*Любанскі музей народнай славы*) і інш.

Размежаванню семантыкі слоў *чытальны* 'прызначаны для чытання, заняткаў з кнігамі, часопісамі', *чытацкі* 'які мае адносіны да чытача', *чытальніцкі* 'які мае адносіны да чытальніка, дэкламатара', *чытэльны*, *чытабельны* 'які лёгка чытаецца, выразны' (рубрыка «Правільнасць маўлення») будзе спрыяць заданне выправіць маўленчыя памылкі ў сказах:

1) *Андрэй з высокім чытацкім майстэрствам дэкламаваў вершы Багдановіча* (правільна — *чытальніцкім*). 2) *У пятніцу ў чытэльнай зале бібліятэкі адбудзецца сустрэча з дзіцячым паэтам* (правільна — *чытальнай*). 3) *Запіска была напісана выразным, чытальніцкім почыркам* (правільна — *чытэльным*, *чытабельным*). 4) *Вучні дзявятага класа рыхтаваліся да чытальнай канферэнцыі* (правільна — *чытацкай*).

Вучні павінны растлумачаць правапіс слоў *чытальны*, *чытальніцкі*, *чытэльны*, *чытабельны* (пасля мяккага [л'] перад цвёрдым або мяккім зычным пішацца мяккі знак).

Практыкаванні 106, 107 вучні выконваюць самастойна, пасля чаго адбываецца ўзаемаправерка ў парах. Пры выкананні практыкавання 108 падводзіцца вынік заняткаў.

### Правапіс раздзяляльнага мяккага знака і апострафа

**Мэта заняткаў** — узнавіць і сістэматызаваць веды вучняў аб правапісе раздзяляльнага мяккага знака і апострафа; удасканальваць уменне правільна пісаць словы з раздзяляльным мяккім знакам і апострафам.

Пры засваенні правіла правапісу раздзяляльнага мяккага знака і апострафа неабходна звярнуць увагу на тое, што раздзяляльны мяккі знак і апостраф выкарыстоўваюцца ў беларускай мове для адлюстравання на пісьме правільнага вымаўлення слоў з гукам [й] паміж зычнымі і галоснымі ў іншамоўных і некаторых уласна беларускіх словах. Пры гэтым раздзяляльны мяккі знак адначасова ўказвае на мяккасць папярэдніх зычных гукаў *л*, *с*, *ц* (з мяккага *т*), *дз* і непрыставачных *н*, *з* і наяўнасць гука [й] паміж імі і наступным галосным, які передаецца на пісьме адпаведнай ётаванай галоснай літарай: *рэ*[л'йэ]*ф*, *ка*[л'йэ], *мі*[л'йо]*н*, *меда*[л'йо]*н*, *паві*[л'йо]*н*, *бі*[л'йа]*рд*, *пар*[ц'йэ]*ра* і інш. Апостраф указвае на наяўнасць (і неабходнасць вымаўлення) гука [й] паміж губнымі *б*, *в*, *м*, *п*, *ф*, заднеязычнымі *г*, *к*, *х*, зубнымі *д*, *т*, дрыжачым *р* і ётаванымі галоснымі літарамі *е*, *ё*, *і*, *ю*, *я*: *а*[бйа]*ва*, *ся*[мйа], *ка*[рйэ]*р*, *надво*[рйэ] і г. д.

Пасля азнаямлення вучняў з тэарэтычным матэрыялам настаўнік прапануе растлумачыць правапіс слоў (яны запісаны на дошцы), зачытаўшы адпаведнае палажэнне правіла аб правапісе раздзяляльнага мяккага знака і апострафа:

а) *Аркадзьевіч* (раздзяляльны мяккі знак пішацца ва ўласных іменах, утвораных ад імёнаў на *-ій*, перад суфіксальным *-ев-*); б) *між'ярусны* (апостраф пішацца перад галоснай *я* пасля прыстаўкі, якая заканчваецца на зычную); в) *більярд* (раздзяляльны мяккі знак пішацца пасля *л* перад галоснай *я* ў словах іншамоўнага паходжання); г) *б'ецца* (апостраф пішацца перад галоснай *е* ў сярэдзіне слова пасля зычнай *б*); д) *льецца* (раздзяляльны мяккі знак пішацца ў словах, утвораных ад дзеяслова *ліць*); е) *шмат'ядзерны* (апостраф пішацца ў складаных словах пасля часткі *шмат-* перад галоснай *я*).

Мэта практыкавання 109 — удасканальваць уменне вучняў адрозніваць змякчальны і раздзяляльны мяккі знак.

Практыкаванні 110—112 прапануюцца для самастойнага выканання.

Дадатковае заданне:

• Падкрэсліць сярод слоў, прыведзеных у практыкаваннях 110, 111, назоўнікі, якія адпавядаюць наступным лексічным значэнням: а) 'прадпрыемства, на якім будуюць ці збіраюць судны' (*верф*); б) 'вакальныя практыкаванні для развіцця слыху і навыкаў чытання нот, пры якіх вымаўляюцца назвы нот' (*сальфеджыа*); в) 'кара́лі з каштоўных камянёў або іх замяняльнікаў' (*кальє*); г) 'венгр' (*мадзьяр*); д) 'старшыня ўрада, старшыня кабінета міністраў у некаторых краінах' (*прэм'ер*).

Практыкаванне 113 (устанаўленне адпаведнасці паміж рускімі і беларускімі прыказкамі) спрыяе ўзбагачэнню слоўніка вучняў трапнымі народнымі выслоўямі, фарміраванню ўяўлення пра адметнасць беларускіх і рускіх прыказак (а д к а з ы: а — 6, б — 1, в — 3, г — 7, д — 2, е — 5, ж — 4).

Практыкаванне 114 накіравана на ўдасканаленне арфаграфічных і пунктуацыйных навыкаў школьнікаў. Дадатковае пытанне «Як беларусы называюць кляновы сок?» акцэнтуе ўвагу вучняў на безэквівалентным у адносінах да рускай мовы слове *кляновік* (рус. *кленовый сок*).

## Ужыванне вялікай і малой літар

**Мэта заняткаў** — пашырыць і сістэматызаваць веды вучняў аб правапісе вялікай і малой літар у асабовых назвах; у прыметніках, утвораных ад асабовых назваў; у геаграфічных і астранамічных назвах; у назвах дзяржаўных органаў і іншых арганізацый; у найменнях пасад і званняў; у назвах дзяржаўных і нацыянальных сімвалаў, рэліквій, дзяржаўных узнагарод; у назвах дакументаў, унікальных прадметаў, твораў; у назвах знамянальных падзей і дат, перыядаў і эпох, свят; удасканальваць уменне правільна ўжываць вялікую і малую літары.

У працэсе азнаямлення з тэарэтычным матэрыялам вучні выпісваюць прыклады слоў (словазлучэнняў), пры напісанні якіх яны маглі б дапусціць арфаграфічныя памылкі.

На аснове тэксту паводле В. Віткі (практыкаванне 115) вучні практыкуюцца ў знаходжанні слоў, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс вялікай і малой літар у асабовых назвах; у прыметніках, утвораных ад асабовых назваў; у астранамічных назвах і інш.».

Выкананне практыкавання 116 спрыяе ўзбагачэнню фразеалагічнага слоўніка вучняў устойлівымі моўнымі адзінкамі *гордзіеў вузел* ‘заблытаная справа, складаныя абставіны’; *ахілесава пята* ‘найбольш паражальнае месца, слабы бок у каго-небудзь’; *дамоклаў меч* ‘пастаянная небяспека, неадступная пагроза’; *аўгіевы стайні* ‘1) вельмі забруджанае месца, запушчанае памяшканне; 2) поўнае бязладдзе, надзвычайная запушчанасць спраў (у якой-небудзь арганізацыі)’; *танталавы пакуты* ‘нясцерпнае мучэнне ад усведамлення блізкасці жаданай мэты і немагчымасці дасягнуць яе’; *мамаева пабоішча* ‘1) вялікая сварка, бойка; 2) поўны беспарадак, неразбярыха’; *як сідараву казу* ‘вельмі жорстка, бязлітасна (лупіць каго-небудзь)’.

Пасля выканання практыкавання 117 (устанаўленне адпаведнасці паміж назвамі міфічных істот і іх характарыстыкамі: а — 4, б — 1, в — 5, г — 3, д — 2) варта пазнаёміць вучняў з іншымі назвамі ўяўных істот: *балотнік*, *гаюн*, *лазнік*, *падпечнік*, *палявік*, *пуннік*, *пушчавік*, *хлеўнік*. Школьнікам прапануецца адказаць, дзе, згодна з народнымі ўяўленнямі, жывуць гэтыя міфічныя істоты, духі.

Праца над практыкаваннем 118 (спісванне тэксту «“Каляровыя” назвы рэк» паводле А. Карлюкевіча) з’яўляецца лагічным працягам знаёмства вучняў з рубрыкай «Назвы роднага краю».

Выкананне практыкавання 119 варта суправаджаць вусным каменціраваннем.

Практыкаванне 120 можа быць выканана па варыянтах: 1-ы варыянт — запіс выразаў са словамі *Месяц — месяц*, *Цётка — цётка*, *Глыбокае — глыбокае* (напрыклад, *палёт на Месяц — самотны месяц*, *творы Цёткі — мая цётка*, *возера Глыбокае — глыбокае возера*); 2-і варыянт — запіс выразаў са словамі *Брэсцкая — брэсцкая*, *Ціхі — ціхі*, *Купалава — Купалаўская — купалаўская* (напрыклад, *вуліца Брэсцкая — брэсцкая мэбля*, *Ціхі акіян — ціхі вечар*, *Купалава паэма — Купалаўская бібліятэка — купалаўская паэзія*).

Пры спісванні сказаў (практыкаванне 121) школьнікі могуць абапірацца на прыклады, якія прыводзяцца ў тэарэтычнай частцы дапаможніка для вучняў: *Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы*, *Палац спорту*, *Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь*, *Міжнародны алімпійскі камітэт*, *Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі*.

Практыкаванне 122 можа быць прапанавана для самастойнага выканання. Спісваючы тэкст паводле Я. Сіпакова, вучні ўдасканальваюць уменне правільна ўжываць вялікую і малую літары ў назвах арганізацый (*Мінскі палац дзяцей і моладзі*), афіцыйных назвах асобы (*Папа Рымскі*), назвах плошчаў (*плошча Святога Пятра*), імёнах (*Ян Павел Другі*), агульных назвах уяўных істот (*анёлы*) і інш.

Пераклад тэксту (практыкаванне 123) спрыяе замацаванню ўмення вучняў правільна ўжываць вялікую і малую літары ў назвах дзяржаўных органаў (*Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь*), дзяржаўных дакументаў (*Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь*), афіцыйных назвах асобы (*Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь*, *Прэм’ер-міністр Рэспублікі Беларусь*).

Практыкаванне 124 можа быць выканана па варыянтах: 1-ы варыянт — запіс выразаў са словамі *Беларускі — беларускі*, *Савет — савет*, *Нацыянальны — нацыянальны* (напрыклад, *Беларускі дзяр-*

*жаўны ўніверсітэт — беларускі арнамент*, *сельскі Савет дэпутатаў — педагагічны савет*, *Нацыянальны алімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь — нацыянальны касцюм*); 2-і варыянт — запіс выразаў са словамі *Дом — дом*, *Таварыства — таварыства*, *Старшыня — старшыня* (напрыклад, *Дом культуры — шматпавярховы дом*, *Таварыства Чырвонага Крыжа — акцыянернае таварыства*, *Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь — выступленне старшыні*).

Пры спісванні сказаў (практыкаванне 125) школьнікі могуць абапірацца на прыклады, якія прыводзяцца ў тэарэтычнай частцы дапаможніка для вучняў: *Нобелеўская прэмія*, *Востраў Слёз*, *тэлевізар «Гарызонт»*, *ордэн Францыска Скарыны*, *Дзяржаўны сцяг* і інш.

Пасля спісвання вучнямі тэксту паводле У. Арлова (практыкаванне 126) настаўнік можа парэкамендаваць пазнаёміцца з кнігай «Жыватворны сімвал Бацькаўшчыны» (1998, аўтар-укладальнік У. Арлоў), прысвечанай нацыянальнай рэліквіі беларускага народа — Крыжу Ефрасінні Полацкай. Кніга апавядае пра стварэнне святыні і яе драматычны лёс у мінулыя стагоддзі, пра загадкавае знікненне Крыжа і яго пошукі ў наш час, пра творчы подзвіг беларускага майстра-ювеліра Міколы Кузьміча, які ў 1997 годзе ўзнавіў вобраз Крыжа Ефрасінні Полацкай.

Тэкст паводле Т. Песнякевіч пра беларускі ансамбль «Бяседа» (практыкаванне 127) акцэнтуе ўвагу вучняў на цяжкіх выпадках ужывання вялікай і малой літар (вялікая і малая літары ў назвах арганізацый і ўстаноў (*Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі*), у найменнях званняў (*заслужаны артыст Беларусі*), дзяржаўных узнагарод (*Дзяржаўная прэмія Беларусі*) і інш.). Дадатковыя заданні да тэксту патрабуюць:

— назваць песні з рэпертуару ансамбля «Бяседа» (*«Маруся»*, *«Запрагай-ка, бацька, коней»* і інш.);

— растлумачыць розніцу ў лексічных значэннях беларускага слова *бяседа* і рускага *беседа* (бел. *бяседа* — збор гасцей з пачастункам; рус. *беседа* — размова; настаўніку варта нагадаць вучням, што падобныя пары слоў называюцца міжмоўнымі амонімамі);

— раскрыць сэнс прыказкі *«Без кавалачка хлеба кепская бяседа»* (‘без пачастунка збіраць гасцей не прынята’).

Пасля спісвання вучнямі тэксту паводле В. Віткі (практыкаванне 128) настаўнік можа прапанаваць школьнікам самім скласці тэксты для ўскладненага спісвання (з устаўкай прапушчаных літар, выбарам з

дужак патрэбнай літары) пра славутых дзеячаў нацыянальнай гісторыі і культуры. З гэтай мэтай рэкамендуецца выкарыстаць энцыклапедычны даведнік «Асветнікі зямлі Беларускай» (2001). Картка з тэкстам павінна складацца з дзвюх частак: 1) тэкст, які трэба спісаць, рашаючы арфаграфічныя задачы; 2) тэкст для самаправеркі. Напрыклад:

| ВАЛЕНЦІЙ ВАНЬКОВІЧ | ВАЛЕНЦІЙ ВАНЬКОВІЧ |
|---|---|
| Жывапісец Валенцій Ваньковіч (1800—1842) нара(д / дз)іўся ў вёсцы (К / к)алюжыца на (М / м)іншчыне ў сям..і павятовага суд..і. Вучыўся ў (П / п)олацкім (Е / е)зуі(тс / ц)кім (К / к)алегі(у / ў)ме, потым у (В / в)іленскім (У / у)ніверсітэце. Пасля заканчэння (у / ў)ніверсітэта за дз..ржаўны кошт быў накіраваны на вучобу ў (П / п)ецярбур..скую (М / м)астацкую (А / а)кад..мію.<br>Некаторыя карціны Ваньковіча захоўваюцца ў (Д / д)зяржаўным (М / м)астацкім(М / м)узеі(Р / р)эспублікі (Б / б)еларусь. Карціна «(М / м)адон..а з дзіцём» знаходзіцца ў (Л / л)уўры. | Жывапісец Валенцій Ваньковіч (1800—1842) нарадзіўся ў вёсцы Калюжыца на Міншчыне ў сям'і павятовага суддзі. Вучыўся ў Полацкім езуіцкім калегіуме, потым у Віленскім універсітэце. Пасля заканчэння ўніверсітэта за дзяржаўны кошт быў накіраваны на вучобу ў Пецярбургскую мастацкую акадэмію.<br>Некаторыя карціны Ваньковіча захоўваюцца ў Дзяржаўным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь. Карціна «Мадонна з дзіцём» знаходзіцца ў Луўры. |

Выконваючы практыкаванне 129, вучні замацоўваюць уменне правільна ўжываць вялікую і малую літары ў назвах дзяржаўных свят, святочных і памятных дзён: *Дзень Канстытуцыі* (15 сакавіка), *Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі* (2 красавіка), *Дзень Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь* (другая нядзеля мая), *Дзень Перамогі* (9 мая), *Дзень Незалежнасці* (3 ліпеня), *Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь* (23 лютага), *Дзень жанчын* (8 сакавіка), *Свята працы* (1 мая), *Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны* (22 чэрвеня), *Радаўніца* (9-ы дзень пасля праваслаўнага Вялікадня).

Практыкаванне 130 спрые замацаванню ўмення школьнікаў правільна ўжываць вялікую і малую літары ў назвах з двукоссем, геаграфічных назвах, назвах гістарычных эпох і падзей, назвах міфічных істот, назвах арганізацый.

# Агульныя правілы напісання слоў разам і праз злучок

**Мэта заняткаў** — замацаваць і пашырыць веды вучняў аб правілах напісання слоў разам і праз злучок; удасканальваць уменне правільна пісаць словы разам і праз злучок.

Чытаючы тэарэтычны матэрыял, вучні дапаўняюць яго ўласнымі прыкладамі слоў, што ілюструюць розныя выпадкі напісання слоў разам і праз злучок. У сшытках вучняў можа з'явіцца наступны запіс:

1) а) *журфак*, *універмаг*, *прафкам*; б) *агракамбінат*, *аэрасалон*, *спартбаза*; в) *паўфінал*, *паўшар'е*, *паў-Еўропы*; г) *архіважны*, *інфрачырвоны*, *трансатлантычны*; д) *двухбаковы*, *трохбор'е*, *чатырохпакаёвы*;

2) а) *чысты-чысты*, *хто-ніхто*, *крыж-накрыж*; б) *паіць-карміць*, *сяк-так*, *сюды-туды*; в) *45-гадовы*, *9-працэнтны*, *алімпіяда-2014*.

Практыкаванне 131 спрыяе развіццю арфаграфічнай пільнасці вучняў. Правільна напісаны ўсе словы ў 3-м і 5-м радках. Вучні павінны выпісаць словы *агратэхніка*, *трохбор'е*, *грамзапіс*, *біяэнергетыка*, *гуляй-вецер*, *псеўдамастацтва* (у практыкаванні гэтыя словы запісаны з памылкамі) і растлумачыць іх правапіс.

Пасля азнаямлення з рубрыкай «Правільнасць маўлення» (размежаванне значэнняў прыставак *дыс-* і *дэз-*) школьнікам прапануецца ўстанавіць адпаведнасць паміж назоўнікамі з прыстаўкамі *дыс-*, *дэз-* і іх значэннямі (практыкаванне 132) (а д к а з ы: а — 4, б — 5, в — 1, г — 2, д — 3).

Настаўніку варта звярнуць увагу вучняў на значэнні некаторых прыставак і першых састаўных частак складаных слоў:

*а-* — абазначае адсутнасць прыметы, уласцівасці, паказанай у асноўнай частцы слова (*амаральны*, *алагічны*);

*архі-* — мае значэнне вышэйшай і найвышэйшай ступені прыкметы, якая названа ў другой частцы слова (*архіасцярожны*, *архінебяспечны*);

*гіпер-* — паказвае на перавышэнне чаго-небудзь у параўнанні з нормай (*гіпертанія*, *гіпергукавы*);

*контр-* — абазначае процідзеянне, проціпастаўленне, процілегласць таму, што выражана ў другой частцы (*контрудар*, *контрнаступленне*);

*пан-* — паказвае на поўны ахоп з'явы, на поўнае панаванне, поўную перавагу таго, што абазначана другой часткай (*панславізм*, *панісламізм*);

*супер-* — паказвае на: 1) размяшчэнне зверху, над чым-небудзь (*супервокладка*); 2) што-небудзь другаснае, паўторнае (*суперінфекцыя*);

3) старшынство, узначальванне (*суперарбітр*); 4) вышэйшую ступень якасці чаго-небудзь або ўзмоцненае дзеянне (*суперэліта*, *суперартылерыя*); 5) найбольшую хуткасць (*суперэкспрэс*);

*транс-* — абазначае: 1) рух цераз якую-небудзь прастору, перасячэнне яе (*трансарктычны*, *трансакіянскі*); 2) размяшчэнне за межамі чаго-небудзь (*трансальпійскі*); 3) перадачу ці абазначэнне з дапамогай чаго-небудзь (*транслітарацыя*);

*ультра-* — мае значэнні ‘крайні’, ‘найвышэйшы’, ‘які знаходзіцца за межамі чаго-небудзь’ (*ультрасучасны*, *ультракароткі*);

*экс-* — 1) абазначае рух знутры наверх (*экспатрыяцыя* ‘дабравольнае ці прымусовае высяленне каго-небудзь за межы радзімы, якое звязана звычайна з пазбаўленнем праў грамадзянства’); 2) адпавядае па значэнні слову *былы* (*экс-чэмпіён*, *экс-міністр*);

*экстра-* — адпавядае па значэнні словам *звыш*, *па-за*, *дадаткова* (*экстраардынарны*, *экстралінгвістычны*).

Практыкаванне 133 прапануецца для самастойнага выканання з наступнай узаемаправеркай у парах.

Пры выкананні практыкавання 134 (выпісванне з тэксту «Без памяці немагчыма абнаўленне свету...» слоў, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс слоў разам і праз злучок») вучні замацоўваюць таксама ўменне правільна пісаць складаныя прыметнікі (*сіне-зялёны*, *светла-блакітны*, *прыемна-шчымлівы*, *нацыянальна-культурны*, *старажытна-беларускі*), назоўнікі з аднаслоўным прыдаткам (*зямля-пакутніца*).

Настаўніку варта звярнуць увагу школьнікаў на тое, што аўтарам тэксту з’яўляецца народны мастак Беларусі Анатоль Анікейчык — выдатны беларускі скульптар, які прымаў удзел у стварэнні знакамітых манументальных ансамбляў: помніка Я. Купалу ў Мінску, мемарыяльнага комплексу «Прарыў» на Ушаччыне, помніка М. Гастэлу і яго экіпажу ў Радашковічах, помніка Я. Купалу ў Араў-парку (ЗША) і інш.

На гэтых занятках праводзіцца **слоўнікавы дыктант**, што ўключае словы, напісанне якіх адпавядае вывучаным правілам:

*Паўталеркі, фае, цырымонія, соус, экс-міністр, парцьера, Дзень Канстытуцыі, дыяпазон, Вялікабрытанія, перайменаваць, Купалаўскі тэатр, двукоссе, збожжасховішча, каменьчык, сямнаццаць, абясшкодзіць, радыеактыўны, Вялікае Княства Літоўскае, фотакамера, Другая сусветная вайна, фрау, малацьба, дэзынфекцыя, дарадчык, посны, ін’екцыя, перыядычны, парламенцкі, апладысменты, людзьмі, карэспандэнт, наводшыбе, маёр, праінфармаваць.*

## Правілы пераносу слоў

**Мэта заняткаў** — удакладніць веды вучняў аб правілах пераносу слоў; замацоўваць уменне пераносіць словы з аднаго радка на другі.

З тэарэтычнага матэрыялу вучні выпісваюць прыклады, якія ілюструюць розныя правілы пераносу слоў, або прыводзяць уласныя прыклады пераносу:

1) *пе-ра-мо-га*; *пла-мбір* і *плам-бір*; *ра-злік* і *раз-лік*; 2) *ор-дар*, *ада-жыа*; 3) *па-дзея*, *ва-джу*; *пад-зорны*; 4) *гай-ка*, *каў-нер*; 5) *поль-ка*, *аб'-ём*; 6) *жыц-цё* і *жы-ццё*; 7) *безы-дэйны*, *без-ыдэйны* і *бе-зыдэйны*; 8) *пер-ша-дру-кар* і *пе-рша-дру-кар*.

Мэта практыкавання 135 — развіццё ўменння вучняў правільна пераносіць словы.

З тэксту паводле У. Арлова (практыкаванне 136) вучні павінны выпісаць выдзеленыя словы, падзяляючы іх для пераносу. Дадатковае заданне можа заключацца ў тым, каб устанавіць адпаведнасць паміж словамі і іх лексічнымі значэннямі:

| | |
|---|---|
| а) плытніцтва | 1) шыццё і рамонт абутку |
| б) цяслярства | 2) грубая апрацоўка драўніны, узвядзенне драўляных будынкаў |
| в) кравецтва | 3) выраб рэчаў гаспадарчага і дэкаратыўна-прыкладнога характару з гліны |
| г) ганчарства | 4) шыццё адзення |
| д) шавецтва | 5) лесасплаўная справа |

Адказы: а — 5, б — 2, в — 4, г — 3, д — 1.

Вучні запісваюць назоўнікі з левага слупка, падзяляючы іх для пераносу, указваюць усе магчымыя варыянты пераносу слоў.

Акцэнтаванню ўвагі школьнікаў на безэквівалентных словах (у адносінах да рускай мовы) будуць спрыяць заданні падабраць аднаслоўныя беларускія адпаведнікі да рускамоўных словазлучэнняў: *кузнечное дело* (кавальства); *ремесло каменщика* (мулярства); *ремесло кожевника* (гарбарства); *изготовление деревянной посуды* (бондарства); падзяліць гэтыя словы для пераносу.

## Падагульненне вывучанага

Практыкаванне 137 спрыяе развіццю арфаграфічнай пільнасці вучняў. Правільна напісаны ўсе словы ў 3-м і 4-м радках. Вучні павінны выпісаць словы *наезнік*, *прадвеснік*, *прэм'ера*, *парцьера*, *экзатычны*,

*стыхія* (у практыкаванні гэтыя словы запісаны з памылкамі) і растлумачыць іх правапіс. Акрамя таго, школьнікам трэба ўказаць, якім правілам адпавядае напісанне слоў у кожным радку (1 — «Правапіс некаторых спалучэнняў зычных», 2 — «Правапіс раздзяляльнага мяккага знака і апострафа», 3 — «Правапіс спалучэнняў галосных у іншамоўных словах», 4 — «Правапіс галосных *е*, *ё*, *я*», 5 — «Правапіс *д* і *дз*, *т* і *ц*»).

На аснове тэксту паводле Г. Загародняга (практыкаванне 138) вучні практыкуюцца ў групоўцы слоў у адпаведнасці з пэўнымі арфаграфічнымі правіламі.

Мэта практыкавання 139 — фарміраванне ўмення вучняў рэдагаваць сказы ў адпаведнасці з арфаграфічнымі нормамі. Практыкаванне 140 спрыяе ўдасканаленню арфаграфічных навыкаў школьнікаў.

Тэкст паводле І. Лепешава «Вомегам вылазіць» (практыкаванне 141) можа быць выкарыстаны для папераджальнага дыктанта: спачатку аналізуюцца арфаграмы, якія могуць выклікаць у вучняў цяжкасці (*бясследна*, *паказчык*, *спачатку*, *зламоўны* і інш.), пасля чаго школьнікі запісваюць тэкст пад дыктоўку або спісваюць, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі, выконваюць самаправерку ці ўзаемаправерку.

## Адказы да тэставых заданняў

| **№ тэсту** | **А 1** | **А 2** | **А 3** | **А 4** | **В 1** |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 1, 2, 3 | 2, 4, 5 | 3, 4 | 3, 4, 5 | *адрасат* |
| 2 | 1, 4, 5 | 3, 4, 5 | 1, 3, 4 | 3, 5 | *медзведзяня* |
| 3 | 2, 3 | 1, 3 | 1, 2, 4 | 1, 3 | *высакаякасны* |
| 4 | 2, 4, 5 | 1, 3, 5 | 1, 3, 4 | 2, 3, 5 | *акардэон* |
| 5 | 1, 4, 5 | 1, 2, 4 | 1, 5 | 1, 3, 4 | *прымчацца* |
| 6 | 1, 4 | 2, 5 | 2, 4, 5 | 3, 5 | *праіснаваць* |
| 7 | 2, 3, 5 | 1, 3, 4 | 1, 3, 4 | 3, 5 | *падцягнешся* |
| 8 | 2, 3 | 2, 4 | 1, 4, 5 | 1, 3, 5 | *дэбютаваць* |
| 9 | 2, 4 | 1, 4, 5 | 2, 3, 4 | 1, 4 | *гуссю* |
| 10 | 2, 4, 5 | 1, 3 | 2, 5 | 1, 2, 4 | *Орша* |
| 11 | 2, 5 | 1, 3, 4 | 1, 2, 5 | 2, 3, 5 | *страус* |
| 12 | 2, 5 | 1, 3, 5 | 1, 2, 3 | 1, 3, 5 | *Вітальевіч* |
| 13 | 1, 2, 4 | 1, 4, 5 | 2, 3, 5 | 2, 3 | *3* |
| 14 | 1, 3, 4 | 2, 3, 5 | 2, 4, 5 | 1, 4 | *прафкам* |

Падагульняльны тэст:

| **А 1** | **А 2** | **А 3** | **А 4** | **А 5** | **А 6** | **А 7** | **А 8** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3, 4, 5 | 1, 3 | 2, 4 | 3, 4, 5 | 1, 2, 4 | 1, 4 | 1, 2, 5 | 4, 5 |
| **А 9** | **А 10** | **А 11** | **А 12** | **А 13** | **А 14** | **А 15** | **А16** |
| 2, 4, 5 | 2, 4, 5 | 1, 5 | 1, 2, 3 | 3, 4, 5 | 1, 4 | 2, 5 | 2, 4 |

| **В 1** | **В 2** | **В 3** | **В 4** |
|---|---|---|---|
| жыццярадасны | бяскрыўдны | маштаб | трох’ярусны |

# ЛІТАРАТУРА


1. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. — Мінск : Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2008. — 144 с.

2. *Бадзевіч, З. І.* Вывучаем новую рэдакцыю правілаў беларускага правапісу / З. І. Бадзевіч // Рэпетытор. — 2010. — № 4.

3. *Дзятко, Д.* Беларускі правапіс і граматыка: Тэорыя і заданні для школьнікаў / Д. Дзятко, Н. Радзівавоўская, В. Урбан // Роднае слова. — 2010. — № 7.

4. *Іўчанкаў, В.* Беларускі правапіс: з дваццатага стагоддзя — у дваццаць першае / В. Іўчанкаў // Роднае слова. — 2009. — № 2.

5. *Іўчанкаў, В. І.* Пра змены ў беларускім правапісе / В. І. Іўчанкаў // Беларуская мова і літаратура. — 2009. — № 1.

6. *Іўчанкаў, В. І.* Сучасны беларускі правапіс: семінар-практыкум / В. І. Іўчанкаў // Беларуская мова і літаратура. — 2009. — № 11; 2010. — № 2, 4.

7. *Іўчанкаў, В. І.* Беларускі правапіс: Гісторыя і сучаснасць / В. І. Іўчанкаў // Беларускі гістарычны часопіс. — 2009. — № 7.

8. *Іўчанкаў, В. І.* Беларускі правапіс будзе рэгулявацца законам: урокі беларускага правапісу / В. І. Іўчанкаў // Настаўніцкая газета. — 2009. — № 121, 125, 128, 131, 134, 137, 141, 143, 146, 150, 154, 157, 160, 161, 165—166; 2010. — № 3, 6, 11, 15, 18, 22, 25, 28, 31, 34, 37, 40, 43, 46, 49, 52 [публікацыя працягваецца].

9. *Іўчанкаў, В.* Беларускі правапіс у апорных схемах / В. Іўчанкаў // Роднае слова. — 2010. — № 5—7 [публікацыя працягваецца].

10. *Іўчанкаў, В. І.* Беларуская арфаграфія: Апавяданні і гісторыі / В. І. Іўчанкаў. — Мінск : Пачатковая школа, 2010.

11. *Іўчанкаў, В. І.* Беларускі правапіс у апорных схемах: Паводле новай рэдакцыі «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» / В. І. Іўчанкаў. — Мінск : Пачатковая школа, 2010.

12. Кароткая граматыка беларускай мовы : у 2 ч. / навук. рэд. А. А. Лукашанец. — Мінск : Беларус. навука, 2007. — Ч. 1. — 351 с.

13. Кароткая граматыка беларускай мовы : у 2 ч. / навук. рэд. А. А. Лукашанец. — Мінск : Беларус. навука, 2009. — Ч. 2. — 240 с.

14. *Лукашанец, А.* Вывучаем новыя правілы беларускага правапісу / А. Лукашанец, Л. Кунцэвіч, І. Кандраценя // Роднае слова. — 2009. — № 1—12; 2010. — № 1—4.

15. Пішам па-беларуску : даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі / З. І. Бадзевіч [і інш.]. — Мінск : Аверсэв, 2010.

16. *Раманцэвіч, В.* Слоўнікавыя практыкаванні як сродак навучання роднай мове: новая рэдакцыя правіл беларускага правапісу / В. Раманцэвіч, М. Прыгодзіч // Роднае слова. — 2010. — № 4, 6.

17. *Савіцкая, І.* Беларускі правапіс: Дыдактычны матэрыял / І. Савіцкая // Роднае слова. — 2010. — № 6.

* * *

Беларускі арфаграфічны слоўнік / уклад. Л. П. Кунцэвіч, І. У. Кандраценя ; пад рэд. А. А. Лукашанца ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы.— Мінск : Беларус. навука, 2009.

# ДЫДАКТЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

## УВОДЗІНЫ

**Арфаграфія** (ад грэч. *orthos* — правільны і *grafo* — пішу), або **правапіс**, — гэта сістэма правіл перадачы вуснага маўлення на пісьме. Арфаграфія вызначае аднастайнае, агульнапрынятае і абавязковае для ўсіх, унармаванае напісанне слоў і іх форм.

Арфаграфія ўключае правілы:

— напісання слоў і іх частак;
— напісання слоў разам, праз злучок і асобна;
— ужывання вялікай літары;
— пераносу слоў з аднаго радка на другі;
— напісання абрэвіятур і розных агульнапрынятых умоўных графічных скарачэнняў.

Арфаграфія любой мовы грунтуецца на пэўных навуковых асновах, прынцыпах. Правапіс беларускай мовы пераважна грунтуецца на фанетычным і марфалагічным прынцыпах.

**Фанетычны прынцып** правапісу прадугледжвае перадачу гукаў на пісьме ў адпаведнасці з літаратурным вымаўленнем (як чуем, так і пішам). На гэтым прынцыпе грунтуюцца наступныя правілы:

1) перадача акання;

2) перадача якання;

3) напісанне літары *ы* на месцы этымалагічнага [э] ў некаторых запазычаных словах: *інжынер*, *арышт*, *брызент*;

4) напісанне спалучэнняў галосных у словах іншамоўнага паходжання: *біёніка*, *рацыён*, *бібліятэка*;

5) правапіс прыставак *без-* (*бяз-*, *бес-*, *бяс-*), *з-* (*с-*), *раз-* (*рас-*, *роз-*, *рос-*), *уз-* (*ус-*), *цераз-* (*церас-*): *узгадаць — успомніць*, *бяздушны — бясконцы*;

6) перадача на пісьме дзекання і цекання;

7) правапіс спалучэнняў *зн*, *нц*, *рц*, *рн*, *сн*, *сл* на месцы этымалагічных [здн], [лнц], [рдц], [рдн], [стн], [стл]: *праязны*, *сонца*, *сэрца*, *капусны*;

8) перадача на пісьме фанетычнага падаўжэння зычных;

9) узнікненне прыстаўных гукаў;

10) напісанне літары *с* на месцы гістарычных спалучэнняў [жс], [гс], [шс], [хс] і спалучэння [сс] на стыку кораня і суфікса: *мноства*, *хараство*, *княства*, *птаства*, *адэскі*, *палескі*;

11) напісанне літары *т* на месцы спалучэння [дт] на канцы іншамоўных слоў: *Шміт*, *Рэмбрант*;

12) напісанне літары *ц* на месцы спалучэнняў [тс], [чс], [кс], [цс]: *савецкі*, *ткацкі*, *мастацкі*, *лельчыцкі*;

13) правапіс *у* і *ў* у залежнасці ад пазіцыі ў слове;

14) напісанне спалучэння *чч* у геаграфічных назвах тыпу *Полаччына*, *Случчына* на месцы спалучэння [цк];

15) захаванне на пісьме асіміляцыі свісцячых да шыпячых у некаторых словах: *пяшчотны*, *нішчымны* і інш.;

16) напісанне адной літары ў словах *алея*, *клас*, *тона*, *маса* і інш.

**!** Выключэнні з правіл не адпавядаюць фанетычнаму прынцыпу напісання.

**Марфалагічны прынцып** прадугледжвае аднастайнае напісанне марфем — незалежна ад таго, як яны вымаўляюцца. Напрыклад, у аднакаранёвых словах *горад*, *гарады*, *гарадскі* ў корані вымаўляюцца розныя гукі ([горат], [гарады], [гарацк’і]), але нязменна захоўваецца *д* пры напісанні. На гэтым прынцыпе грунтуюцца наступныя правілы:

1) правапіс глухіх і звонкіх, свісцячых і шыпячых зычных (аглушэнне звонкіх зычных, азванчэнне глухіх, асіміляцыйная мяккасць зычных, прыпадабненне шыпячых да свісцячых і свісцячых да шыпячых);

2) правапіс зычных на стыку марфем;

3) напісанне спалучэнняў *дц*, *тц*, *чц* (у вымаўленні [цц]): *на кладцы*, *у хатцы*, *у хустачцы*;

4) напісанне прыставак *аб-*, *ад-*, *над-*, *пад-* і прыназоўнікаў *аб*, *ад*, *над*, *пад*;

5) напісанне прыназоўніка *без* і часціцы *не*;

6) правапіс каранёвага *я* (*пояс*, *месяц*, *заяц*) і суфіксаў *-язь*, *-ядзь* (*боязь*, *дробязь*, *роўнядзь*);

7) правапіс каранёвых зычных *з*, *ж*, *ш*, *г*, *х* перад суфіксам *-ск-* і каранёвага *д* перад суфіксальнай *с*: *французскі*, *нясвіжскі*, *чэшскі*, *казахскі*, *суседскі*.

**1.** Прачытайце выказванне Васіля Віткі. Пра які прынцып беларускай арфаграфіі ідзе гаворка ў тэксце?

Часта кажуць, што нібыта галоўны прынцып беларускай граматы — як гаворыцца, так і пішацца. Выходзіць, самая лёгкая ў свеце наша мова? Як сказаў, так і напішы. Як напісаў, так і прачытай. Аднак жа такая лёгкасць, калі ёй паверыць, ой як хітра можа падмануць.

Ці згодны вы з тым, што ў беларускай мове «як гаворыцца, так і пішацца»?

**2.** Размяркуйце словы па групах: а) словы, напісанне якіх заснавана на фанетычным прынцыпе арфаграфіі; б) словы, напісанне якіх заснавана на марфалагічным прынцыпе арфаграфіі.

Звузіць, лебедзь, нясвіжскі, казка, вокладка, просьба, пагодлівы, абсыпаць, ламачча, падсохнуць, зграя, завязь, глыток, дзеці, біялогія, бяздомны, зжаць, перакладчык, патрыятызм, без сватоў, раздарожжа, верасень, мноства, страўнік, не сустракаў, гарадскі, свіслацкі, без шкла, спаўзці, падзяка, заводскі, яшчарка.

**3.** Адгадайце загадкі. Запішыце словы-адгадкі, падкрэсліце ў іх арфаграмы, вусна растлумачце правапіс.

1. Ішоў даўгавяз — у сырую зямлю ўвяз. 2. Хоць у капелюшы, а галавы не мае. 3. Што зімою камлём угору расце? 4. Што без вады плавае? 5. Худ канёк, а ўсё возера выпіў. 6. Стаіць дуб, на дубе дванаццаць гнёзд, у кожным гняздзе па чатыры сініцы, у кожнай сініцы па чатырнаццаць яек, сем чорных і сем белых. 7. Ляцелі сівыя галубкі, упалі на ваду; вады не скаламуцілі і самі не паляцелі.

**4.** Прачытайце тэкст. Выпішыце па сем прыкладаў напісанняў, заснаваных на фанетычным і марфалагічным прынцыпах.

Цешацца вяскоўцы, калі пры хаце гняздзяцца буслы. Лічыцца, што гэтыя птахі ахоўваюць жыллё ад няшчасця. Каб прывабіць буслоў, гаспадар зацягвае на дрэва ці на край гумна старую барану. А буслы ўжо самі выкладваюць гняздо з галля на зубах бараны, высцілаюць яго сухой травою і мохам. Буслянка — шыкоўнае гняздо: зверху, як у палацы, жывуць самі буслы, а па баках і ўнізе месцяцца непераборлівыя вераб'і.

З усмешкаю згадваю, як мы, вясковыя дзеці, крычалі, убачыўшы бусла ў небе:

Бусел-калода,
Што заўтра будзе —
Дождж ці пагода?

Верылі: калі бусел у гэты час памахае крыламі, то пойдзе дождж, калі не — будзе добрае надвор'е.

(*Паводле М. Маляўкі*)

### Мова і нацыянальная культура

**5.** Спішыце тэкст, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары. Якім прынцыпам арфаграфіі падпарадкоўваецца іх напісанне?

Усе, хто н.. быў у нашым горад..е г..доў дзес..ць-пятна..цаць, прыя..джаючы зноў у Мінск, н.. могуць пазнаць сталіцу

Б..ларусі. Мы, мінчане, бачым: гора.. наш м..няецца, рас..це, прыг..жэе з кожным днём. З..явіліся новыя ра..ны, прас..пекты і ..уліцы, наса..жаныя кл..патлівымі рукамі старан..ых мінчан скверы і паркі.

Плошча Якуба Коласа — адна з на..цікавейшых м..сцін горада. А калiс..ці тут туліліся др..ўляныя хібаркі. Замест сё..няшніх ш..рокіх асфал..таваных ..уліц былі ..узенькія крывыя за..улачкі, з граз..ю, лужамі на кожным кроку.

Няма ўжо і старой Камароўкі. Ёс..ць в..лізная плошча, пабудаваны па апошнім слове т..хнікі прыгожы архіт..ктурны ансамбль.

(*Паводле Б. Сачанкі*)

# ПРАВАПІС ГАЛОСНЫХ

У беларускім алфавіце 10 галосных літар: *а*, *о*, *у*, *э*, *ы*, *е*, *ё*, *ю*, *я*, *і*.

Літары *а*, *о*, *у*, *э* пішуцца ў пачатку слова і пасля цвёрдых зычных для абазначэння адпаведных галосных гукаў. Літара *і* пішацца ў пачатку слова, пасля зычных пішацца *ы* або *і* ў залежнасці ад цвёрдасці або мяккасці зычнага.

Літары *е*, *ё*, *ю*, *я*, *і* пасля зычных абазначаюць мяккасць зычных і адпаведныя гукі [э], [о], [у], [а], [і]: *газета* — *га*[з’э]*та*, *лёд* — [л’о]*д*, *цюль* — [ц’у]*ль*, *вясна* — [в’а]*сна*, *піск* — [п’і]*ск*.

Літары *я*, *ё*, *е*, *ю* ў пачатку слова, у сярэдзіне слова пасля галосных, *ў* (нескладовага), раздзяляльнага мяккага знака і апострафа абазначаюць на пісьме спалучэнні зычнага гука [й] з галоснымі [а], [о], [э], [у]: *яма* — [йа]*ма*, *ён* — [йо]*н*, *паёк* — *па*[йо]*к*, *паехаў* — *па*[йэ]*хаў*; *льеш* — *л*[йэ]*ш*, *б’ю* — *б*[йу].

Літара *і* можа абазначаць у розных становішчах розныя гукі і вымаўляецца:

— як [йі] ў пачатку слова пад націскам, пасля галоснага, пасля апострафа, мяккага знака і *ў*: *іней* [йін’эй], *краіна* [крайіна], *аб’інець* [абйін’эц’], *Ільіч* [ільйіч], *салаўі* [салаўйі];

— як [і] ў пачатку слова не пад націскам: *імя* [ім’а], *Ірына* [ірына], *інтэлект* [інтэл’экт], *іржышча* [іржышча];

— як [й] у пачатку слова, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосны: *вазьмі іголку* [ваз’м’і йголку], *дачка Івана* [дачка йвана], *яна ішла* [йана йшла]; таксама вымаўляецца злучнік *і*: *гукі і літары* [гук’і й л’ітары], *яна і ён* [йана й йон];

— як [ы] пасля слова на цвёрды зычны (акрамя заднеязычных *г, к, х*): *з іголкай* [зыголкай], *ад іскры* [адыскры], *ён ішоў* [йон ышоў], *месяц і зоркі* [м’эс’ац ы зорк’і], але: *Полацк і Віцебск* [полацк і в’іц’эпск], *не мог і марыць* [н’а мох

і марыц’]; у складаных словах: *бортінжынер* [бортынжын’эр], *спортінвентар* [спортынв’энтар].

Кропкі над літарай *ё* абавязковыя. Кропка над літарай *і* малой і літарай *I* вялікай у рукапісных тэкстах абавязковая.

## Правапіс галосных *о, э, а*

1. Літара *о* пішацца толькі пад націскам: *мора*, *кіно*, *опера*, *Орша*, *Токіа*.

2. Літара э пішацца:

а) у пачатку выклічнікаў *э*, *эге*, *э-ге-ге*, *эх*, *эй*;

б) пасля прыстаўной літары ***г*** у слове *гэты* і вытворных ад яго (*дагэтуль*, *гэтулькі*), а таксама ў выклічніках *гэй*, *гэ*;

в) пасля зацвярдзелых, [д] і [т]: *жэрдка*, *чэрствы*, *тэатр*, *ветэран*, *рэдактар*, *катэт*, *дэталь*, *цэлы*, *ацэнка*, *шэлест*, *Жэнева*, *Цэйлон*; (у запазычаных словах напісанне э і *а* не пад націскам пасля іншых зычных рэгулюецца слоўнікам: *панэль*, *тунэль,* але: *шынель*, *сектанцкі*; *Зэльва*, але: *Зеўс* і да т. п.);

г) пад націскам і не пад націскам у пачатку некаторых (пераважна запазычаных) слоў: *эра*, *эпас*, *эўрыка*, *экватар*, *экзэмпляр*, *Эстонія*, *Эфіопія*;

д) на канцы запазычаных нязменных слоў, а таксама ўласных імён, геаграфічных назваў пасля зычных, акрамя *л*, *к*: *купэ*, *кафэ*, *галіфэ*, *кашнэ*, *каратэ*, *Хасэ*, *Душанбэ* (але: *філе*, *сальта-мартале*, *піке*, *камюніке*);

3. Галосныя [о], [э] ў ненаціскным становішчы чаргуюцца з [а], што і перадаецца на пісьме: *вострыв — вастрыць*, *возера — азёрны*, *мова — маўленне*, *цэгла — цагляны*, *жэмчуг — жамчужына*, *майстэрня — майстар*.

Літара *а* пішацца не пад націскам незалежна ад паходжання слова: *балота*, *холад*, *маразы*, *рамонт*, *адрас, літара*, *характар*, *сакрэт*, *Сакрат*, *Шаўчэнка*, *Чарнышэўскі*, *Чалюскін*, *адажыа*, *трыа*, *сальфеджыа*, *Ватэрлоа*.

4. У некаторых спрадвечна беларускіх словах са складамі *ро*, *ло* замест *о* не пад націскам пішацца літара *ы*: *бровы — брыво*, *глотка — глытаць*, *дровы — дрывотня*, *крой — крывавы*, а таксама ў словах *яблык*, *яблыня*, *яблычны*.

У адпаведнасці з беларускім літаратурным вымаўленнем літара *ы* пішацца ў некаторых запазычаных словах: *брызент*, *дрызіна*, *інжынер*, *почырк*, *канцылярыя*, *рысора*, *цырымонія*, *трывога*, а ў некаторых словах пішацца літара *і*: *бліскавіца*, *блішчаць*, *бліскаўка*, але: *бляск*, *бляшанка*.

5. Канцавыя ненаціскныя -*эль*, -*эр* у запазычаных словах перадаюцца як -*аль*, -*ар*: *шніцаль, лідар*, *камп'ютар*, *карцар*, *світар*, *менеджар*, *пэйджар*, *ордар*, *кратар*, але ва ўласных імёнах неславянскага паходжання захоўваюцца -*эль*, -*эр*: *Ландэр*, *Юпітэр*, *Одэр*, *Пітэр*.

### Мова і нацыянальная культура

**6.** Прачытайце тэкст. Выпішыце з яго словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс галосных *о*, *э*, *а*», падкрэсліце арфаграмы.

Агінскія — старадаўні *магнацкі* род, што вёў сваю радаслоўную ад князя Рурыка, якога славяне некалі запрасілі да сябе княжыць. Многія прадстаўнікі роду Агінскіх займалі важныя дзяржаўныя пасады ў Вялікім *Княстве* Літоўскім. Галоўны маёнтак Агінскіх знаходзіўся ў горадзе Слоніме. Тут яны стварылі оперны тэатр, які стаў пасля асновай для польскай оперы.

Адзін з Агінскіх – Міхал Клеафас – быў вядомым кампазітарам. Ён доўгі час пражыў у Венецыі і Парыжы. Але душа яго імкнулася да родных *мясцін*. Ён напісаў славуты паланэз «*Развітанне* з Радзімай». Паланэз увайшоў у скарбніцу сусветна вядомых музычных твораў.

*(Паводле У. Бутрамеева)*

Назавіце арфаграмы ў выдзеленых словах.

• Растлумачце розніцу ў лексічных значэннях слоў *скарбніца* і *скарбонка*.

**7.** Спішыце словы, устаўляючы прапушчаныя літары *о*, *э*, *а* ці *ы*.

Зак..ранелы, с..кратар, ш..рсцяны, ст..млены, пагр..за, тры.., ж..леза, пч..ляр, р..пертаж, М..л..дзечна, ч..рга, кр..вавы, п..ндзаль, р..монт, шч..дры, кат..т, ш..рань, ш..снаццаць, бесц..р..монны, ст..лаж, ш..дэўр, бухгалт..р, чар..ўнік, д..када, угн..енне, т..хнічны, др..вотня, ч..рствы, сч..рсцвелы, ш..равокі, пагр..жаць.

î Назвы роднага краю

**ЗЭЛЬВА, ЗАЛЬВЯНКА**

Назву гарадскі пасёлак *Зэльва* атрымаў ад ракі *Зэльвеі*, якая паступова ператварылася ў *Зальвянку*. У аснове назвы слова *залева* — месца паводак у веснавую і летнюю пару, калі вада залівала вялікія прасторы.

(*Паводле У. Юрэвіча*)



**8.** Змяніце словы або падбярыце да іх аднакаранёвыя, каб націскныя [о], [э] сталі не пад націскам. Запішыце словы парамі, растлумачце правапіс *о*, *э*, *а*.

Восем, мова, чароды, Зэльва, поўнач, рэформа, голле, грэчка, поспех, шоўк, шэсць, жоўты, футбол, неадчэпны, зрэзаць, просьба, чэрпаць, грошы.

**9.** Спішыце сказы, устаўляючы замест кропак літары *о*, *э*, *а* ці *ы*. Растлумачце іх правапіс.

1. Чаму м..гла навучыць кніга, якой был.. сто год і адзіны экз..мпляр якой так і астаўся з неразр..занымі стар..нкамі? (*У. Караткевіч*). 2. У вагоне пасажыраў был.. мал.. . Пападаліся нават зусім пустыя куп.. (*Я. Колас*). 3. Хлопцы

хоць і храбрыліся, хоць і жартавалі, але кожны адчуваў, як унутры нешта др..жыць (*Я. Маўр*). 4. Аўтарам р..цэнзіі была супрац..ўніца р..дакцыі, да якой Рагойша ставіўся не надта прыязна (*І. Шамякін*). 5. Мне далі дазвол паехаць разам з практыкантамі на кат..ры (*В. Вольскі*). 6. Нав..дзячы парадак, г..радскія ўлады не ц..р..моніліся з парушальнікамі (*У. Арлоў*). 7. Першым прыкульгаў у канц..лярыю рахункавод Васіль Забела (*А. Васілевіч*). 8. Спачатку Вера Міканораўна нават і бр..вом не павяла (*Г. Шыловіч*).

📖 Правільнасць маўлення

**ОРД<u>ЭН</u> – ОРД<u>АР</u>**

**Ордэн**[1] — асобы знак узнагароды за выдатныя заслугі: *ордэн Маці.*

**Ордэн**[2] — арганізацыя, таварыства з пэўным статутам: *ордэн езуітаў.*

**Ордар**[1] — пісьмовае распараджэнне; дакумент на атрыманне, выдачу чаго-небудзь: *ордар на кватэру.*

**Ордар**[2] — разнавіднасць спалучэння, парадак размяшчэння частак архітэктурных канструкцый: *грэчаскі ордар.*



**10.** Падбярыце беларускія адпаведнікі да слоў рускай мовы. Растлумачце правапіс *о*, *э* ў ненаціскных складах.

Репродукция, телефон, реклама, ордер, декрет, престиж, темперамент, оптика, характеристика, Женева, Череповец, Чернышевский, дефект, орден, прогресс, демографический, свитер, эстетика, адрес, гардероб, эпицентр.

**11.** Выпішыце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара *э*.

Т..рапеўт, гр..йпфрут, ч..р..паха, д..лікатэсны, бр..зент, адр..с, ст..лаж, уп..ўнены, выстр..л, д..талёвы, уц..лець, кар..спандэнт, пр..м’ера, ш..пялявы, стр..ляць, д..сантнік, ч..мадан, майст..р, канц..лярыя, ш..ры, ш..раваты, ш..сцёра.

**12.** Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары, растлумачце іх правапіс.

НЯПРОШАНЫ ГРЫБНІК

Часам сярод лесу трапляюцца лапікі др..бненькага, нібыта прасеянага праз сіта, сівавата-белага пяску. Звычайна гэта невысокія паг..рачкі. На іх нічога не р..сце, акрамя невысокіх, ч..злых хв..ек.

Вак..л такой п..лянкі вельмі грыбны лес. Р..стуць аранж..выя пад..сінавікі, т..нканогія ш..рыя бабкі, зялёныя і чырв..ныя сыраежкі, з..лаціста-ж..ўтыя лісічкі, зялёна-дымчатыя м..хавікі, а ў верасе з ч..рнічнікам сядзяць пузатыя, з цёмнакарычневымі шапкамі цары грыбоў — б..равікі.

Але аднойчы я прыйш..ў на п..ляну, а яна ўся перарыта. Дзік то ў адным, то ў другім месцы выбіраў якраз тыя кут..чкі, дзе густа р..слі б..равікі і пад..сінавікі. У хв..йніку, дзе пад м..хам р..стуць лісічкі, ён так перавярнуў мох і ігліцу, што не пакінуў жывой лапіны.

Усё лета дзік н..чамі «араў» лес, знішчаў найлепшыя кут..чкі грыб..вішчаў, а я нічога не мог зр..біць.

П..ляна страціла ўтульнасць і св..еасаблівасць.

(*Паводле З. Бяспалага*)

### Тэст 1 для самаправеркі

**А1.** Адзначце словы, у якіх прапушчана літара *а*:

1) кр..мяны
2) крат..р
3) пр..снак
4) пр..снаводны
5) гард..роб

**А2.** Адзначце словы, у якіх прапушчана літара *э*:

1) сакр..тар
2) ц..нтральны
3) шч..бятаць
4) р..прадукцыя
5) р..дкалессе

**А3.** Адзначце словы, у якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1) сальфеджыа 3) чорствы 5) дрэсіроўшчык
2) інсцэніроўка 4) дрэвасек

**А4.** Адзначце ўласныя назоўнікі, пры перакладзе якіх з рускай мовы на беларускую ў першым складзе пішацца літара *а*:

1) Р*е*марк 3) Щ*е*рбак 5) Ш*е*вчук
2) Ш*е*кспир 4) Ч*е*рнов

**В1.** Перакладзіце з рускай мовы на беларускую слова *адресат.*

## Правапіс галосных *е, ё, я*

1. У беларускай мове літара *ё* пішацца толькі пад націскам: *лёгкі*, *сёлета, вёсны, сёстры, вёска, цвёрда.*

2. У першым складзе перад націскам замест *е*, *ё* пішацца літара *я*: *вёска — вясковы*, *лёгкі — лягчэйшы*, *лес — ляснік*, *мёд — мядовы*, *цвёрды — цвярдзейшы*, *дзевяць — дзявяты*, *дзесяць — дзясяты*, *сем — сямнаццаць*, *восем — васямнаццаць*.

У іншых ненаціскных складах *е* захоўваецца: *восень*, *легкадумнасць*, *леснічоўка*, *цвердаваты*, *дзесятковы*, *дзевятнаццаты*, *верацяно*, *цемень*.

3. У запазычаных словах у першым складзе перад націскам пішацца літара *е*: *секунда*, *легенда*, *семестр*, *генерал*, *педаль*, *метро*, *герой*, *кераміка*, *мелодыя*, *балерына*, *перспектыва*, *Везувій*, *Версаль*, *Бетховен*, *Палесціна.*

Літара *е* пішацца ў пачатку некаторых запазычаных слоў: *егер*, *ерэтык*, *Еўропа*, *Ерэван*, *Еўпаторыя*, *Еўфрат*, а таксама на канцы запазычаных слоў пасля мяккага знака і апострафа: *дасье, кальe, канферансье, кінаатэлье, круп'е, куцюр'е.*

4. Часціца *не* і прыназоўнік *без* заўсёды пішуцца з літарай *е*: *не браў*, *не думаў*, *без кніг*, *не без смеху*.

Пры напісанні разам *не* і *без* падпарадкоўваюцца агульнаму правілу напісання *е*, *я*: *няхай*, *бязвусы*, *бясконцы*, але: *немаладны*, *безбароды*, *бескарысна*.

5. Каранёвая этымалагічная літара *я* захоўваецца на пісьме незалежна ад націску ў словах *вязаць*, *сувязь*, *лямантаваць*, *пяцярня*, *завязь*, *цяжкаваты*, *мяккаваты*, *святкаваць*, *яскравы*, *тысяча*, *пояс*, *месяц*, *памяць*, *дзевяць*, *дзесяць*, *дробязь*, *заяц*, *Прыпяць*, *Бесядзь*.

Літара *я* пішацца ў паслянаціскных складах у некаторых суфіксах назоўнікаў (*роўнядзь*, *боязь*, *дробязь*) і дзеясловаў (*лаяць*, *веяць*, *сеяць*, *кашляць*, *баяць*, *муляць*), а таксама ў аддзеясловных назоўніках (*лаянка*, *веялка*, *сеялка*).

📖 Правільнасць маўлення

**РАДЫЁ- – РАДЫЕ- (РАДЫЯ-)**

**Радыё-** – першая частка складаных слоў у значэнні ‘які мае адносіны да радыё’: *радыёвузел*, *радыётэхніка*, *радыёсувязь*, *радыёстанцыя*.

**Радые-** – першая частка складаных слоў у значэнні ‘які адносіцца да радыю, радыяцыі’: *радыеізатопы*, *радыеактыўнасць*, *радыетэрапія*. У першым складзе перад націскам у гэтым выпадку пішацца *я*: *радыялогія*, *радыяхімія*, *радыяграфія*.



**13.** Прачытайце ўрывак з рамана У. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім». Выпішыце словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс галосных *е*, *ё*, *я*».

Бацьку споўнілася толькі сорак восем, і яшчэ два гады назад яму давалі дзясяткам менш. Ён любіў жартаваць, быў

здатны на самыя нечаканыя выбрыкі. Аднойчы ён зрабіў так, што адзіны заяц, забіты на паляванні вядомым хвальком і хлусам Вірскім, трымаў у лапках запіску з надпісам: «За што?!»

У наваколлі Копыся вадзіліся надзвычай рэдкія чорныя зайцы. І бацька ў змове з кушняром запэўніў Сымона, што бываюць зайцы паласатыя. У доказ гэтага паказаў шкурку і сказаў, што за другі экзэмпляр не пашкадуе і тысячы рублёў. Сымон цэлы год днямі і начамі цягаўся па вапняковых пустках і, вядома ж, нічога не забіў. Затое вылечыўся ад сухотаў.

(*Паводле У. Караткевіча*)

**14.** Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары.

1. Часамі на дз..вочых грудзях пазвоньвалі кал..ровыя нізкі пац..рак (*Э. Ажэшка*). 2. Праз н..калькі хвілін мы пайшлі ў той дз..вяты вагон (*У. Дубоўка*). 3. Ложкі ў хаце ставяць каля глухой сц..ны, далей ад вокнаў і дзв..рэй, каб ц..плей было спаць дажджлівай вос..нню і марознай зімою (*М. Маляўка*). 4. Дз..сяткі відаў дрэў растуць у нашых л..сах, а вось толькі адно з іх заслужыла права, каб яго ім..м назвалі адзін з л..тніх мес..цаў (*Х. Гурыновіч*). 5. Асц..рожны да кожнага слова, як мой дзед — да з..рнят пры с..ўбе (*А. Каско*). 6. Ц..гнік дыхаў парай на нізкае сонца, і яно, трапляючы ў сівыя клубы, м..няла кол..р (*У. Караткевіч*). 7. Мароз, як л..дз..ны волат, злосны і сумны, блукаў па в..сцы (*Э. Ажэшка*). 8. На стромкім б..разе Дзвіны, пас..род скв..ра, у зас..ні шматгадовых дрэў, — высокі аб..ліск з чырвонага граніту (*В. Вольскі*).

**15.** Выпішыце ў алфавітным парадку словы, у якіх *е* захоўваецца ў першым пераднаціскным складзе.

Дзевяціпавярховы, веранда, імперыялізм, гектар, механізм, восень, секунда, Германія, верашчака, апельсін, зелень, епіскап, дзеяч, метро, інвентар, недахоп.

î Назвы роднага краю

**БЕСЯДЗЬ, ПРЫПЯЦЬ**

*Бесядзь* — прыток Сожа — Дняпра. Згодна з народнымі ўяўленнямі, назва ракі паходзіць ад слова *беседа* (гутарка) і характарызуе гаваркое, з перакатамі, цячэнне. А яшчэ на паваротах ракі, на ўзвышшах ставілі некалі альтанкі (рус. *беседки*) для адпачынку.



*Прыпяць* — прыток Дняпра. Назва ракі паходзіць ад старaславянскага *припечь* — так называлі пясчаны бераг, дзе большую частку дня прыпякае сонца.

(*Паводле У. Юрэвіча*)

**16.** Спішыце, устаўляючы літары *е*, *ё* ці *я*.

Б..склапотны, ф..льетон, сп..вак, с..мнаццаты, н..здарма, б..дняк, б..дната, б..даваць, зан..дбаць, Б..лінскі, в..слярны, пац..мнелы, дэл..гацыя, п..рсцёнак, насм..шыць, запав..дзь, Н..красаў, з..лкі, м..сці, кал..ндар, п..рсп..ктыва, выгл..д, накле..ны, б..з хлеба, зн..важлівы, Г..надзь, с..местр, сув..зь, пасе..ны, н.. пам..таю, ц..гнуцца, сц..рагчы, марм..лад, н..ўгамонны, н..ўстойлівы, эф..ктыўны, дал..чынь, зв..чарэць, надв..чорак, б..змерны, г..рбарый, юв..лірны, страл..ніна, б..нзін.

**17.** Змяніце словы або падбярыце аднакаранёвыя, каб галосныя *е* і *ё* сталі не пад націскам. Запішыце словы парамі, растлумачце напісанне.

Цёмны, дзверы, адвесці, зерне, дзед, сцежка, лён, бегчы, светлы, снег, плесці, мерзнуць, землі, вечар, веліч, несці, плечы, аддзел, лёд, далёка, дзеці.

**18.** Выпішыце словы, у якіх пішацца літара *я*.

Сц..блінка, л..снічоўка, б..злюдны, з..фір, дроб..зь, ц..жкавата, п..рыметр, пам..ць, дз..сятка, Б..тховен, Свіц..зь, св..ткавацъ, св..тлячок, зм..стоўны, дыл..тант, мес..ц, сн..гавік, сённ..шні, догл..д, по..зд, н..чаканы, н..цотны, габ..лен, п..сняр.

**19.** Выпішыце словы, у якіх пішацца літара *е*.

Дз..ржаўны, Тэг..ран, Х..рсон, в..рацяно, заз..лянець, дз..сятка, рэз..да, нап..рэдадні, ма..тнік, св..ткавацъ, выс..яць, сан..т, п..хота, ц..цярук, с..рыял, ц..гавіты, кал..кцыянер, п..чора, поп..л, ман..кен, вогнетушыц..ль, імп..ратар.

**20.** Падбярыце да слоў рускай мовы беларускія адпаведнікі, запішыце, растлумачце правапіс *е*, *ё* і *я*.

Зефир, оперный, полевой, сентябрь, лесник, операция, спектакль, песенка, веранда, легендарный, Несвиж, веселый, гербарий, ветер, смесь, герой, сержант, опекун, светловатый, зенит, перрон, Смолевичи, Валентин, Сергей, европейский, восемьсот, Енисей, Нева, Припять, несете, ведете, сенсация, Швейцария, обелиск, весенний, телефон, дежурный, Печора, Вьетнам, ячейка.

**21.** Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары *е*, *ё*, *я* ці *і*.

Настрой з..млі, лесу залежыць ад кол..ру. Летам лес быў з..лёны, вос..нню залацістымі барвамі св..ціліся б..розы, асіны, кл..ны, ружова-сінім полым..м цв..лі в..расы. Усё гэта кол..ры жыцця. Але і ў зімнім лесе яны не згаслі канчаткова: з..л..нее хвоя, с..нечай адл..вае снег, сінія паўтоны пануюць у наваколлі. С..гналы н..далёкай в..сны.

(*І. Навуменка*)

**22.** Прачытайце тэкст. Чаму вячоркі маюць другую назву — попрадкі? Спішыце тэкст, рашаючы арфаграфічныя задачы.

### В..ЧОРКІ

В..чоркі, або попрадкі, — даўні звычай в..сковых дз..ўчат (з / с)бірацца з работаю ў чыёй(?)небудзь ха(т / ц)е. Адны прых..дзілі з прасніцаю — др..ўлянаю прыладай для прадзен..я, хто з воўнаю, хто з кудзеляю. І пралі: ц..гнучы нітку, спрытна накруч(?)валі яе на в..рацяно. Другія прын..сілі з сабой клубочкі кал..ровых нітак, каб вышыць кашулю, ручнік або хус(т / ц)інку. (З / с)пачатку працавалі моўчкі, (з / с)рэдку перакід(?)ваючыся слоўцам. Потым хто(?)небудзь (т / ц)іха зап..ваў:

Ападае лісточ..к
На жоўты п..сочак.

Пес(?)ню па(д / т)хоплівалі астатнія дз..ўчаты:

Ападае лісточ..к
Дз..вачцы на в..ночак...

(*Паводле М. Маляўкі*)

Падкрэсліце словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс галосных *е*, *ё*, *я*».

Самадыктант

**23.** Спішыце тэкст, афармляючы яго ў адпаведнасці з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі.

### РУСАЛЬНЫ ТЫДЗЕНЬ

Пры..шоў (Р / р)усальны тыдз..нь.

Азярышчанскія дз..ўчаты зв..валі в..нкі і вешалі іх на б..розах. А хлопцы н..слі на з..лёных н..сілках у б..розавы гай абраную ўсімі (Р / р)усалку самую ладную дз..ўчынку якая

зна..шлася ў Азярышчы. Гэта была трына..цаці(?)гадовая Янька Кагут.

З ра(з / с)пушчанымі в..ласамі яна пагойд(?)валася ў сінім небе. І с(?)вежы п..шчотны тварык дз..ўчыны ўсм..хаўся со(?)нцу нівам і з..лёным гаям. А за ёю ішла ў в..нках яе прыгожая світа.

...Палілі агні. Кідалі ў іх в..нкі. Дз..ўчаты ўц..калі ад Янькі а яна лавіла іх і казытала.

(*Паводле У. Караткевіча*)

Выканайце самаправерку (*гл. с. 173*).

• Калі ў народзе адзначаецца Русальны тыдзень?

## Тэст 2 для самаправеркі

**А1.** Адзначце словы, у якіх прапушчана літара *е*:

1) м..рзлата
2) бусл..ня
3) б..сконцы
4) г..ктар
5) см..танковы

**А2.** Адзначце словы, у якіх прапушчана літара *я*:

1) зв..рабой
2) ск..птычны
3) н..значны
4) Свіц..зь
5) погл..д

**А3.** Адзначце словы, у якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1) пецярня
2) селядзец
3) лялячны
4) зазялянелы
5) першацвет

**А4.** Адзначце словы, пры перакладзе якіх з рускай мовы на беларускую адбываецца пераход *е* ў *я*:

1) *Е*вропа
2) с*е*нсация
3) з*е*мляк
4) п*е*рсона
5) кал*е*ндарь

**В1.** Запішыце слова, якое мае лексічнае значэнне ‘дзіцяня мядзведзя’.

## Правапіс галосных *о, э, а, е, ё, я* ў складаных словах

1. У складаных словах можа быць адзін асноўны і адзін або некалькі пабочных націскаў. Калі ў другой частцы складанага слова націск падае на першы склад, то ў першай частцы замест *о* пішацца *а*: *дабрадзей*, *вастразубы*, *чарнавокі*, *вадазбор*, *раўнапраўе*; калі ў другой частцы націск падае не на першы склад, то ў першай частцы захоўваецца *о*: *добразычлíвы*, *востраканцóвы*, *чорнавалóсы*, *водазабеспячэ́нне*, *роўназале́жны*.

2. Літара *о* захоўваецца ў складаных словах, першая частка якіх — *слова-*, *што-*, *фота-*, *мота-*: *словазлучэнне*, *словаформа*; *штогод*, *штодзень*; *фотаздымак*, *фоталабараторыя* (але: *фатаграфія* і вытворныя ад яго); *мотаспорт*, *мотагонкі* (але: *матацыкл*, *матавоз* і вытворныя ад іх), а таксама ў іншых словах, асабліва навуковых тэрмінах, у якіх выразна праяўляецца пабочны націск, хоць асноўны націск падае на першы склад другой часткі: *азотнакíслы*, *збожжасхóвішча*, *мовазнáўства*, *фондасхóвішча*, *работадáўца*, *маторазбóрка*, *вокамгне́нна*, *усходазнáўства*.

3. Літара *о* пішацца ў першай частцы складаных слоў, калі другая частка пачынаецца з *ў* (*у* нескладовага): *марозаўстойлівасць*, *збожжаўборачны*, *торфаўтварэнне*, *вогнеўстойлівы*.

4. Гук [э] ў першай частцы складаных слоў захоўваецца і абазначаецца літарай *э*: *мэтанакіраваны*, *мэтазгодна*, *рэдказубы*, *шэравокі*, *арэхападобны*, *крэдытаздольнасць*, *тэлебачанне*, *шэсцьсот*.

5. У складаных словах, утвораных ад лічэбніка ў спалучэнні з назоўнікам, першая частка (лічэбнік) ставіцца ў форме роднага склону: *тры дні — трохдзённы, чатыры паверхі — чатырохпавярховы, пяць тыдняў — пяцітыднёвы, сто метраў — стаметровы*; *сямікласнік, васьмігадовы, дзевяцігірадусны, саракагоддзе*.

6. У першай частцы складанага слова літара *е* захоўваецца незалежна ад таго, на які склад падае націск у другой частцы: *сенакасілка*, *беласнежны*, *землетрасенне*, *светаўспрыманне*, *свежамарожаны*.

Калі першай часткай з’яўляецца аснова *велік-/вялік-*, то напісанне літары *е* або *я* залежыць ад таго, які склад у другой частцы націскны: калі першы, то пішацца *е*, калі другі — пішацца *я*: *велікаро́слы*, *велікакня́жацкі*, *велікасве́цкі* (але: *Вялі́кдзень*); *Вялікабрыта́нія*, *вялікадзяржа́ўны*, *вялікагало́вы*.

7. У першай частцы складанага слова літара *ё* захоўваецца пры націску не на першым складзе другой часткі і замяняецца на *е*, калі націск падае на першы склад другой часткі: *лёгкаатлетычны*, *легкаверны*; *лёдадрабільны*, *ледарэз*; *мёдаварэнне*, *меданосны*.

8. У складаных словах злучальныя галосныя *о*, *ё* пішуцца толькі пад націскам, *а* — у ненаціскным становішчы: *ільновалакно*, *бібліёграф*, *ільнаводства*, *прыборабудаўнічы*, *марозатрывалы*.

Злучальная галосная *е* ў складаных словах пераходзіць у *я*, калі націск падае на першы склад другой часткі: *зернесушы́лка*, *зернясkла́д*; *землекарыста́нне*, *земляро́бчы*; *жыццеапіса́нне*, *жыццяра́дасны*.

Злучальная галосная *е* ў складаных словах захоўваецца, калі другая частка пачынаецца з *ў* (*у* нескладовага): *вогнеўстойлівы*, *зернеўборка*.

9. Складанаскарочаныя словы пры напісанні звычайна разглядаюцца як простыя словы з адным націскам: *зямфонд*, *лясгас*.

10. Калі складаныя словы маюць у сваім саставе больш за дзве часткі, то кожная частка пішацца як асобна ўзятае слова: *паравозавагонарамонтны*, *авіяматорабудаванне*, *аэрафотапрыбор*.

**24.** Прачытайце тэкст. Выпішыце з яго словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс галосных у складаных словах», падкрэсліце арфаграмы.

У старадаўнія часы людзі абточвалі *камяні* і *высякалі* з іх бажкоў. *Археолагі* называюць іх *каменнымі* бабамі, ідаламі. У Брэсцкім краязнаўчым музеі захоўваюцца каменныя бабы з вёсак Грабаўцы і Залуззе Жабінкаўскага раёна. Гэтыя ідалы адносяцца да *язычніцкіх* часоў, калі нашы продкі верылі ў мнагабожжа. На ідалах можна заўважыць крыжыкі. Яны з'явіліся, калі ў наш край прыйшло хрысціянства.

(*Паводле А. Бензерука*)

Назавіце арфаграмы ў выдзеленых словах.

**25.** Выберыце правільны варыянт, запішыце яго.

Вольналюбівы — вальналюбівы, чарнаморскі — чорнаморскі, вадасховішча — водасховішча, вастрасюжэтны — вострасюжэтны, даўгажыхар — доўгажыхар, фотаўспышка — фатаўспышка, велікапосны — вялікапосны, танкаскуры — тонкаскуры, дробназярністы — драбназярністы, поўнаметражны — паўнаметражны, словатворчасць — славатворчасць, кароткачасовы — караткачасовы.

**26.** Спішыце сказы, рашаючы арфаграфічныя задачы. Растлумачце правапіс галосных у складаных словах.

1. У раёне Канарскіх астравоў да с..рабрыстых чаек, нашых верных спадарожнікаў, далучылася нейкая ц..мнакрылая птушка і таксама л..ціць за ц..плаходам (*В. Вольскі*). 2. Сам не ведаю, як яна зах..валася, гэта ф..такартка (*А. Васілевіч*). 3. Дрыгавічы займалі ўрадлівыя землі на Палессі, што дазв..ляла ім пасп..хова займацца з..мл..робствам і жыв..лагадоўляй (*У. Арлоў*). 4. З г..дамі былое панскае селішча

запусцела, зар..сло др..бналессем (*Б. Сачанка*). 5. Тут ёсць яшчэ адна н..бачная м..жа — в..дападзел басейнаў рэк (*А. Бензярук*). 6. Выразна ц..мнела над м..стэчкам высокая в..дакачка (*В. Адамчык*). 7. Яна бачыла ўсмешкі, р..зныя па св..іх а..ценнях, ад зл..радных да спачувальных (*І. Шамякін*). 8. Над шыфернымі дахамі кароўнікаў узнімаецца в..данапорная вежа (*В. Вольскі*).

**27.** Рашыце словаўтваральныя «прыклады».

Узор: *вайна* + *прасці* = прыметнік *вайнапрадзільны*.

*добры* + *душа* = прыметнік
*добры* + *сумленне* = прыметнік
*востры* + *ліст* = прыметнік
*востры* + *вугал* = прыметнік
*сямнаццаць* + *тон* = прыметнік
*тонкі* + *нос* = прыметнік
*тонкі* + *голас* = прыметнік

*вада* + *ачыстка* = назоўнік
*вада* + *сховішча* = назоўнік
*агонь* + *тушыць* = назоўнік
*радыё* + *перадача* = назоўнік
*радыяцыя* + *экалогія* = назоўнік
*зерне* + *сушыць* = назоўнік
*шоўк* + *прасці* = назоўнік

**28.** Спішыце сказы, утвараючы ад словазлучэнняў, што ў дужках, складаныя прыметнікі і дапасоўваючы іх да назоўнікаў. Вусна растлумачце правапіс складаных слоў.

Узор: З-за павароту ракі паказаліся лёгкія (востры нос) байдаркі (*Р. Ігнаценка*). — З-за павароту ракі паказаліся лёгкія вастраносыя байдаркі.

1. Пад аховай (шырокія лапы) елак расклалі яны вогнішча і доўга палілі, пакуль не набралася поўная яма жару (*Я. Маўр*). 2. (Жоўты ліст) ліпа, як ліхтар, гарыць перад маім акном (*В. Вітка*). 3. Тысячы (розныя галасы) птушак напоўнілі паветра свістам, шчэбетам і спевамі (*Я. Колас*). 4. У сакавіку 1946 года тут загінуў (шэсць гадоў) дзік (*В. Вольскі*). 5. Рослы, светлы, (чорныя бровы) люд, неспакойны,

малады, смяяўся сінімі вачыма, гарэў вясёлым макам шчок (*М. Калачынскі*). 6. Петрусю накуплялі сшыткаў і кніжак, тата купіў яму вялікі карабок (розныя колеры) алоўкаў, а неўзабаве прынёс і партфель (*Л. Арабей*). 7. На мяккіх купінах там-сям яшчэ можна было заўважыць сакаўныя (чырвоны бок) журавіны (*Р. Ігнаценка*). 8. З (два кіламетры) глыбіні магутным фантанам вырвалася на паверхню (доўга чакаць) беларуская нафта (*В. Вольскі*).

**29.** Утварыце і запішыце складаныя словы. Растлумачце правапіс галосных.

| 1-я частка | 2-я частка |
|---|---|
| жыцце... <br> жыцця... | ...любівы, ...устойлівы, ...радасны, ...люб, ...дзейнасць |
| добра... <br> дабра... | ...суседскі, ...душна, ...вольны, ...якасны, ...сумленна |
| мота... <br> мата... | ...сані, ...турызм, ...воз, ...дывізія, ...ралі |
| ільно... <br> ільна... | ...сеялка, ...сушылка, ...уборка, ...водства, ...камбайн |
| поўна... <br> паўна... | ...водны, ...галоссе, ...метражны, ...праўны, ...цэнны |

**30.** Адзначце радкі, у якіх усе словы напісаны правільна.

1) шырокаплечы, мотагонкі, чырвонагаловік, раўнавугольны;

2) разнаквецце, фотахроніка, шоўкапрадзільны, раўнапраўны;

3) шаўкаводства, заканамерны, танкасценны, рознаўзроставы;

4) законапраект, шклазавод, фатаграфія, тоўстаскуры;

5) шырокаэкранны, шклорэз, чырвонашчокі, формаўтваральны;

Запішыце словы, у якіх дапушчаны памылкі, згодна з арфаграфічнымі нормамі. Растлумачце правапіс галосных.

î Назвы роднага краю

**НОВАЛУКОМЛЬ, НАВАЕЛЬНЯ**

Назва горада *Новалукомль* з’явілася падчас будаўніцтва электрастанцыі на беразе возера *Лукомскае*. А назва возера ўтворана ад старажытнарускага слова *лукомля* — узбярэжжа на выгіне воднай паверхні, на луцэ.



Назва гарадскога пасёлка *Наваельня* ў Дзятлаўскім раёне ўтворана з двух слоў — *новая* і *Ельня* — як адзнака прыродных умоў, ельнікаў вакол.

(*Паводле У. Юрэвіча*)

Мова і нацыянальная культура

**31.** Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары.

Многія назвы дрэў — гэта адн..часова і св..еасаблівыя сімвалы, якія све..чаць пра пэўныя чалавечыя якас(?)ці. Так, дуб сімвалізуе дужага чалавека, асілка; явар — хлопца, закаханага н..рэдка ў каліну(?)красуню; б..роза — прыгожую дзяўчыну або маладую жанчыну.

В..рба ўвасабляе жыцц..здольнасць, пладавітасць: яна расце нават у н..спрыяльных для іншых раслін умовах.

Адно з народных свят мае назву (В / в)ербная (Н / н)..дзеля. У гэты в..сновы дзень, за тыдзень да (В / в)..лікадня, галінкі в..рбы, поўныя жыв..творнай сілы, выкарыстоўваліся як магічны сродак. Людзі верылі, што датыканне в..рбой да чалавека перадае яму ўласцівас(?)ці расліны. Таму шырока ра..паўсюджаным звыча..м (В / в)ербнай (Н / н)..дзелі было спецы..льнае, рытуальнае «біццё», пасцёб(?)ванне

в..рбой родных і знаёмых з а(д / т)паведным прыгаворам: «Не я б..ю — в..рба б..е. За тыдзень (В / в)..лікдзень».

(*Паводле У. Коваля*)

Растлумачце правапіс галосных у складаных словах.

• Дапоўніце ўстойлівыя параўнанні словамі – назвамі дрэў: *дрыжыць як* ...; *гарыць чырванню як* ...; *абдзерці як* ...; *здаравенны як* ...; *нахілілася як* ... .

## Тэст 3 для самаправеркі

**А1.** Адзначце словы, у якіх прапушчана літара *о*:

1) р..знапланавы
2) р..знаскланяльны
3) сл..ваформа
4) кар..ткахвосты
5) ільн..водства

**А2.** Адзначце словы, у якіх прапушчана літара *я*:

1) в..лікадзяржаўны
2) в..лікагрузны
3) пал..водства
4) насенн..сушылка
5) жыцц..ўстойлівы

**А3.** Адзначце словы, у якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1) мавазнаўца
2) палітэхнічны
3) скараспелы
4) фатаконкурс
5) земляробчы

**А4.** Адзначце словы, пры перакладзе якіх на беларускую мову адбываецца пераход выдзеленай літары *е* ў *я*:

1) В*е*ликобритания
2) кон*е*завод
3) треть*е*классник
4) огн*е*тушитель
5) мед*е*плавильный

**В1.** Запішыце складаны прыметнік, утвораны ад словазлучэння *высокая якасць*.

## Правапіс спалучэнняў галосных *іё* (*ыё*), *ія* (*ыя*), *іе* (*ые*), *іо* (*іа*), *ео* (*еа*), *эо* (*эа*) у іншамоўных словах

У беларускай мове спалучэнні галосных літар ужываюцца звычайна ў словах іншамоўнага паходжання. Таму іх напісанне лепш засвойваецца ў параўнанні, напрыклад, з рускай мовай.

Так, рускаму спалучэнню *ио* ў беларускай мове адпавядае:

у пачатку слоў пад націскам спалучэнне *іо*: *Іосіф, іон*, а не пад націскам — *іа*: *Іарданія, іанізацыя*;

у сярэдзіне слоў пад націскам *іё* (*ыё*): *аксіёма, біёграф, патрыёт, перыёдыка* (але: *Эфіопія, мільён, трыльён* і інш.), а не пад націскам *ія* (*ыя*): *біялогія, бібліятэка, нацыянальны, патрыятызм* (але: *радыё*);

на канцы слоў незалежна ад націску *іа* (*ыа*): *трыа, Антарыа, Токіа*.

Спалучэнне *иа* незалежна ад націску перадаецца як *ія* (*ыя*): *мемарыял, піяніст, дыялог, Іліяда*.

Спалучэнні *іе*, *еа*, *ео*, *оэ* перадаюцца амаль што нязменна. Спалучэнне *ие* перадаецца праз *іе* (*ые*): *абітурыент, пацыент, кліент*; *еа* праз *еа* (*эа*): *Неапаль, рэаліст* (але: *акіян*); *ео* праз *ео* (*эо*), *еа* (*эа*): *фразеолаг, фразеалогія, археолаг, археалогія, харэограф, харэаграфія;* оэ праз *аэ*: *арфаэпія, паэт*.

Пры перадачы спалучэнняў *йо*, *йе*, *йа* ў беларускай мове назіраецца сцяжэнне. Спалучэнне *йо* пад націскам перадаецца праз *ё*: *ёг, ёгурт, ёд, ёдзісты, маёр, Нью-Ёрк*, а не пад націскам — праз *я*: *маянэз*. Спалучэнне *йе* незалежна ад націску — праз *е*: *канвеер, Феербах, фае,* а спалучэнне *йа* — праз *я*: *Мая, папая* (назва плода).

**32.** Спішыце, устаўляючы прапушчаныя спалучэнні літар, растлумачце правапіс.

Панс..нат, п..нерскі, сац..логія, д..гназ, асац..цыя, шп..н, т..рэма, дывіз..н, б..графія, абрэв..цыя, аўд..нцыя, патэнц..льны, т..тральны, д..грама, б..ніка, абітур..нт, рац..н, акард..н, д..тэз, рэг..н, ід..льны, ав..шоу, канв..р, ф..лка, рад..станцыя, стац..нар, д..лог, р..льны, экватар..льны, рад..ла, в..ланчэль.

**33.** Запішыце словы па-беларуску, растлумачце правапіс спалучэнняў галосных.

Чемпион, клиент, бастион, патриот, специалист, реактив, неон, идеолог, диета, майонез, трио, биография, фейерверк, йод, грандиозный, район, радиоактивный, рацион, ион, официант, майор, гладиолус, Неаполь, фиолетовый, спартакиада, радиоузел, меридиан, проект, аттракцион.

**34.** Падбярыце да слоў аднакаранёвыя словы так, каб націскныя галосныя сталі не пад націскам, растлумачце правапіс.

У з о р: *географ — геаграфічны, геаграфія*.

Чэмпіён, геолаг, біёграф, метэор, тэорыя, кіёск, археолаг, рэгіён, патрыёт.

### ⏩ Арфаграфія і лексікалогія

**35.** Запішыце словы з левага слупка, раскрываючы дужкі. Укажыце лічбу, пад якой тлумачыцца лексічнае значэнне кожнага прыметніка ў правым слупку.

У з о р: *ід<u>эа</u>льны* (2).

| | |
|---|---|
| ід(эа, ыя)льны<br>ід(эа, ыя)лізаваны | 1) лепшы, чым у сапраўднасці, прыхарошаны;<br>2) узвышаны; вельмі добры, дасканалы; |

| | |
|---|---|
| р(эа, эя)лістычны<br>р(эа, эя)льны | 3) які зыходзіць з разумення і ўліку абставін, практычны;<br>4) які сапраўды існуе; магчымы для выканання; |
| рац(ыа, ыя)налістычны<br>рац(ыа, ыя)нальны | 5) разумны, мэтазгодны;<br>6) які абапіраецца толькі на патрабаванні логікі, розуму; |
| нац(ыа, ыя)нальны<br>нац(ыа, ыя)налістычны | 7) які мае адносіны да нацыі; уласцівы нацыі;<br>8) які мае адносіны да ідэалогіі і палітыкі, што прапаведуе выключнасць адной нацыі |

З дзвюма парамі слоў (на выбар) складзіце і запішыце сказы.

**36.** Выпішыце словы, у якіх спалучэнне галосных перадаецца на пісьме як *ія* (*ыя*).

Эмац..нальны, кл..нтура, афіц..нт, т..рэма, г..метрыя, кард..грама, патэнц..л, д..гназ, п..нер, мар..нетка, ак..н, д..ганаль, пер..дычна, стэр..эфект, б..дабаўкі, д..метр, ген..льны, бібл..тэка, хар..графія, чэмп..нат, д..пазон.

**37.** Запішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя спалучэнні літар, растлумачце іх правапіс.

1. Яна [Аня] назвала сваё імя, сказала, што працуе ў ваенным шпіталі бібл..тэкарам (*А. Васілевіч*). 2. Няма ў нас мора, не абмываюць Беларусь ак..нскія воды (*А. Карлюкевіч*). 3. Пацук смела перабег па д..ганалі залу (*У. Караткевіч*). 4. Праз многія стагоддзі арх..лагі будуць углядацца ў знакі на ганчарных донцах і гадаць, што яны азначаюць... (*С. Тарасаў*). 5. Дрыготкімі вуснамі і здушаным шэптам [Капроўскі] абазваў сябе ід..там, дурнем, вар'ятам (*Э. Ажэшка*). 6. Бацька, Адам Барукоў, седзячы на апошняй прыступ-

цы ганка, па ўласнай ініц..тыве выконваў судзейскія абавязкі (*А. Васілевіч*). 7. Тэксты ўпрыгожваліся маляванымі загалоўнымі літарамі (ініц..ламі) і каляровымі мін..цюрамі (*У. Арлоў*). 8. У Беларусі ацэнкай важнасці гарадскога паселішча, яго ролі ў развіцці рэг..на станавілася наданне гораду ці нават мястэчку герба (*А. Карлюкевіч*).

**38.** Спішыце тэкст, рашаючы арфаграфічныя задачы.

Шырокае прызнан..е ў (Е / е)ўропе атрымала навуковая дзейнас(?)ць прырода(?)знаўца і мед..ка Якуба Наркевіча-Ёдкі. Ён ств..рыў у св..ім маёнтку мет..ралагічную станцыю. Дасле..чык ра..працаваў спосабы вым..рэння патэнц..лу атмасфернай эл..ктрычнасці, вына..шаў прылады для бя..праваднага прыёму эл..ктрамагнітных сігналаў. А..крыўшы ў маёнтку санаторый, ён пасп..хова выкарыстоўваў там уласную м..тодыку д..гностыкі і л..чэння эл..ктрычнас(?)цю.

(*Паводле У. Арлова*)

Падкрэсліце словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс спалучэнняў галосных у іншамоўных словах».

## Пераклад тэксту

**39.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

### АСТЕРОИДЫ

Астероиды представляют собой небесные тела с каменистой поверхностью, вращающиеся вокруг Солнца. Диаметр самых крупных астероидов составляет более 250 км. Размеры самых маленьких астероидов не больше нескольких десятков сантиметров.

Куски астероидов, движущиеся к Земле, называют также «метеорными телами». Если метеорное тело не разрушается полностью в земной атмосфере, оно может упасть на Землю. В этом случае речь уже идет о метеорите.

Следы кратеров, наблюдаемые на нашей планете, свидетельствуют о том, что в далеком прошлом Земля пострадала от ударов небесных тел значительных размеров. Согласно одной из версий, из-за удара астероида диаметром примерно в 10 км (это было 65 миллионов лет назад) вымерли динозавры.

(*По Ж. Ранцини*)

С л о ў н і к:

вращаться — *круціцца*
крупный — *буйны*
разрушаться — *разбурацца*
пострадать — *пацярпець*

Падкрэсліце словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс спалучэнняў галосных у іншамоўных словах».

## Тэст 4 для самаправеркі

**А1.** Адзначце словы, у якіх прапушчана літара *а*:

1) бі..тлон 3) афіцы..нт 5) тэ..рэма
2) І..рданія 4) рэ..лізм

**А2.** Адзначце словы, у якіх прапушчана літара *ё*:

1) стады..н 3) Мі..ры 5) рады..ла
2) ге..лаг 4) і..наабмен

**А3.** Адзначце словы, у якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1) ініцыатыва 3) район 5) феерычны
2) іерогліф 4) Йоркшыр

**А4.** Адзначце словы, у якіх пры перакладзе на беларускую мову на адну літару менш, чым у рускай мове:

1) ионизация 3) фойе 5) иезуит
2) миллион 4) иерархия

**В1.** Запішыце беларускі адпаведнік да слова *аккордеон* рускай мовы.

## Правапіс прыстаўных галосных *і, а*

1. Прыстаўная галосная *і* пішацца:

у пачатку слова перад спалучэннямі зычных з першай літарай *м*: *імшара*, *імчаць*, *імгла*, *імгненне*, *імклівы*;

у пачатку некаторых слоў перад спалучэннямі зычных з першымі літарамі *р*, *л*, калі слова з такімі спалучэннямі зычных пачынае новы сказ або стаіць пасля знака прыпынку ці слова, што заканчваецца на зычную: *пад ільдзінай*, *без ільгот*; *пачарнелы, іржавы цвік*; *Ільняное палатно беляць на роснай траве*. Калі слова з такім пачатковым спалучэннем зычных стаіць пасля слова, якое заканчваецца на галосную літару, і пасля яго няма знака прыпынку, то прыстаўная літара *і* не пішацца: *на льдзіне*, *на ржавым цвіку*, *палатно льняное*.

2. У некаторых словах можа з'яўляцца прыстаўная галосная *а*: *імшара* і *амшара*, *іржаны* і *аржаны*, *іржышча* і *аржанішча*.

3. Пасля прыставак і першай часткі складанага слова, якія заканчваюцца на галосную, прыстаўныя літары *і* і *а* перад *р*, *л*, *м* не пішуцца: *заржавець*, *заржаць*, *зардзецца*, *замглёны*, *замшэлы*, *прымчацца*, *вокамгненна*.

**40.** Выпішыце словы, у якіх ёсць прыстаўныя галосныя *і* або *а*.

Ільвіны, імчацца, ілюмінатар, іржа, ільготы, аржаны, арбіта, азёры, імгненне, амшара, аўторак, алгарытм, ільнокамбінат, аблічча, іскра, інвентар, ідэя.

**41.** Запішыце, устаўляючы, дзе трэба, прыстаўныя галосныя. Растлумачце іх наяўнасць або адсутнасць.

Па ..льготным білеце, на ..льдзіне, пад ..льдом, новы ..льнокамбінат, серп ..ржавы, словы ..лжывыя, пакрыцца ..ржой, да ведаў ..мкнуцца, над ..лбом, абутак ..рвецца,

па ..ржэўніку, праезд ..льготны, машына ..рванула, леташняе ..ржышча, ластаўка ..мклівая, уперад ..рвануўся, рэакцыя ..мгненная.

î Назвы роднага краю

**АМШАРА, АРЖАНІЦА**

Назва *Амшара* паходзіць ад слова *амшара* (*імшара*) ‘мохавае балота’. На тэрыторыі Беларусі назвы з гэтай асновай сустракаюцца паўсюдна: лясы *Амшар*, *Амшара*, палі *Амшарнікі*, *Амшарок*, балоты *Амшары*, *Амшарына*.

(*Паводле В. Лемцюговай*)



*Аржаніца* — прыток Бярозаўкі — Заходняй Дзвіны. Назва паходзіць ад слова *іржа*, бо часам вада ў рацэ ржавая, у ёй значныя сляды жалеза.

(*Паводле У. Юрэвіча*)

**42.** Запішыце сказы, устаўляючы, дзе трэба, літару *і*, растлумачце правапіс.

1. Ён [Васька] глядзеў з-пад ..лба на месяц і адчуваў, як па ягоным твары мільгацяць цені рухавых лісткоў і галінак дрэў (*В. Казько*). 2. Вельмі добра я адчуваў сябе і ў ..льняной вышыванай кашулі (*В. Вольскі*). 3. Алесь за..мкнуўся, нікога не пускаючы ў свой свет (*У. Караткевіч*). 4. Серабрыстая ракета з караблём наверсе зіхацела ў сонечных промнях і, здавалася, сама ..рвалася ў бязмежны блакіт неба (*М. Гіль*). 5. Міліцыя збілася з ног, ..мкнучыся вылавіць і абясшкодзіць парушальнікаў людскога спакою (*Б. Сачанка*). 6. Кароткі быў сон у рыбака, бо яму і ў сне мроілася, што бачыць багаты ўлоў, які ..мгненна знікае з па..рванага нерата ў глыбіні возера (*Я. Баршчэўскі*). 7. У гаспадарчых

будынках глыбока ўздыхалі і варочаліся валы і час ад часу ..ржаў конь... (*В. Казько*).

**43.** Прачытайце тэкст. Хто з’яўляецца яго аўтарам? Спішыце, рашаючы арфаграфічныя задачы.

У тую ноч мне прыс(?)нілася: б..згучна скача (д / дз)ікае пал..ванне кар..ля Стаха. Б..згучна (?)ржуць коні, б..згучна апускаюц..а капыты. (?)мчаць ш..рыя, нахіл..ныя наперад (т / ц)ені, і б..лотныя агні гараць на (?)лбах к..ней... А пасля зноў ч..рная бездань ця..кага сну, і зноў скача па верасе і дрыгве (?)мклівае, як стр..ла, пал..ванне.

**44.** Складзіце са словамі сказы так, каб у адным выпадку з’яўляўся прыстаўны галосны, у другім — знікаў.

Ірваны — рваны, ільвяня — львяня, іржавец — ржавец, ільдзіна — льдзіна.

Правільнасць маўлення

**ІМШЫЦЬ – ІМШЭЦЬ – ІМЖЭЦЬ**

**Імшыць** — класці мох між бярвення ў новым зрубе; канапаціць мохам: *імшыць хату*.



**Імшэць** — зарастаць мохам: *балота імшэе*.

**Імжэць** — ісці, падаць, асядаць дробнымі кропелькамі (пра дождж): *імжэў дождж*.

Тэст 5 для самаправеркі

**А1.** Адзначце выпадкі, у якіх пішацца прыстаўная галосная:

1) балота ..мшэе
2) яна ..лжэ
3) вялікая ..льдзіна
4) на вуліцы ..мжэла
5) конь ..ржаў

**А2.** Адзначце выпадкі, у якіх прыстаўная галосная не пішацца:

1) гучнае ..ржанне
2) нельга ..рваць
3) рух ..мклівы
4) за..мшэлы камень
5) вось ..ржышча

**А3.** Адзначце словы (словазлучэнні), у якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1) ручнікі ільняныя
2) карыстацца льготай
3) апетыт ільвіны
4) заржавець
5) вокаімгненна

**А4.** Адзначце словазлучэнні, пры перакладзе якіх на беларускую мову ў другім слове з'яўляецца прыстаўная галосная:

1) осенняя мгла
2) машина ржавая
3) разбил льдину
4) человек лживый
5) волосы льняные

**В1.** Перакладзіце з рускай мовы на беларускую слова *примчаться*.

## Правапіс літар *і, ы, й*

1. Гук [і] пасля прыставак на галосную чаргуецца з [й], што перадаецца на пісьме літарай *й*:

у словах з коранем ***іс***-*ці*, ***ігр***-*аць*, ***ім***-*я*, ***інач***-*ай* на месцы ненаціскнога пачатковага каранёвага [і]: *выйсці*, *зайсці*, *пайсці*; *выйграць*, *зайграць*, *выйгрыш*; *найменне*, *перайменаваць*, *займеннік*, *пайменны*; *перайначыць*, *перайначанне*;

у словах *займаць*, *наймаць*, *пераймаць*, *пераманне*, *праймаць*.

У астатніх выпадках пачатковы каранёвы гук [і] пасля прыставак на галосны перадаецца нязменна: *заіскрыцца*, *заікацца*, *заінець*, *заінтрыгаваць*, *праілюстраваць*, *праіснаваць*, *неістотны*, *Прыіртышша*, *Заілійскі*.

2. Пачатковае *і* захоўваецца пасля прыставак *звыш-*, *між-*, *пан-*, *супер-*, *транс-*, *контр-*: *звышімклівы*, *суперінтэлект*, *міжінстытуцкі, панісламізм, трансіндыйскі, контрідэя,* а таксама ў складаных словах: *бортінжынер*, *спортінвентар*, *спецінструктаж*, *педінстытут* і інш.

3. Пры спалучэнні прыставак (*аб-*, *ад-*, *пад-*, *над-*, *раз-*, *з-*(*с-*), *уз-*, *перад-*, *дэз-*, *суб-* і інш.) са словамі, што пачынаюцца з *і*, вымаўляецца і пішацца *ы*: *абысці*, *надышоў, абыграць*, *падыграць, зыначыць, адыменны, узыход, спадылба, спадыспаду, перадыспытны, субынспектар, дэзынфармацыя, дэзынтэграцыя* і інш.

**45.** Прачытайце тэкст. Выпішыце словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс літар *і*, *ы*, *й*».

Пасля абеду Лабановіч сабраўся прайсціся. Ён выйшаў на двор. На вуліцы было столькі гразі, што перайсці яе ў настаўніка не хапіла адвагі. Ён павярнуў на поле, дзе стаялі два ветракі, і зараз жа выйшаў на вузкую сцежку, якая вяла на чыгунку. Узышоўшы на чыгунку, настаўнік прыпыніўся, разважаючы, у які канец пайсці.

(*Паводле Я. Коласа*)

**46.** Спішыце сказы, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары.

1. Мы разгаварыліся і разам ад..шлі да акна ў дальнім кутку залы (*У. Караткевіч*). 2. Пад..шоўшы да адной з такіх ямін, хлопцы заўважылі, як у вадзе шмыгнула нешта цёмнае (*Я. Майр*). 3. На аблаву вы..шлі перад самым усходам сонца (*М. Зарэмба*). 4. Са смехам, з песнямі ды жартамі пачалі ўсе раз..ходзіцца па хатах (*А. Карлюкевіч*). 5. Раніцай, як толькі сонейка ўз..шло, паднялося, па..шлі мы ўсе накрыўкі скідаць ды гародніну вадой з палівачак паліваць (*У. Дубоўка*). 6. Салдат сам нічога не гаварыў і вельмі скупа

падтрымліваў гутарку, без якой ніяк не мог абы..сціся шафёр (*А. Васілевіч*). 7. Цікаўнасць мая да..шла да мяжы немагчымага (*У. Караткевіч*). 8. Мы і не заўважылі, як над..шоў вечар (*В. Вольскі*).

î Назвы роднага краю

### ЗАЙМІШЧА

У старабеларускай мове *займішча* (ад дзеяслова *займаць*) — спецыяльна адведзенае месца ў лесе пад пасевы, сенажаць і інш. Лясныя дзялянкі звычайна абводзіліся спецыяльнымі знакамі-засечкамі. Пазначаную (занятую) такім спосабам дзялянку ніхто іншы не меў права гвалтоўна захапіць.



(*Паводле В. Лемцюговай*)

⏩ Арфаграфія і фразеалогія

**47.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх значэннямі.

а) вы..сці сухім з вады
б) ады..сці ў нябыт
в) пры..шло ў рукі
г) абы..сці бокам
д) ад..грываць ролю
е) за..мае дух
ж) раз..грываць камедыю
з) пера..сці дарогу

1) зусім не закрануць, мінуць каго-небудзь, што-небудзь
2) дзейнічаючы ашуканствам, застацца непакараным
3) каму-небудзь становіцца цяжка дыхаць (ад хвалявання, перажывання і пад.)
4) перастаць існаваць, знікнуць назаўсёды
5) перашкодзіць каму-небудзь, апярэдзіўшы ў чым-небудзь і пера-

хапіўшы тое, на што разлічваў іншы
6) вельмі лёгка дасталася
7) мець значэнне, аказваць уздзеянне на каго-небудзь, што-небудзь
8) прыкідвацца перад кім-небудзь, крывадушнічаць

Запішыце фразеалагізмы, устаўляючы, дзе трэба, літары. Растлумачце правапіс літар *і*, *ы*, *й*.

**48.** Прачытайце верш С. Грахоўскага. Сфармулюйце яго ідэю.

Жыццё пражыць –
Не поле перайсці,
А трэба і жыццё
Прайсці, як поле,
І хоць адным зярняткам узысці,
А бур'яном не зарасці ніколі.

Знайдзіце ў вершы словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс літар *і*, *ы*, *й*».

Якая прыказка ўключана ў верш? Растлумачце яе сэнс.

Запішыце верш па памяці. Выканайце самаправерку.

**49.** Запішыце выразы, прыведзеныя ў транскрыпцыі.

[н'оман ы дн'эпр], [ал'эх і вол'га], [с'в'атло й ц'эмра], [па йвана], [бац'ка й дз'ац'ка], [с'ц'ах і г'ерп], [бул'ба й агурк'і], [доўг'і й каротк'і], [м'от ы малако].

### Мова і нацыянальная культура

**50.** Прачытайце ўрывак з трылогіі Я. Коласа «На ростанях», ужываючы займеннікі, запісаныя ў дужках, у патрэбнай склонавай форме.

Галасы *мацнелі і набіралі* болей злосці. Гэта лаялася Аўдоля Латачыха з Акуляю. Палаяўшыся з паўгадзіны каля студні, яны разышліся. І, каб дапячы адна другой, пайшлі па вёсцы выстаўляць адна другую перад людзьмі.

— Пайшла па вуліцы званіць *зубамі і языком* мянціць, каб ён (табе / цябе) высах, — крычала Акуля. — *Так і паверацъ* (табе / цябе), брахусе. Хлеба замясіць *не ўмееш і хаты* ніколі не падмяцеш, каб (табе / цябе) вочы замяло!

Аўдоля, ідучы ў другі канец вуліцы, вяла сваё казанне:

— На мяне людзі глядзяць, бо я харошая, а на (*табе / цябе*) *і сабакі* пазіраць не хочуць. Зайздросна (табе / цябе)?.. А ты забылася, як (табе / цябе) бабка Тацяна на сваім двары злавіла? Чым ты там займалася? Чужых курэй сачыла? А гарбузы з агарода ў Рамковых хто цягаў, каб з (табе / цябе) кішкі павыцягвалі?

Палешукі стаялі, як *строгія і справядлівыя* суддзі, але сур'ёзныя твары іх часта рабіліся вясёлымі, і дружныя покаты смеху напаўнялі вуліцу.

(*Паводле Я. Коласа*)

Як вымаўляецца злучнік і ў выдзеленых спалучэннях слоў?

Знайдзіце ў тэксце словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс літар *і*, *ы*, *й*».

Ці згодны вы з Я. Брылём у тым, што ў праклёнах ёсць «паэзія, хай сабе грубая, але ж і хлёсткая»?

### Тэст 6 для самаправеркі

**А1.** Адзначце словы, у якіх прапушчана літара *й*:

1) пера..начыць
2) за..нелы
3) пра..нфармаваць
4) за..сці
5) узы..шоў

**А2.** Адзначце словы, у якіх прапушчана літара *і*:

1) спад..лба
2) паліт..нфармацыя
3) дэз..нфармацыя
4) пад..граць
5) контр..гра

**А3.** Адзначце правільна напісаныя словы:

1) надыйшоў
2) дэзынфіцыраваць
3) зайскрыцца
4) безыніцыятыўны
5) медінструменты

**А4.** Адзначце словы, у якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1) заіканне
2) абыграць
3) безіменны
4) бортінжынер
5) неімаверны

**В1.** Запішыце дзеяслоў, утвораны з дапамогай прыстаўкі *пра-* ад слова *існаваць*.

### Самадыктант

**51.** Спішыце тэкст, афармляючы яго ў адпаведнасці з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі.

«П..СНЯРЫ»

На высокі ўзров..нь б..ларускую народную пес(?)ню паднялі «П..сняры» в..кальна(?)інструм..нтальны ансамбль пад кіраўні..твам Улад..іміра Мулявіна. Усюды ансамбль прымалі с..рдэчна і з зах..плен..ем з вопл..скамі. Як за..граюць і засп..ваюць «П..сняры» дзе(?)небудзь у Ін(ды / дзі)і ці Францыі «Скрыпяць мае лапці» зала (ад) разу ўзрывалася апла(ды / дзі)сментамі.

Яны в..зілі па с(?)веце пес(?)ні нашых выдатных к..мп..зітараў на словы б..ларускіх п..этаў «Спа..чыну» Я. Купалы «Мой р..дны кут» Я. Кол..са «В..раніку» М. Багдановіча

«Алесю» А. Кул..шова «Жура..лі на (П / п)алес..е л..цяць» А. Ставера.

Абвінаваціць іх у нацы..налізме было н..магчыма бо (У / Ў)лад..імір Г..оргіевіч Мулявін к..рэнны сібірак рус(?)-кі па нацы..нальнасці.

«П..сняры» аб..ехалі амаль увесь с(?)вет. Дзякуючы ім людзі а..крывалі Б..ларусь і яе пес..нную культуру... «П..с-няры» дв..на..цаць разоў атрымлівалі гран-пры на пр..стыж-ных міжнародных ф..с(ты / ці)валях і конкурсах. (Ды / дзі)-скі з запісамі іх пес..н(?) выдаваліся міл..ннымі (ты / ці)-ражамі.

(*Паводле Я. Сіпакова*)

Выканайце самаправерку (*гл. с. 173*).

• Назавіце вядомыя вам песні з рэпертуару ансамбля «Песняры».

# ПРАВАПІС ЗЫЧНЫХ

Для абазначэння зычных гукаў у беларускай мове выкарыстоўваецца 21 літара: *б, в, г, д, ж, з, й, к, л, м, н, п, р, с, т, ў, ф, х, ц, ч, ш*.

Асобныя гукі не маюць спецыяльных літар: афрыкаты [дж], [дз] і мяккі [дз’] перадаюцца на пісьме адпаведна спалучэннямі літар *д* і *ж*, *д* і *з*: *ваджу*, *дождж*, *пэндзаль*, *хадзіць*, *дзюшэс*, *дзеці*, *дзеканне*.

Гук [й] перадаецца або літарай *й* (на канцы склада пасля галосных: *рэйка*, *май*), або літарамі *е*, *ё*, *і*, *ю*, *я*, якія адпаведна абазначаюць спалучэнні гукаў [йэ], [йо], [йі], [йу], [йа] ў пачатку слова, пасля галосных, апострафа, раздзяляльнага мяккага знака і *ў* (*у* нескладовага): *яблык*, *ёлка*, *есці*, *іней*, *юла*, *жоўтая*, *з’ява*, *аб’ём*, *пад’ехаць*, *раз’юшаны*, *уюн*, *кіёск*, *кальe*, *салаўі*, *налью*, *Касьян*, *абаўю*.

## Правапіс і вымаўленне звонкіх і глухіх, шыпячых і свісцячых зычных

У сучаснай беларускай мове аглушэнне зычных на канцы слова і перад глухімі, азванчэнне глухіх зычных перад звонкімі, прыпадабненне шыпячых да свісцячых і свісцячых да шыпячых **на пісьме не перадаецца**:

звонкія зычныя перад глухімі ў сярэдзіне і ў канцы слова вымаўляюцца глуха: *казка* — *ка*[с]*ка*, *лодка* — *ло*[т]*ка*, *ножка* — *но*[ш]*ка*, *снег* — *сне*[х], *ад хаты* — *а*[т] *хаты*;

глухія зычныя перад звонкімі ў сярэдзіне слова вымаўляюцца звонка: *малацьба* — *мала*[дз’]*ба*, *футбол* — *фу*[д]*бол*, *просьба* — *про*[з’]*ба*;

свісцячыя [з], [с], [дз], [ц] перад мяккімі зычнымі (за выключэннем [г’], [к’], [х’]) вымаўляюцца мякка: *смелы* —

[с’м’]*елы, збіць* — [з’б’]*іць, цвік* — [ц’в’]*ік, дзве* — [дз’в’]*е*, але: *скіба* — [ск’]*іба, схема* — [сх’]*ема, згінуць* — [зг’]*інуць*;

свісцячыя прыпадабняюцца да шыпячых і вымаўляюцца як шыпячыя: *сшытак* — [шш]*ытак*, *зжаць* — [жж]*аць*, *без жыта* — [б’ажжыта];

шыпячыя прыпадабняюцца да свісцячых і вымаўляюцца як свісцячыя: *возьмешся* — *возьме*[с’с’]я, *вучышся* — *вучы*[с’с’]*я*.

Каб правільна напісаць зычны, трэба падабраць роднаснае слова або змяніць яго так, каб пасля невыразнага зычнага стаў галосны: *дождж — дажджы, казка — казаць, гарадка — гарадок, касьба — касіць, грузчык — грузіць, мыешся — мыеш*.

**52.** Прачытайце тэкст.

Голуб Сняжок ужо на самым хрыбце страхі. Ён дакарае за нешта галубку Волечку, надзімаецца, кружыцца ваўчком, пад’язджае, як індык, вурчыць. Сняжок сварыцца на сваю белую сяброўку, якая залішне песціць галубянят.

Нарэшце, нібы выказаўшы ўсё, Сняжок узняўся ўверх, за ім узляцела яго паслухмяная Волечка, а ўслед за імі — малыя.

(*Паводле Я. Брыля*)

Выпішыце з тэксту словы, у якіх адбываецца: а) аглушэнне звонкіх зычных; б) прыпадабненне цвёрдых зычных да мяккіх; в) прыпадабненне свісцячых да шыпячых; г) прыпадабненне шыпячых да свісцячых. Падкрэсліце арфаграмы.

**53.** Упішыце словы ў табліцу, раскрываючы дужкі.

| Словы, у якіх адбываецца прыпадабненне | | | |
|---|---|---|---|
| звонкіх да глухіх | глухіх да звонкіх | свісцячых да шыпячых | шыпячых да свісцячых |
| | | | |

Мые(ш / с)ся, жані(дз / ц)ьба, ме(дз / ц)ь, чапляе(ш / с)ся, (ш / с)чарсцвелы, ра(ш / с)шыфраваць, стры(г / х)чы, бе(ж / з)жыццёвы, смяе(ш / с)ся, ка(з / с)ьба, тыра(ж / ш), лі(дж / ч)ба, гру(ш / з)чык, цягне(ш / с)ся, більяр(д / т), рэ(дз / ц)ька, перано(ш / с)чык, дзе(ж / ш)ка, ай(з / с)бер(г / х), вадаспа(д / т), асцерагае(ш / с)ся, бара(дз / ц)ьба, (ж / з)жоўкнуць, старае(ш / с)ся, э(г / к)замен, прые(ж / з)джы.

î Назвы роднага краю

**ПРУД, ПРУДКІ...**

У Беларусі шмат назваў мясцін, у аснове якіх ляжыць слова *пруд*: *Прудзец*, *Прудзішча*, *Прудкі*, *Пруды*, *Пруднікі* і пад. Словам *пруд* абазначаюць невялікі штучны вадаём, выкапаны катлаван, у які збіраюцца паводкавыя або дажджавыя ці снегавыя воды. Калі вёска сялілася каля вялікага пруда, яе называлі *Прудзішча*. Калі вакол вёскі было некалькі прудоў, давалася адпаведная назва — *Пруды* або *Прудкі*, калі ж вёска знаходзілася каля невялікага пруда — *Прудзец*. Бывае, што вёска знаходзіцца за прудам. Тады яе называюць *Запрудная*, *Запруддзе*, *Запрудок*.



(*Паводле У. Юрэвіча*)

**54.** Запішыце прыказкі ў адпаведнасці з арфаграфічнымі нормамі.

1. Мя[т]ком дружбы не заменіш. 2. Добраму го[с']цю вароты самі ра[ш]чыняюцца. 3. Кошка мы[с]цы не тавары́ш. 4. Што аднаму ця[ш]ка, тое гуртам лё[х]ка. 5. У роднай старона[цц]ы птушачкі пяюць, а ў чужой старона[цц]ы часта [с']лёзы льюць. 6. І пту[с]цы адной нудна. 7. Добра,

як сусе[т] блі[с]ка і перала[с] ні[с]ка. 8. І печанае рэ[ц’]кі [з’]ясі, калі выгаладае[с’с’]я. 9. А[т]кла[т] не ідзе ў ла[т]. 10. Будзе до[шч] і[с’]ці — будзе хле[п] ра[с’]ці. 11. Гаспадарку ве[с’]ці — не лапці пле[с’]ці. 12. [дз’]ве работы за ра[с] не зробіш.

Вусна растлумачце сэнс прыказак.

📖 Правільнасць маўлення

**УПЕРАМЕ<u>Ш</u>КУ – УПЕРАМЕ<u>Ж</u>КУ**



**Уперамешку** — у перамяшаным выглядзе, у беспарадку: *гарох з фасоляй уперамешку*.

**Уперамежку** — папераменна чаргуючыся адно з другім, размяшчаючыся ў пэўным парадку: *вагоны размяшчаліся ўперамежку з цыстэрнамі*.

**55.** Спішыце сказы, раскрываючы дужкі.

1. Бера(г / х)чы хле(б / п), шанаваць самы маленькі кавалачак, кожную скарыначку прывучалі дзе(д / т) і бацька (*І. Грамовіч*). 2. Пасля мая сумка з кні(ж / ш)камі ды (ш / с)шыткамі ціха шуснула ўні(з / с), на дарогу!.. (*Я. Брыль*). 3. У рэ(д / т)кім хвойнічку, што быў за бало(т / ц)цам, дзеці знайшлі рыжык (*Р. Ігнаценка*). 4. Садзіцца птах на галінку — і давай чысціць дзю(б / п)ку (*Х. Гурыновіч*). 5. Знаёмства наша адбылося выпа(д / т)кова, як гэта найчасцей і бывае сяро(д / т) рыбакоў (*Р. Ігнаценка*). 6. Сасце(ж / ш)кі хлопчык скіраваў у панскі са(д / т) (*М. Корзун*). 7. Яны [слівы] былі слі(з / с)кія і халодныя, як ры(б / п)кі, выцягнутыя з вады (*В. Казько*). 8. Ма(т / ч)чыных слоў не забуду ніколі (*К. Кірэенка*). 9. Лё(г / х)кія

пушынкі лёталі, кружыліся ў паветры і асядалі на дрэвы, на аголены куст бэзу ў нашым агаро(д / ч)чыку пад акном (*І. Грамовіч*).

Падкрэсліце словы, у якіх адбываецца аглушэнне зычных гукаў.

**56.** Спішыце тэкст, рашаючы арфаграфічныя задачы.

Да новага дз..в..ціпав..рховага дома пад..я..джалі грузавікі з н..васёламі. З машын здымалі ст..лы, ло(ж / ш)кі, посу(д / т)... Дзя(дз / ц)ькі ас(?)ц..рожна (з / с)пускалі з грузавіка чорнае пі..ніна. Я падбе(г / х) і так(?)сама па(д / т)ставіў пл..чо. Але (не) ўзабаве, калі пі..ніна ўк..цілі ў пад..ез(д / т), вымушаны быў а(д / т)ступіцца: на лес(?)віцы было зана..та цесна.

Б..лявы хл..пчук гадоў дв..на..цаці па(д / т)скочыў да пажылой жанчыны, якая (ні) як (не) м..гла (ад) разу падняць з з..млі вазон з кактусам і клунак з ку(б / п)камі, спо(д / т)камі, лы(ж / ш)камі. Ён (з / с)хапіў аберуч гаршчок з кактусам і з(?)нік у пад..ездзе. А жанчына нагнулася, з(?)біраючыся на гэты ра(з / с) узяць вя(з / с)ку кні(г / х), ды (не) паспела. Хл..пчук, нібы метэ..р, выл..цеў з ра..чыненых насце(ж / ш) дз(?)в..рэй і выгукнуў:

— Бабуля, (не) чапай! Я сам іх адн..су!

(*Паводле С. Міхальчука*)

Падкрэсліце словы, у якіх адбываецца прыпадабненне свісцячых зычных да шыпячых.

## Правапіс спалучэнняў зычных на стыку кораня і суфікса, прыстаўкі і кораня

1. На стыку кораня і суфікса адбываецца прыпадабненне груп зычных, што **на пісьме не перадаецца**:

спалучэнні зычных *дч*, *тч* вымаўляюцца як падоўжаны гук [ч]: *дакладчык — дакла*[чч]*ык*, *пераплётчык — пераплё*[чч]*ык*;

спалучэнні зычных *дц*, *тц*, *чц* вымаўляюцца як падоўжаны [ц]: *селядцы –селя*[цц]*ы*, *кладачцы — клада*[цц]*ы*, *вопратцы — вопра*[цц]*ы*;

спалучэнне зычных *дс* вымаўляецца як гук [ц]: *гарадскі — гара*[ц]*кі*, *людскі –лю*[ц]*кі*;

спалучэнні зычных *жс*, *шс*, *зс* вымаўляюцца як [с]: *нясвіжскі — нясві*[с]*кі*, *добрушскі — добру*[с]*кі*, *французскі — францу*[с]*кі*.

2. Напісанне зычных *з* і *с* у прыстаўках адпавядае вымаўленню:

перад галоснымі і звонкімі зычнымі пішуцца прыстаўкі *з*-, *уз*-, *без*-, *раз*-: *змаляваць*, *узлесак*, *безабаронны*, *бязрадасны*, *разбег*, *разагнацца*;

перад глухімі зычнымі пішуцца прыстаўкі *с*-, *ус*-, *бес*-, *рас*-: *схапіць*, *успомніць*, *беспадстаўна*, *раскінуць*.

**!** Прыстаўка іншамоўнага паходжання *дыс*- пішацца нязменна незалежна ад наступнай літары: *дыскваліфікацыя*, *дысгармонія*.

Прыстаўкі *ад*-, *пад*-, *над*-, *перад*-, *аб*- пішуцца перад глухімі і перад звонкімі нязменна: *адрабіць*, *адхапіць*; *падрэзаць*, *падкласці*; *надламаць*, *надпісаць*; *пераднацыскны*, *перадсвяточны*; *абгрызці*, *абсекчы*.

**!** Незалежна ад вымаўлення пішуцца нязменна ўсе прыназоўнікі: *ад рэчкі*, *ад хаты*; *пад зоркамі*, *пад сталом*; *з мамай*, *з сястрой*; *без радасці*, *без памылак*.

**57.** Запішыце словы, выбіраючы з дужак патрэбную прыстаўку.

(Ад / ат)правіць, (з / с)рэзаць, (дыз / дыс)гармонія, (з / с)пілаваць, (перад / перат)ваенны, (уз / ус)гадаваць,

(без / бес)заганны, (аб / ап)тачыць, (раз / рас)галінаваны, (дыз / дыс)камфорт, (пад / пат)каваць, (уз / ус)хваліць, (над / нат)палубны, (раз / рас)кланяцца, (без / бес)пазваночны, (раз / рас)чуліць, (аб / ап)церці, (бяз / бяс)хмар’е, (дыз / дыс)прапорцыя, (з / с)крануць.

### Арфаграфія і фразеалогія

**58.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх значэннямі.

а) на ра(з / с)бор шапак
б) ра(з / с)сыпацца дробным макам
в) па(д / т)пілаваць рогі
г) а(д / т)пускаць лейцы
д) як ветрам (з / с)дзьмула
е) (з / с)кінуць з шыі ярмо
ж) лунаць у на(д / т)хмар’і
з) а(б / п)ціраць вуглы

1) хто-небудзь бясследна, імгненна знік, схаваўся
2) уціхамірыць, утаймаваць, зрабіць больш памяркоўным каго-небудзь, прымусіць пакарыцца
3) бясплённа марыць, не заўважаючы навакольнага
4) бяздзейнічаць, туляцца без справы
5) пад самы канец чаго-небудзь, з вялікім спазненнем
6) змяншаць кантроль, паслабляць увагу, пільнасць, патрабаванні да каго-небудзь
7) вызваліцца з-пад чыёй-небудзь улады
8) лісліва дагаджаць каму-небудзь, паддобрывацца да каго-небудзь

Запішыце фразеалагізмы, раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс зычных на стыку прыстаўкі і кораня.

**59.** Спішыце сказы, рашаючы арфаграфічныя задачы.

1. У ахвоту намахаўшыся спінінгамі, моўчкі с..дзім на высокім мурожным беразе, (з / с)весіўшы да вады босыя

ногі, а(д / т)пачываем (*Р. Ігнаценка*). 2. Люд..і спакойна а(д / т)пачывалі і, здаецца, а(д / т)чувалі с..бе прыемна (*Я. Маўр*). 3. Зусім нечакана з(?)пад ног дзя(дз / ц)ькі Яўмена ў(з / с)хапіўся заяц (*Р. Ігнаценка*). 4. Знойд..еная арх..олагамі п..чатка князя Ізяслава з на(д / т)пісам лічыцца адным з на..даўнейшых помнікаў піс(?)менства ў(з / с)ходніх славян (*У. Арлоў*). 5. Альберт Іванавіч ужо с..дзіць за ст..лом з ра(з / с)шпіленым каўняром... (*Я. Каршукоў*). 6. (З / с)права пачулася ціхае шапацен..е па(д / т)мёрзлага ліс(?)ця на з..млі (*Р. Ігнаценка*). 7. Дзеля ўшанаван..я б..гоў про(д / т)кі будавалі бажніцы — капішчы, дзе заўсёды па(д / т)трымліваўся агонь (*У. Арлоў*). 8. Усю тую ноч у цё(т / ч)чынай хаце я н.. заснуў н.. на хвіліну (*А. Васілевіч*).

Падкрэсліце словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс спалучэнняў зычных на стыку прыстаўкі і кораня».

### ⏩ Арфаграфія і лексікалогія

**60.** Да слоў з левага слупка падбярыце сінонімы з правага слупка. Запішыце словы парамі, раскрываючы дужкі.

| | |
|---|---|
| Загарэцца, шчыпаць, ашукаць, акружыць, зняверыцца, спрактыкаваны, слабы, аблічча, каснік, эгаізм, абгрунтаванне, шост, шанс, рэха, фурман, баец, схіл, дзірка, здраднік, тайнік. | Дока(з / с), ма(г / х)чымасць, во(з / ш)чык, а(б / п)ступіць, абя(з / с)ілены, сту(ж / ш)ка, бара(дз / ц)ьбіт, ра(ш / с)чараваццa, а(д / т)кос, а(д / т)галосак, выгля(д / т), самалю(б / п)ства, а(д / т)ступнік, жэр(д / т)ка, дасве(д / ч)чаны, (з / с)ховішча, у(з / с)пыхнуць, ску(б / п)ці, а(б / п)хітрыць, а(д / т)туліна. |

**61.** Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс зычных.

З *гарышча* в..сковага дома я па(з / с)носіў на *лецішча* старыя кні(ж / ш)кі, каб ра(з / с)пальваць імі камін. Хацеў выдраць з адной з іх нек..лькі старонак і ... кні(ж / ш)ка ра(з / с)гарнулася якраз на тым месцы, дзе была (з / с)хавана засушаная кветка. Тры дз..с..цігоддзі прал..жала т..нюткая сц..блінка з празрыстымі п..лёсткамі. У ёй ця(ж / ш)ка было ўгадаць блакітную прале(з / с)ку. Разам з н..чаканай знахо(д / т)кай у(з / с)плылі цёплыя ў(з / с)паміны. На (?)мгненне я стаў васьміклас..нікам, зноў апынуўся за школьнай партай, н..смела ў(з / с)міхнуўся дз..ўчынцы з доўгай к..сой... І сола(д / т)ка зашчымела сэр(?)ца.

(*Паводле Х. Гурыновіча*)

• Растлумачце лексічныя значэнні выдзеленых слоў.

î Назвы роднага краю

## ПАДЦАЦКІЯ, РАСЦЯРОБЫ

Назва вёскі *Падцацкія* пайшла ад мянушкі чалавека, які ўмеў так аздабляць разьбярствам свой дом, што пра гаспадара казалі: жыве *пад цацкамі*. Ён выштукаваў і суседнія дамы, так што пра жыхароў вёскі казалі: жывуць *пад цацкамі*. А каб карацей называць, вёсцы далі назву *Падцацкія*.

(*Паводле У. Юрэвіча*)



У беларускай мове слова *расцяроб* абазначае месца, дзе расцерабілі, высеклі лес, кустоўе. Нярэдка гэта слова ўжываецца ў якасці назваў населеных пунктаў: пасёлкі *Расцяроб*, *Расцяробы*.

(*Паводле В. Лемцюговай*)

## Мова і нацыянальная культура

**62.** Прачытайце тэкст. Растлумачце сэнс загалоўка.

ЖАНОЧАЯ МОВА

Ручнік, які ткалі беларускія жанчыны, можна ў пэўным сэнсе паставіць у адзін ра(д / т) з фрэскамі егіпе(ц / тс)кіх пірамі(д / т) або з кель(ц /тс)кімі рунамі. Ён у..нік яшчэ ў дахрысціянскую эпоху і ўвасабляе двухвер'е — суіснаванне язычні..тва і хрысціян..тва.

Беларускі ручнік мае свае нацыянальныя прыметы. Разам з тым у кожным рэгіёне, а часам і ў асобнай вёсцы ствараліся ручнікі, якія а..люстроўвалі асаблівасць менавіта гэтай мясцовасці. Полацкія ручнікі а..розніваюцца ад чэрвеньскіх, столін(ц / с)ка-пін(ц / с)кія — ад клецка-ляхаві(ц / чс)кіх, а ў калінкаві(ц / чс)кіх і слаўгара(ц / дс)ка-быхаўскіх ручніках ёсць агульныя рысы.

Ні ў Беларусі, ні за яе межамі нельга знайсці аналага знакамітым мотальскім ручнікам (Іванаўскі раён Брэс(ц / тс)кай вобласці). Яны вылучаюцца не толькі складаным тканым узорам, але і вузельчыкавымі карункамі на канцах.

Тое цяпло, якое захоўваюць беларускія ручнікі, — цяпло жаночых рук і а..чуванне ў..вышанасці і чысціні жаночых думак.

(*Паводле В. Мядзведзевай*)

Выпішыце з тэксту словы, у якіх трэба раскрыць дужкі або ўставіць прапушчаныя літары. Вусна растлумачце іх правапіс, асаблівасці вымаўлення.

## Тэст 7 для самаправеркі

**А1.** Адзначце словы, у якіх прапушчана літара *з*:

1) ка..ьба
2) ра..ьба
3) у..горак
4) у..краіна
5) слі..кі

**А2.** Адзначце словы, у якіх прапушчана літара *д*:

1) па..коп  3) зага..ка  5) сві..ка
2) баске..бол  4) абхо..чык

**А3.** Адзначце правільна напісаныя словы:

1) разжаваць  3) спяшаешся  5) дызбаланс
2) прыяжджаць  4) у клетцы

**А4.** Адзначце словы, напісанне якіх адпавядае вымаўленню:

1) чэшскі  3) ткацкі  5) рассунуцца
2) завесці  4) вакзал

**В1.** Запішыце згодна з арфаграфічнымі нормамі прыведзенае ў транскрыпцыі слова [*пац’ц’агн’эс’с’а*].

## Правапіс *д* і *дз*, *т* і *ц*

У беларускай мове літары *д*, *т* пішуцца для перадачы на пісьме цвёрдых зычных гукаў [д], [т], а літары *дз*, *ц* — для перадачы мяккіх зычных гукаў [дз’], [ц’].

1. Чаргаванне цвёрдых зычных гукаў [д], [т] з мяккімі [дз’], [ц’] (дзеканне і цеканне) адбываецца:

перад галоснымі *е*, *ё*, *ю*, *я*, *і*: *агарод — у агародзе*, *іду — ідзеш*, *вада — вадзяністы*, *палёт — у палёце*, *тру — церці*, *шосты — шэсць*, *латынь — лацінка*;

перад мяккім [в’]: *два — дзве*, *дзвесце*, *чэрствы — счарсцвелы*;

перад суфіксамі і спалучэннямі суфіксальнага паходжання -*ін*-, -*ір*-, -*ік*-, -*ёр*-, -*еец*, -*ейск*- у словах іншамоўнага паходжання, а таксама ў словах, вытворных ад іх: *каманда — камандзір*, *індзеец*, *індзейскі* (але: *Індыя — індыец*, *індыйскі*, *індыйцы*), *гвардыя — гвардзеец*, *гвардзейскі*, *білет — білецёр*, *білецік*.

2. Літары *дз* і *ц* перад мяккім [в’] пішуцца згодна з вымаўленнем у словах *дзверы*, *чацвер*, *подзвіг*, *мядзведзь*, *цвёрды*,

*цвярозы*, *цвік*, *цвілы*, *цвісці*, *ліцвін*, *ліцвінка*, *яцвяг*, *Дзвіна*, *Мацвей* і інш. Выключэнне: *твіст*.

3. Літары *д* у складзе прыстаўкі і *т* у складзе суфікса перад [в'] перадаюцца адпаведна літарамі *д* і *т*: *адвезці*, *падвязаць*, *у таварыстве*, *у агенцтве*, *у выдавецтве*, *аб прыродазнаўстве*, *у братэрстве*; *бітва — у бітве*, *брытва — брытве*, *брытвенны*, *клятва — клятве*, *клятвенны*.

Літары *д* і *т* пішуцца таксама ў некаторых іншых словах: *мардва — мардве*, *мардвін*, *Мардвінаў*, *Літва — у Літве*.

4. У пераважнай большасці слоў іншамоўнага паходжання ў адпаведнасці з літаратурным вымаўленнем пішуцца *д* і *т*: *студэнт*, *дэпутат*, *дывізія*, *дэмакратыя*, *медыцына*, *апладысменты*, *дэманстрацыя*, *дыктатура*, *дысцыпліна*, *дэлегат*, *атэстат*, *кватэра*, *тыраж*, *тыгр*, *майстар*, *матэрыял*, *універсітэт*, *пластык*, *авантура*.

У некаторых словах іншамоўнага паходжання ў адпаведнасці з традыцыяй і літаратурным вымаўленнем пішуцца *дз*, *ц*: *цір*, *арцель*, *эцюд*, *цюль*, *цюльпан*, *цюркскі*, *цітры*, *уверцюра*, *накцюрн*, *каранцін*, *карцеч*, *касцюм*, *цюбік*, *цюк*, *цюфяк*, *дзюбель*, *дзюдо*, *мундзір*, *дзюна*, *дзюшэс*, *бардзюр*.

5. Ва ўласных назвах літары *д*, *т* і *дз*, *ц* пішуцца ў адпаведнасці з літаратурным вымаўленнем: *Дэфо*, *Балтыка*, *Ватыкан*, *Антарктыда*, *Тэгеран*, *Людміла*, *Дэтройт*, *Атэла*, *Тэрэза*, *«Юманітэ»*; *Хрысціна*, *Дзікенс*, *Гарыбальдзі*, *Аргенціна*, *Цюмень*, *Цімкавічы*, *Гаіці*, *Палесціна*.

**63.** Раскажыце пра дзеканне і цеканне ў беларускай мове. Параўнайце, як вымаўляюцца ў беларускай і рускай мовах наступныя словы.

Церці — тереть, сцяна — стена, Радзіма — Родина, дзевяць — девять, дзверы — дверь, ляцець — лететь, цярпець — терпеть, дзядзька — дядя, дзіва — диво.

**64.** Прачытайце тэкст. Выпішыце з яго словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс літар *д* і *дз*, *т* і *ц*».

ВЯТРЫ

Заходнія вятры прыносяць у Беларусь цёплае атлантычнае паветра. Марское паветра нясе воблакі, туманы, *ападкі*, павышэнне тэмпературы нават зімою. Арктычнае паветра даходзіць да нас з цыклонамі. Тады нават летам рэзка халадае, з'яўляюцца парывісты вецер, вялікая *воблачнасць*. Трапічнае паветра, прынесенае на крылах вятроў, павышае тэмпературу.

Над нашай зямлёю часта дужаюцца цыклоны і антыцыклоны. А мы тады маем *няўстойлівае* надвор'е.

(*Паводле Я. Сіпакова*)

Назавіце арфаграмы ў выдзеленых словах.

î Назвы роднага краю

**РУДЗЕНСК**

Назва гарадскога пасёлка *Рудзенск* у Пухавіцкім раёне сваім паходжаннем стаіць у адным шэрагу з тым мноствам (каля сотні) назваў, што ўтварыліся ад слова *рудня* — мясціна, дзе здабывалі з балота жалезную руду.

(*Паводле У. Юрэвіча*)



**65.** Спішыце, раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс літар *д*, *т*, *дз*, *ц*.

(Ды / дзі)ктар, (ды / дзі)спетчар, (тэ / це)арэ(ты / ці)к, (ду / дзю)на, валакар(ды / дзі)н, (дэ / дзе)фект, мун(ды / дзі)р, ман(то / цё)р, бар(ду / дзю)р, на(ту / цю)юрморт,

ак(то / цё)рскі, біле(то / цё)р, ар(тэ / це)ль, п’е(дэ / дзе)стал, у грама(д / дз)стве, у Лі(т / ц)ве, ла(ты / ці)нь, (тэ / це)мп, гвар(дэ / дзе)йскі, (ту / цю)льпан, сту(дэ / дзе)нт, (тэ / це)атр, па(т / ц)вердзіць, у вучнёўс(т / ц)ве, С(тэ / це)ндаль, Гарыбаль(ды / дзі), Ма(т / ц)вей, канс(ты / ці)туцыя.

**66.** Запішыце словы і словазлучэнні па-беларуску, растлумачце правапіс.

Юпитер, авторитет, аптечный киоск, латинский, этюд, подвиг, тигровая шкура, вахтер, партизан, твердый, плотина, Гаити, стадион, техника, карантин, академия, демонстрация, кандидат, дивизия, командир, ветеран, вестибюль.

📖 Правільнасць маўлення

**ТЭЛЕВІЗ<u>АР</u>НЫ – ТЭЛЕВІЗ<u>ІЙ</u>НЫ**

**Тэлевізарны** — які мае адносіны да тэлевізара, прызначаны для яго; звязаны з вырабам тэлевізараў: *тэлевізарны экран*, *тэлевізарны столік*, *тэлевізарны завод*.



**Тэлевізійны** — які перадаецца ці прымаецца па тэлебачанні; прызначаны для перадачы або прыёму відарысаў з дапамогай сродкаў тэлебачання: *тэлевізійны фільм*, *тэлевізійная перадача*, *тэлевізійная антэна*.

**67.** Запішыце словы, выбіраючы з дужак правільны варыянт і размяркоўваючы іх у два слупкі: 1) словы з літарамі *д*, *т*; 2) словы з літарамі *дз*, *ц*.

(Д / дз)веры, бамбар(ды / дзі)раваць, (дэ / дзе)по, прак(ты / ці)кант, каман(ды / дзі)роўка, (дэ / дзе)путат, (тэ / це)левізійны, (дэ / дзе)кабрысты, ап(тэ / це)ка, (Ты / Ці)бет, апла(ды / дзі)сменты, (тэ / це)ф(тэ / це)лі,

Лю(д / дз)міла, (ды / дзі)ятэз, (ты / ці)раж, (Тэ / Це)ляханы, Палес(ты / ці)на.

**68.** Спішыце сказы, выбіраючы з дужак правільныя напісанні.

1. Трэба было паведаміць аб выніках каман(ды / дзі)роўкі і здаць ма(тэ / це)рыял, а затым (тэ / це)рмінова засесці за нарыс у наступны нумар (*А. Васілевіч*). 2. Кірыла неяк у кампаніі пагразіўся, што зробіць Рагойшу персанажам са(ты / ці)рычнай аповесці, нават прозвішча не зменіць (*І. Шамякін*). 3. Праз хрыс(ты / ці)янскую культуру Беларусь увайшла ў еўрапейскую цывілізацыю (*У. Арлоў*). 4. І нават добры па натуры чалавек, (дэ / дзе)макрат, калі трапляе ў гэтую бюракра(ты / ці)чную машыну, перастае быць тым, кім быў (*Б. Сачанка*). 5. У Івана заўсёды нараджаюцца і(дэ / дзе)і, і слоў на вецер ён не кідае (*І. Навуменка*). 6. Жэня неяк паспешліва закончыла свой расказ, прыпомніўшы яшчэ (д / дз)ве-тры (дэ / дзе)талі нашага сту(дэ / дзе)нцкага жыцця (*А. Васілевіч*). 7. Давялося заказваць кас(ту / цю)мы ў а(тэ / це)лье (*Б. Сачанка*).

### Пераклад тэксту

**69.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

Только что поступив в академию, Саня достала работу в детском издательстве. У нее была любовь к миниатюре — искусство, которым теперь почти не занимаются наши художники. Тонкость, с которой она выписывала все мелкие детали лица и одежды, была просто необыкновенная.

(*По В. Каверину*)

### Мова і нацыянальная культура

**70.** Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары.

Тал..рантнас(т / ц)ь, што ў перакла(д / дз)е з ла(ты / ці)нскай мовы азначае (т / ц)ярпенне, л..гла ў аснову м..нталі(тэ / це)ту беларусаў. Яна ўключае такія якас(т / ц)і ў харак(та / це)ры і паво(д / дз)інах, як спакойны, вытрыманы нораў, добрыя адносіны да сусе(д / дз)яў, пачу(тт / цц)ё асабістай годнас(т / ц)і, любоў да сваёй зямлі, гатоўнас(т / ц)ь з самаа..данас(т / ц)ю, а калі трэба, і з самаахвярнас(т / ц)ю барані(т / ц)ь родныя мяс(т / ц)іны.

Адна з найбольш яскравых праяў тал..рантнас(т / ц)і адлюстравана ў культуры — не толькі ма(тэ / це)рыяльнай, але і духоўнай. Харак(тэ / це)рна, што нашы прашчуры, з'яўляючыся мужнымі абаронцамі сваёй зямлі, будучы лю(д / дз)ьмі, якія вялі з ворагам самаа..даную і г..раічную бара(дз / ц)ьбу, у той жа час не праяўлялі заваёўніцкіх намераў. Гэта сугучна нават зместу вуснай народнай творчас(т / ц)і, якая, як вядома, дакладна адлюстроўвае душу народа. У старажытным эпасе беларусаў значна менш, у параўнанні з іншымі п..рсанажамі, праслаўляюцца волаты, якія наво(д / дз)ілі жах на сусе(д / дз)яў-заваёўнікаў.

(*Паводле М. Касцюка*)

• Устанавіце адпаведнасць паміж якасцямі характару беларусаў — складнікамі талерантнасці і прыказкамі, у якіх знайшлі адбітак гэтыя рысы.

| | |
|---|---|
| а) спакойны, вытрыманы нораў | 1) Не той моцны, хто стрымлівае коней, а той, хто стрымлівае сябе. |
| б) добрыя адносіны да суседзяў | 2) Усякая птушка сваё гняздо бароніць. |
| в) пачуццё асабістай годнасці | 3) Ідзі ў родны край, там і пад елкаю рай. |
| г) любоў да сваёй зямлі | 4) Шануй сябе, то і людзі будуць шанаваць. |
| д) гатоўнасць з самаадданасцю бараніць родныя мясціны | 5) Добры сусед раднейшы за роднага брата. |

• Назавіце імёны беларускіх казачных асілкаў.

### Тэст 8 для самаправеркі

**А1.** Адзначце словы, у якіх прапушчаны літары *дз*:

1) каар..ынаты 3) ..весце 5) ві..эасалон
2) у зго..е 4) па..везці

**А2.** Адзначце словы, у якіх прапушчана літара *т*:

1) шах..ёр 3) на плане..е 5) на..юрморт
2) ап..эка 4) у сваяц..ве

**А3.** Адзначце правільна напісаныя словы:

1) цюбецейка 3) індэец 5) Хрысціна
2) затвярдзелы 4) аптымізм

**А4.** Адзначце словы, пры перакладзе якіх з рускай мовы на беларускую адбываецца пераход *т* у *ц*:

1) *т*ерпение 3) бан*т*ик 5) че*т*верг
2) *т*терраса 4) бри*т*венный

**В1.** Перакладзіце з рускай мовы на беларускую слова *дебютировать*.

## Правапіс падоўжаных зычных

1. У беларускай мове ў становішчы паміж галоснымі зычныя гукі [з'], [л'], [н'], [с'], [дз'], [ц'], [ж], [ш], [ч] вымаўляюцца падоўжана. Такое іх вымаўленне на пісьме перадаецца падвоеным напісаннем адпаведных літар: *маззю*, *вяселле*, *насенне*, *калоссе*, *пяццю*, *збожжа*, *узвышша*, *ноччу*, *Наталля*, *Палессе*, *Закарпацце*. Падоўжаны гук [дз'] перадаецца на пісьме спалучэннем літар *ддз: суддзя*, *стагоддзе*.

2. Падаўжэнне зычных не адбываецца:

у словах *Ілья*, *Ульяна*, *Касьян*, *Емяльян*, *Юльян*, *Юльяна* і вытворных ад іх: *Ільін*, *Ільіч*, *Ільінскі*, *Ульянаў*, *Ульянаўск*, *ульянаўскі*, *Касьянавіч*, *Емяльянавіч* і інш., а таксама ў словах, утвораных ад дзеяслова *ліць*: *лье*, *льецца*, *налью*;

у запазычаных словах, у тым ліку ва ўласных імёнах і назвах, і вытворных ад іх словах: *граматыка*, *сума*, *каса*, *алея*, *група*, *клас*, *калекцыя*, *тона*, *калектыў*, *Ала*, *Іна*, *Нона*, *Васа*, *Іпаліт*, *Кірыл*, *Генадзь*, *Адэса*, *Марока*, *Ніца*.

**!** Выключэнне складаюць словы: *ванна*, *манна*, *панна*, *бонна*, *мадонна*, *меццца*, *саванна*, *Ганна*, *Жанна*, *Мекка* і інш.

**71.** Прачытайце тэкст. Выпішыце словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс падоўжаных зычных».

Ліпавае суквецце мае калякветкавы лісток. Ён служыць ветразем для арэшка — насення ліпы. Гэтымі арэшкамі ахвотна ласуюцца сойкі, дзятлы, вавёркі. Плады ліпы вісяць да зімы, яны ніколі не прарастаюць у першы год. Ім трэба астудзіцца. За многія стагоддзі ліпа так прызвычаілася да холаду, што без яго насенне не можа развівацца.

(*Х. Гурыновіч*)

**72.** Запішыце словы, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары.

Кал..ектыў, імгнен..е, бас..ейн, сум..а, багац..е, Емял..ян, гнездаван..е, падарож..а, паўгод..е, кар..эспандэнт, палоз..е, Купал..е, сён..ня, сол..ю, груп..а, ван..а, узбярэж..а, Жан..а, ноч..у, Палес..е, раўнадуш..а, кахан..е, адзен..е, тэр..ыторыя, тры..цаць, Іл..іч, правасуд..е, прагрэс..іўны, ат..ракцыён, маўчан..е.

Запомніце!

Ад падоўжаных зычных неабходна адрозніваць падвоеныя зычныя, якія ўзнікаюць на стыку прыстаўкі і кораня, кораня і суфікса, суфікса і постфікса: ***рассмяшыць***, ***аддаць***; *лімо****нн****ы*, *кішэ****нн****ы*, *каме****нн****ы*; *затрыма****цц****а*, *усхапі****цц****а*.

**73.** Выпішыце спачатку словы з падаўжэннем зычных, а затым — з падваеннем.

Раззлаваны, пытанне, ззаду, ранні, Ганна, рассекчы, аддалены, дзённы, вецце, паддон, ссечаны, аддзяленне, каменне, каменны, Залессе, Паддубішча, голле, паўтарэнне, збожжа, уссадзіць, аббегчы, зацішша, асенні, прымадонна, бярвенне, суддзя, бясспрэчны, соллю, бяздонны, раздолле, гучанне, аконны.

**74.** Выпішыце з тэксту спачатку словы, у якіх праяўляецца падаўжэнне, а затым — падваенне зычных.

Многае выпала бачыць і чуць хвалям дзвінскім. У іх адлюстраванне не толькі мірыяд зямных сонцаў старажытнага Полацка і яго юнага сабрата Наваполацка. У іх спешнай гаворцы — гартанны спеў весляроў гандлёвых суднаў на шляху «з варагаў у грэкі», прычытанні жанок, што праводзілі на бітву дружыннікаў Якава Палачаніна... Помніла Полаччына, і не раз паўтаралі яе сыны і дочкі словы легендарнага палкаводца Аляксандра Неўскага: «Хто з мячом да нас прыйдзе, ад мяча і загіне». А гасцей жаданых сустракаў мой край хлебам-соллю.

(*Паводле В. Лукшы*)

Правільнасць маўлення

**КОЛАС – КАЛАСЫ – КАЛОССЕ**

Зборныя назоўнікі *кало́ссе*, *карэ́нне*, *галлё*, *насе́нне* і іншыя маюць толькі форму адзіночнага ліку.

Трэба адрозніваць зборныя назоўнікі ад аднакаранёвых назоўнікаў адзіночнага і множнага ліку:

*ка́мень* (адз. л.) — *камяні́* (мн. л.) — *каме́нне* (зб.);

*бервяно́* (адз. л.) — *бярвёны* (мн. л.) — *бярве́нне* (зб.);

*праме́нь*, *про́мень* (адз. л.) — *праме́ні*, *прамяні́*, *про́мні* (мн. л.) — *праме́нне* (зб.).



**75.** Спішыце сказы, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары.

1. Будзе шастаць пад зімовымі вятрамі гол..е старой яліны, глуха шумець сасон..ік, але ўсё гэта мне прыйдзец..а слухаць без Антаніны (*І. Навуменка*). 2. Паляўнічы налічыў у чарадзе ажно два..цаць аднаго дзіка (*Р. Ігнаценка*). 3. Усюды чысціня, ак..уратныя, гожыя цагляныя домікі, плітачныя тратуары, асфальт... (*Б. Сачанка*). 4. Ці можа жыць чалавек толькі розумам, без пачуц..яў, без душы і сэрца, без спагады і спачуван..я болю, гору і няшчасц..ю іншых людзей? (*В. Вітка*). 5. Пацягнула свежай вільгац..ю і водарам веснавых траў (*Я. Бяганская*). 6. Мой народ праз стагод..зі пранёс дабрату, да сусед..зяў-народаў павагу (*А. Ставер*). 7. Мне адразу ж стала неяк лягчэй, хоць навакол..е не магло пахваліц..а весялосц..ю (*У. Караткевіч*). 8. За акном, на пер..оне, віравала людское мора (*М. Гіль*).

**76.** Спішыце тэкст, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары і ставячы знакі прыпынку.

Гаі раскідан..ыя па ў..горках стаялі ў золаце і ў самых р..знастайных адцен..ях пурпуру. У паветры насычан..ым свежасц..ю і сухім хол..дам было так ціха і чыста што самае лё..кае дрыжан..е не парушала с..рабрыстага павуцін..я якое вісела на гол..і дрэў. Паміж палоскай узаран..ай з..млі і гародам поўным засохлага был..я с..дзіба каваля ўяўляла карціну гл..бокага спакою што ажыўляўся мігцен..ем на со..нцы шыбаў малых вокнаў.

(*Паводле Э. Ажэшкі*)

Падкрэсліце словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс падоўжаных зычных».

**77.** Прачытайце тэкст.

У нас адно паселішча называецца *Церасполле*. Каб патрапіць у Церасполле, трэба перайсці цераз поле. Няцяжка

здагадацца, як утварыліся назвы вёсак *Заполле*, *Загор’е*, *Падгор’е*, *Залессе*, *Падлессе*, *Прылессе*, *Залужжа*, *Падлужжа*, *Зарэчча*, *Надрэчча*, *Прырэчча*.

(*Паводле В. Віткі*)

Пісьмова растлумачце паходжанне трох-чатырох назваў вёсак, пра якія ідзе гаворка ў тэксце.

î Назвы роднага краю

**КРАСНАПОЛЛЕ, ВЯЗЗЕ**



Ворыўны пласт глiназёму стварае чырванаватае адценне на тутэйшых палях, таму і назву такую атрымаў пасёлак на Магілёўшчыне — *Краснаполле*.

Словам *вязь* называюць гразкае, топкае балота. Пра дарогу, якая ідзе па нізіне, кажуць: ажно конь вязне. У такой мясціне і была заснавана вёска *Вяззе*.

(*Паводле У. Юрэвіча*)

Самадыктант

**78.** Спішыце тэкст, афармляючы яго ў адпаведнасці з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі.

АДЗНАКІ ЗА КАНТРОЛЬНУЮ

Грыша якому вучоба давалася без асаблівых ця..касцей меў у св..ім характ..ры адну дрэн..ую рысу. Ён быў упэўн..ны што выдатны.. адзнакі заслужан..а ўпрыгож(?)ваюць тол..кі яго дзён..ік а астатнім вучням яны ставяц..а проста так...

Усё а(д / т)былося ў суб..оту пасля ра(з / с)дачы кантрол..ных па алг..бры. Быц..ам у нас(?)мешку амаль палова клас..а атрымала п..цёркі а Грышу паставілі н..шчас..ную чац(?)вёрку!

П..цёрку атрымаў і Лёня. (Не) хаваючы св..йго ра(з / с)чараван..я Грыша ўзяў (Л / л)ёнеў (с / ш)шытак і нас(?)мешліва ра(з / с)гл..даючы яго голасна (з / с)казаў:

— Цікава выход..іць! Хто (з / с)пісваў у таго п..цёрка...

— А хто ў (табе / цябе) (з / с)пісваў? — ра(з / с)злаваўся Лёня.

Тут ум..шаўся настаўнік і (з / с)пыніў спрэчку.

(*Паводле А. Васілевіч*)

Выканайце самаправерку (*гл. с. 174*).

Дайце ацэнку ўчынку Грышы.

## Тэст 9 для самаправеркі

**А1.** Адзначце словы, у якіх прапушчаны літары:

1) трэц..і
2) даўгалец..е
3) замуж..ам
4) замуж..а
5) тэр..ыторыя

**А2.** Адзначце словы, у якіх пішуцца літары *нн*:

1) насе(н / нн)е
2) на се(н / нн)е
3) то(н / нн)а
4) мадо(н / нн)а
5) Га(н / нн)а

**А3.** Адзначце словы, у якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1) ружжо
2) палесскі
3) Ілліч
4) разводзе
5) каледж

**А4.** Адзначце словы, пры перакладзе якіх з рускай мовы на беларускую захоўваецца падвоенае напісанне літар:

1) ва*нн*а
2) Оде*сс*а
3) а*пп*етит
4) Жа*нн*а
5) програ*мм*а

**В1.** Запішыце назоўнік *гусь* у форме творнага склону адзіночнага ліку.

## Правапіс некаторых спалучэнняў зычных

1. У асобных словах адбылося спрашчэнне груп зычных: гістарычныя спалучэнні *здн*, *згн*, *стн*, *скн*, *стл*, *рдн* вымаўляюцца як [зн], [сн], [сл], [рн], што і адлюстроўваецца на пісьме:

*здн — зн*: *праязны*, *выязны* (параўн.: *прыезд*, *выезд*), *позна*, *спазніцца*, *Познышаў*;

*згн — зн*: *бразнуць* (параўн.: *бразгаць*);

*стн — сн*: *пачэсны* (параўн.: *чэсць*), *скарасны* (параўн.: *скорасць*), *колькасны* (параўн.: *колькасць*), *абласны* (параўн.: *вобласць*), *посны* (параўн.: *пост*); тое ж у запазычаннях: *кантрасны* (параўн.: *кантраст*), *кампосны* (параўн.: *кампост*), *фарпосны* (параўн.: *фарпост*);

*скн — сн*: *бліснуць* (параўн.: *бліскаць*, *бліскавіца*, *бляск*), *пырснуць* (параўн.: *пырскаць*), *пляснуць* (параўн.: *пляскаць*), *трэснуць* (параўн.: *трэскаць*); але: *віскнуць*, *націскны*;

*сцл, стл — сл*: *жаласлівы* (параўн.: *жаласць*), *шчаслівы* (параўн.: *шчасце*), *помслівы* (параўн.: *помста*), *паслаць* (параўн.: *пасцялю*, *пасцель*);

*рдн — рн*: *міласэрны*, *міласэрнасць* (параўн.: *сардэчны*).

2. Спалучэнні зычных *ск*, *ст*, *сц* [с'ц'] на канцы кораня слова могуць чаргавацца з *шч*, што і перадаецца на пісьме: *воск — вашчыць*, *густы — гушчар*, *хрысціць — хрышчоны*; але: *пясчаны*, *пясчынка*, *пясчанік*, *супясчаны*, *супясчанік*.

3. Спалучэнне зычных *дт* на канцы слоў іншамоўнага паходжання перадаецца праз *т*: *Гумбальт*, *Кранштат*, *Шміт*.

**79.** Прачытайце тэкст. Выпішыце з яго словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс некаторых спалучэнняў зычных».

Быў адзін з тых летніх дзён, якія бываюць, мусіць, толькі ў Беларусі. Сонца пячэ неміласэрна, а гарачыні няма:

лішак яе паглынаюць і рака, і зараснікі аеру ды чароту, і непралазны алешнік ды лазняк.

Усім радасна ў такі дзень. Радасна і вунь таму хлапчуку год васьмі, што спускаецца з пясчанага пагорка. Радасць так і пырскае з яго шчаслівых блакітных вачэй. Што адбываецца ў яго маленькім чыстым сэрцы?

(*Паводле Я. Маўра*)

**80.** Запішыце словы, устаўляючы, дзе трэба, літару *д* ці *т*.

Карыс..ны, праяз..ны, неміласэр..ны, svic..нуць, разас..ланы, бязлітас..ны, фарпос..ны, Рэмбран..т, пачэс..ны, кампетэн..ны, няўрымс..лівы, капус..ніца.

📖 Правільнасць маўлення

**ПЯСЧАНЫ – ПЯСОЧНЫ**

**Пясчаны** — пакрыты пяском; з аднаго пяску: *пясчаная выспа*; з вялікай прымессю пяску; у якім шмат пяску: *пясчаная глеба*.



**Пясочны** — які мае адносіны да пяску; з пяску: *пясочны гадзіннік*; шаравата-жоўты, колеру пяску: *паліто пясочнага колеру*; прыгатаваны з сухога, рассыпістага цеста: *пясочнае піроржнае*.

**81.** Запішыце словы па-беларуску.

Кронштадт, поздний, капустный, вощение, милосердный, песчаный, безжалостный, треснутый, сердце, солнце, крещение, счастливец, брусчатый.

**82.** Спішыце сказы, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары.

1. Я паціс..нуў плячыма (*Б. Сачанка*). 2. Калі поз..ні сакавіцкі досвітак сіняватым святлом пачаў разганяць цемру, Павел яшчэ спаў (*Э. Ажэшка*). 3. Юзік пачуў, як браз..нула клямка, а перад самым яго носам шчоўкнула і засаўка (*В. Вітка*). 4. Пад яркім со..нцам у сінім небе радас..на іскрыцца возера (*В. Вольскі*). 5. З кветак ліпы заварваюць чай, ён не толькі карыс..ны, але і лячэбны (*Х. Гурыновіч*). 6. [Дрэва] храс..нула апошні раз і са страшэнным трэскам шас..нула на грэблю (*Я. Майр*). 7. У пакоі стаяў вялікі самаробны стол, зас..ланы белым палатняным абрусам (*Б. Сачанка*). 8. Гэты прарэзлівы, жалас..ны крык прагучаў як скарга (*В. Вольскі*). 9. Між будынкамі валас..нога праўлення і школы пралягала шырокая дарога (*Я. Колас*). 10. Дзе хочаш дастань капусты, а суп капус..ны падай на стол (*Б. Сачанка*).

**83.** Адзначце радкі, у якіх усе словы напісаны правільна.

1) міласэрны, абвесны, страсны, Рэмбрант, роднасны, гладкашэрсны;

2) праязны, Кранштат, хуткасны, кантрастны, аднаместны, жаласлівы;

3) капустны, сэрца, якасны, скарасны, баластны, прадвеснік;

4) карысны, наўмысны, налістнік, прыцісnуць, Гумбальт, наместнік;

5) свіснуць, сонца, наезнік, посны, абласны, хіснуцца.

Запішыце словы, у якіх дапушчаны памылкі, згодна з арфаграфічнымі нормамі.

## Правапіс прыстаўных і ўстаўных літар *в, г*

1. Прыстаўная літара *в* пішацца:

перад націскным *о* ў пачатку слоў: *возера*, *вольха*, *восень*, *вось*, *вокны*, *войкаць*, *ворыва*, *воблака*, *вобласць*, *востраў*,

*Вогненная Зямля*, *Вольга*, у вытворных ад іх словах пасля прыставак: *адворваць*, *павойкаць*, *увосень*; але: *окаць* (і вытворныя ад яго), *одум*. Пры змене месца націску *о* пераходзіць у *а* і прыстаўная *в* у гэтых словах не пішацца: *восень — асенні*, *востраў — астраўны*, *возера — азёрны*, *вокны — акно*;

перад прыстаўкамі *о-*, *об-*, *од-* (*от-*): *вокіс*, *вокісел*, *воклік*, *вокліч*, *вокрык*, *вопіс*, *вобземлю*, *вобыск*, *водгалас*, *водгук*, *воддаль*, *водзыў*, *водпуск*, *водсвет*, *водступ*, а таксама ў словах *навобмацак*, *наводдалек*, *паводле*, *наводшыбе*;

у запазычаных словах: *вохра*, *воцат* і вытворных ад іх: *вохрыць*, *павохрыць*, *воцатнакіслы*;

перад каранёвым *у* ў пачатку слоў: *вугал*, *вуда*, *вугаль*, *вуж*, *вузел*, *вузы*, *вуліца*, *вунь*, *вус*, *вусны*, *вуха*, *вучань*, а таксама ў вытворных ад іх незалежна ад месца націску: *абвуглены*, *каменнавугальны*, *чатырохвугольнік*, *завулак*, *навудзіць*, *вудзільна*, *вузлы*, *вузлаваты*, *вусаты*, *чарнавусы*, *вусач*, *вучыцца*, *навука*, *педвучылішча*, *вушамі*, *завушніцы*, *лапавухі*, *залатавуст*;

перад націскнымі прыстаўкамі *у-*, *уз-* (*ус-*): *вупраж*, *вузгалаўе*, *вусцілка*, *вусціш*, *вусцішна*;

у словах *вока*, *востры*, *вакол* і вытворных ад іх незалежна ад націску: *вочы*, *вачэй*, *уваччу*, *вачаняты*, *завочны*; *вастрыць*, *вастрэйшы*, *вастрыня*; *наваколле*, *ваколіца*; *васпаваты*.

2. Прыстаўная літара *в* не пішацца:

перад пачатковым націскным *о* ў запазычаных словах і некаторых уласных імёнах і назвах: *опера*, *оперны*, *ода*, *офіс*, *Оксфард*, *Ом*, *Орша*;

перад націскным пачатковым *у* ў запазычаных словах і некаторых уласных імёнах і назвах: *ультрафіялетавы*, *унтэр*, *унікум*, *унія*, *урна* (але: *вустрыца*), *Ульяна*, *Уздзенскі раён*, *Урал*, *Узбекістан*, *Украіна*, *Ушачы*;

перад прыставачным *у* і перад *у*, якое паходзіць з *в*: *удвух*, *угнаенне*, *унук*, *учора*, *улада*, *увага*.

3. Устаўная літара *в* пішацца:

перад націскным *о* ў сярэдзіне некаторых слоў: *ніводны*, *Лявон*, *Лявончанка*, *Ларывон*, *Радзівон*, *Радзівонаў*;

перад націскным *у*: *павук*, *цівун*, *каравул*, *есавул*, а таксама ў вытворных ад іх незалежна ад месца націску: *павуцінне*, *цівуном*, *каравульны*, *есавульскі*;

перад *у* ва ўласных імёнах і геаграфічных назвах: *Матэвуш*, *Навум*, *Навумаўка*, *Навуменка*, *Тадэвуш*.

4. Прыстаўная літара *г* пішацца:

у займенніках *гэты*, *гэтакі*, *гэтулькі*; у прыслоўях *гэтак*, *гэтаксама*, *адгэтуль*, *дагэтуль*; у выклічніках *гэй*, *го*, *га*, *гэ*.

**84.** Прачытайце тэкст. Выпішыце з яго словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс прыстаўной і ўстаўной літары *в*».

Бабуля строга наказала ўнуку глядзець як вока ў ілбе куранят, якіх выседзела квахтуха. Хлопчык уважліва каравуліў курыную сямейку, хоць варона, што пасялілася на высокай вольсе, і не думала хапаць куранят. Яе вараняняты, навучыўшыся махаць крылцамі, пачалі самі злятаць на паплавец па той бок вуліцы. Маці вучыла іх, як высочваць у норках мышэй, дзе шукаць жукоў, вусеняў, павукоў. Нават на вуліцу выводзіла, калі паблізу не было ніводнай машыны, і паказвала, што і тут сёе-тое можна знайсці.

(*Паводле В. Віткі*)

• Растлумачце сэнс фразеалагізма *як вока ў ілбе*.

**85.** Выпішыце словы, у якіх ёсць прыстаўная зычная *в* або *г*.

Вузкі, горкі, гэты, вуліца, воля, вогнішча, гушчар, вуглавы, гэтулькі, Ганна, ваенны, ніводнага, гора, вопыт, абвуглены, вастравухі, вулей, вяселле, вустрыца.

**86.** Да слоў з левага слупка падбярыце сінонімы з правага слупка. Запішыце словы парамі, падкрэсліце прыстаўныя і ўстаўныя літары.

| | |
|---|---|
| вугал, вуглякоп, вуголле, навокал, вуда, вузел, вулей, вусны, навобмацак, вучань, вучоны, вуж, востраў, вопыт, водблеск, вогнішча, вобласць, воблік, водгулле, воддаль, водпуск | даследчык, баул, адпачынак, кут, паўзун, дотыкам, рот, спінінг, навыкі, шахцёр, рэха, кругом, прысак, выспа, школьнік, борць, далёка, выгляд, успышка, рэгіён, полымя |

**87.** Запішыце словы, устаўляючы, дзе трэба, літару *в*.

..одблеск, ..огненны, на..учанне, ..устрыца, ..улан, ..упарты, ..узнагарода, ..убор, ..опера, ..уклад, ..окісны, ..ольха, ..угор, ..ордар, ..угаль, ..образ, ..утопія, ..узброіць, ..опратка, ..астраслоўе, ..обласць, ..улада, ..офіс, ..ураган, ..остраў, ..одпуск, ..опытны, ..оканне, ..узрост, ..удзільна, ..астрэйшы, ..аколіца, ..ушанка.

Правільнасць маўлення

**ВУЖ – ВУЖАКА**



**Вуж** – адна з неядавітых змей сямейства паўзуноў: *шэры вуж*.

**Вужака** – 1) агульная назва паўзуноў з доўгім гнуткім целам без ног; змяя: *паўзе вужака*; 2) ліхі, каварны чалавек: *Ну ты і вужака!*

**88.** Запішыце словы па-беларуску.

Заочный, остроносый, уж, паук, Ульяна, осенний, осень, история, внук, этот, озеро, урна, ойкать, угловой, участок,

заострить, ультразвук, уникальный, облако, оптом, окрик, Родион, Ольга, Орша, Узда, Огненная Земля, Анна, эй.

î Назвы роднага краю

**ОРША**

Першае ўпамінанне пра горад Оршу адносіцца да 1067 года. На працягу чатырох стагоддзяў значыўся як «горад на Ршы» — на рацэ *Ршы*, або *Ржы* (рацэ з іржавай вадой). Назва *на Ршы* ператварылася ў *Оршы*, затым у *Оршу*. А рэчка стала называцца *Оршыцай*.

(*Паводле У. Юрэвіча*)



**89.** Выберыце правільны варыянт, запішыце яго.

Орган — ворган, азярцо — вазярцо, наогул — навогул, наушнікі — навушнікі, усаты — вусаты, оптам — воптам, універсам — вуніверсам, обласць — вобласць, угаль — вугаль, астраносы — вастраносы, огненны — вогненны, урна — вурна.

**90.** Спішыце сказы, устаўляючы, дзе трэба, літару *в*.

1. Калі ўсходзіцца вецер, ад ..озера плыве роўны шум і відаць праз ..акно, як пакрытыя пенаю хвалі падымаюць угору і зноў кідаюць уніз рыбацкія лодкі (*Я. Баршчэўскі*). 2. Доўгія ..усы рабілі твар суровым і жарсткаватым (*У. Караткевіч*). 3. Крыху ..оддаль ад паляны, пад старымі змрочнымі ялінамі, уся зямля ..ускапана (*В. Вольскі*). 4. Усе пні былі за..астраныя, нібы калы (*Я. Маўр*). 5. Неяк непрыкметна і хутка зацягнула неба высокая лёгкая ..облачнасць (*І. Шамякін*). 6. На..огул я чалавек цярплівы (*У. Дубоўка*). 7. Па ўсёй ..аколіцы разнеслася пагалоска, што Сямён — чараўнік (*Я. Баршчэўскі*). 8. Серабрылася на чырвоных клёнах

па..уцінне, ціха, без шораху, ападалі лісты з бяроз (*М. Лынькоў*). 9. У Нарачы самцоў ..угра няма, адны толькі самкі. Самцы трымаюцца ў ..усці Нёмана (*В. Вольскі*). 10. Рахманыя ..очы ..остра з..узіліся (*У. Караткевіч*).

**91.** Выпішыце з тэксту словы з прыстаўнымі літарамі, устаўляючы іх, дзе трэба.

### СЯРОЖАВЫ БАРАВІЧКІ

Маці нажом здзірае са слоіка прысохлую накрыўку, і першыя баравічкі, малюпасенькія, крамяна-жоўтыя, плывуць са слоіка ў Сярожаву талерку. Да пахаў сырадою, свежай бульбы, жытняга хлеба далучаюцца пахі лаўровага лісту, гваздзікі, перцу, і ўжо Валодзя, глыбакадумна ўцягваючы носам ..вострую грыбную духмянасць, з замілаванай ..усмешкай цікуе на брата:

— Добрых грыбоў сёлета і не было. Сухмень стаяла. Адзін Сярожа немаведама дзе панавыпорваў.

— Дзе-дзе, пад ..мхом, — ганарыста кідае малы.

— Там няма ..моху, дзе ты збіраў, — кажа Валодзя, сухімі ..веснамі цягнучыся да лыжкі з грыбамі.

Гаворка за сталом паступова гасне. У прачыненае ..акно чуваць рэдкія галасы вячэрняй ..уліцы.

(*В. Карамазаў*)

**92.** Спішыце, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары. Падкрэсліце словы з прыстаўнымі і ўстаўнымі зычнымі, вусна растлумачце іх правапіс.

Млела і песцілася пад скупымі промнямі ..восені бабіна лета, з цікаўнасц..ю загляд..ваючы ў ..вокны новай хаты ..удавы Варвары.

— Лепей бы куст пі..оні пасадзіла, — жартавалі мужчыны, не прамінаючы кінуць заўвагу наконт Варварынага агаро..чыка.

— Пі..оня ..спыхнула і патухла, а бабіна лета да самых мар..зоў грэе, — см..ецца чарна..окая ..удава. І сапраўды, ці то ад цвету ..этага бледна-ружовага, ці то ад смеху ..удовінага, іскрыстага, звонкага, ц..плей робіцца на сэр..цы.

(*Паводле А. Васілевіч*)

### Мова і нацыянальная культура

**93.** Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі. Устаўце ў тэкст патрэбныя народныя параўнанні.

НАРОДНЫЯ ПАРАЎНАННІ

Тонкая наз..ральнасць б..ларусаў пра..ўляецца ў параўнаннях, у якіх сканц..нтраваны жыц..ёвы (?)опыт народ.., іскрыц..а дасціпны гумар. Відаць, з вус(?)наў пастуха нарадзілася параўнанне «...». Толькі дбайная гаспадыня, якая клапатліва гадуе сваё пта(?)ства, магла ўп..ршыню сказаць: «...».

У параўнаннях зна(?)шлі а(д / т)бітак і (?)образы язычні..кай д..маналогіі («...»), і культ про..каў («...»), і хр..сці..нскае (?)учэнне аб збавенні душы («...»), і (?)історыя народ.. («...»).

У асобных параўнаннях, як у міні..цюрах, намаляваны карціны побыт.. старой вёскі. У выслоўі «...» названы харак(тэ / це)рны спосаб ра(з / с)кладання снапоў на таку для мала..ьбы цэпам. У параўнанні «...» згад(?)ваецца радас(?)нае св..ткаван..е заканчэн..я жніва. Пра б..ларускі валачобны абра.. гаворыць параўнанне «...». У выслоўі «...» для параўнання выкарыстаны абавя..ковы пр..дмет старога с..лянскага побыт.. — прылада для пален..я лучыны.

(*Паводле М. Грынблата*)

Для даведкі: добра як на дажынках; вылупіў вочы як баран на воўка; дзяцей як снапоў у пасадзе (*многа*);

растрапаны валасы як у лоўмы (*лоўма* — злая істота, чарціха); добра як у раі; бродзіць па хатах як старац на Вялікдзень; далікатны як куранятка; стаіць як лучнік пасярод хаты; страў як на Дзяды; ідуць як на паншчыну.

Падкрэсліце словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс прыстаўных зычных».

• Растлумачце адсутнасць коскі перад злучнікам *як* у параўнаннях.

• Прывядзіце ўласныя прыклады параўнанняў, у якіх знайшлі адбітак асаблівасці народнага побыту.

### Тэст 10 для самаправеркі

**А1.** Адзначце словы з прыстаўной літарай *в*:
1) вулкан
2) вокны
3) воўчы
4) вулей
5) воблік

**А2.** Адзначце словы, у якіх прапушчана першая літара:
1) ..обмацкам
2) ..азёры
3) ..огнішча
4) ..оксфардскі
5) ..оперны

**А3.** Адзначце словы, у якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:
1) вусны
2) васенні
3) оканне
4) навушнік
5) узельчык

**А4.** Адзначце словы, пры перакладзе якіх з рускай мовы на беларускую з'яўляецца прыстаўны ці ўстаўны зычны:
1) охра
2) есаул
3) Узда
4) заострить
5) униформа

**В1.** Які горад з'яўляецца цэнтрам Аршанскага раёна Віцебскай вобласці?

## Правапіс літар *у*, *ў*

1. Літара *у* (*у* складовае) абазначае галосны гук [у] і пішацца:

у пачатку сказа, пасля знакаў прыпынку і пасля зычных: *У ціхім шолаху развяваліся сцягі, асветленыя сонцам, ярка блішчалі і звінелі медалі. Яны, мусіць, усё ж не звінелі, але яму гэтага хацелася, і ён, здаецца, чуў іхні звон* (Я.Сіпакоў);

у пачатку ўласных назваў: *каля Узды*, *Галіна Уланава*, *ва Узбекістане*;

у запазычаных словах, якія заканчваюцца на *-ум*, *-ус*: *прэзідыум*, *радыус*, *страус*, *соус* і вытворных ад іх;

у словах з націскным *у*: *аул*, *баул*, *Брэсцкая унія*, *каля урны*, *прывезлі унты*, *пачулася уханне*;

на канцы запазычаных слоў не пад націскам: *фрау*, *Шоу*, *Каратау*, *ток-шоу*, *ноу-хау*.

2. Літара *ў* (*у* нескладовае) абазначае зычны гук [ў] і пішацца:

пасля галосных у пачатку слова: *на ўкраінскай мове*, *сонца ўзышло, на ўзлеску, ва ўніверсітэце*, *царква ўніяцкая*, *метады ўніверсальныя*;

у сярэдзіне слова пасля галосных перад зычнымі: *аўдыторыя*, *паўза*, *маўзалей*, *лаўрэат*, *саўна*, *фаўна*, *маўзер*, *джоўль*, *маўр*, *аўра*, *раўнд*;

пры чаргаванні [л] з [ў]: *чытаў, думаў, спяваў, воўк, шоўк, шаўковы, поўны, паўметра, шчоўкнуць, моўчкі*; але: *палка, памылка, сеялка, Алжыр, Валдай, Балгарыя, Албанія*;

пры чаргаванні [в] з [ў]: *лаўка* (*лава*), *аўса* (*авёс*), *бацькаў* (*бацькавы*), *любоў* (*любові*), *кроў* (*крыві*), *аўторак*, *Аўстрыя*, *Аўстралія*, *Каўказ*; але: *ва В'етнаме*, *на рацэ Влтава*;

пасля злучка ці двукосся, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосны: *хлопцы-ўмельцы*, *паўночна-ўсходні*, *у «Выбранае» ўвайшлі*, *гучнае «ўра»*.

### Мова і нацыянальная культура

**94.** Прачытайце тэкст. Выпішыце з яго словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс літар *у*, *ў*».

МУЗЕЙ-ПАРК

На былым балоце на ўскраіне Мінска, ва Уруччы, пад *адкрытым* небам сабраны з усіх *рэгіёнаў* Беларусі аж 2134 ледавіковыя валуны.

Ідэя стварэння музея і яе *ажыццяўленне* належыць выдатнаму беларускаму вучонаму, доктару геолага-мінералагічных *навук*, *акадэміку* Гаўрылу Гарэцкаму. Ён, убачыўшы, што ўнікальных гістарычных камянёў на нашай зямлі становіцца ўсё меней, прыклаў шмат намаганняў, каб захаваць тое, што засталося.

Музей-парк быў сплanаваны на *мясцовасці* як карта Беларусі: насыпныя пагоркі — нашы грады і ўзвышшы, пешаходныя дарожкі — нашы рэкі, штучныя вадаёмы — нашы азёры.

(*Паводле Я. Сіпакова*)

Назавіце арфаграмы ў выдзеленых словах.

**95.** Выберыце правільны варыянт, запішыце яго.

Радыус — радыўс, пауза — паўза, фрау — фраў, да Усяслава — да Ўсяслава, страус — страўс, аул — аўл, беларуска-украінскі — беларуска-ўкраінскі, фауна — фаўна, аукцыён — аўкцыён, накаут — накаўт, паўднёва-усходні — паўднёва-ўсходні.

**96.** Запішыце беларускія народныя параўнанні, злучыўшы пачатак і канец выслоўяў. Раскрыйце дужкі.

| | | |
|---|---|---|
| надзьму(у / ў)ся | **ЯК** | аса (у / ў) вочы |
| трапі(у / ў) | | (у / ў)юн на гарачай патэльні |
| спіць | | во(у / ў)к у піліпа(у / ў)ку |
| круціцца | | мыш на крупы |
| баіцца | | воцату выпі(у / ў)шы |
| бегае | | во(у / ў)к ягняці |
| вые | | лісіца (у / ў) саладуху |
| лезе | | лапцем па балоце плясну(у / ў) |
| ляпну(у / ў) | | з вуглямі (у / ў) нагавіцах |
| ма(у / ў)чыць | | пшаніцу прада(у / ў)шы |

**97.** Спішыце, устаўляючы *у* ці *ў*.

Ка..нер, красёнцы-ча..начкі, прэзіды..м, аквары..м, бра..нінг, со..с, ва ..ніверсітэце, рака ..шача, да ..краіны, Вольга ..ладзіміра..на, Сарока ..ладзя, па-..чарашняму, па..за, дыназа..р, па..днёва-..сходні, ла..рэат, ваку..м, а..дыторыя.

î Назвы роднага краю

**УБАРЦЬ, УША**

*Убарць* — прыток Прыпяці — Дняпра. Па берагах ракі некалі на дрэвах віселі вуллі-борці, у якія пчолы насілі мёд. Потым яго даставалі гаспадары гэтых вулляў, бортнікі.



*Уша* — прытокі Віліі — Нёмана і Бярэзіны — Дняпра. Некалі рака называлася *Ужа*, таму што каля яе пладзіліся вужы.

(*Паводле У. Юрэвіча*)

**98.** Выпішыце спачатку словы, у якіх пішацца *у*, а затым — *ў*.

Каля ..барці, ма..клівы, маці-..краінка, Брэсцкая ..нія, а..кцыён, га..птвахта, прэзіды..м, стра..с, са..на, па..годдзе, ня..мелы, вельмі ..важлівы, Вера ..льянаўна, жыць ва ..руччы, гучнае «..ра», ва ..нісон, жанчына-..рач, да ..севалада, часопіс «Бярозка» ..знагародзіў удзельніка.. конкурсу, ла..рэат, прысло..е «..ніз», каля ..ладзівастока, ма..залей, астрана..т, сімпозі..м, а..тастрада, каля ..ніверсальнага магазіна, кантрольна-..ліковы, за..вага, фа..на, гэта ..топія, мане..р, ба..л.

**99.** Спішыце сказы, устаўляючы замест кропак *у* ці *ў*, растлумачце іх правапіс.

1. Наш тры..мф у яднанні (*У. Караткевіч*). 2. Нячутны гук, які навука называе ..льтрагукам, адбіваецца ад насякомага, што пралятае паблізу, трапляе .. вуха кажана і падказвае яму і напрамак, і адлегласць, на якой знаходзіцца здабыча (*У. Ляўданскі*). 3. Дзясяткі хвароб лечаць брусніцы як пладамі, так і лісцем: гастрыт, рэ..матызм, падагру, язву стра..ніка... (*Х. Гурыновіч*). 4. Францыск Скарына паказа.. прыклад незвычайнай настойлівасці і працавітасці, творчай смеласці і духо..най сілы, калі закладва.. глыбокі падмурак кнігадрукавання ва ..сходняй Е..ропе, калі самаадданa працава.. над перакладам і выданнем шматлікіх кніг на роднай мове (*В. Чамярыцкі*). 5. Разма..лялі ва ..ніверсітэце на латыні (*А. Клышка*). 6. Калегі..мы давалі адукацыю, ..зровень якой мала адрозніва..ся ад ..ніверсітэцкай (*У. Арлоў*).

### Мова і нацыянальная культура

**100.** Спішыце тэкст, афармляючы яго ў адпаведнасці з арфаграфічнымі нормамі.

СТВАРАЛЬНІК УНІІ

Адам Пацей з юна..кіх гадо.. вызнача..ся высокай адукаванас(?)цю. Ён служы.. в..лікаму князю Жыгімонту А..гус-

ту, меў шмат абавя(з / с)ка.. . Але пас(?)ля с(?)мерці жонкі засмуці..ся Адам, ра(з / с)да.. маёмас(?)ць люд..ям, адмові..ся ад высокіх паса(д / т). Нават імя (з / с)мяні.. : бы.. Адамам, ста.. Іпаціем. Зрабі..ся Іпацій манахам, затым ста.. епіскапам Брэс..кім і (У / Ў)лад..імірскім.

Неяк задума..ся Пацей, чаму няма ад..інства паміж хрысці..намі. Паехалі правасла..ныя епіскапы да Папы Рымскага. Пачалі пр..сіць аб..яднаць хрысці..н — стварыць ..нію.

Восен..ю 1596 года была абве(с / ш)чана Брэс..кая царко..ная ..нія. Іпацій Пацей і іншыя ..ніяты чакалі, што цяпер наступіць мір у Беларусі і (У / Ў)краіне. Але памыліліся: вайна паміж хрысці..нскімі галінамі ра(з / с)гарэлася яшчэ бол..ш.

(*Паводле А. Бензерука*)

Растлумачце правапіс літар *у*, *ў*.

### Арфаграфія і лексікалогія

**101.** Запішыце словы, якія адпавядаюць наступным лексічным значэнням.

1. Нарада ўрачоў для вызначэння характару захворвання і спосабаў яго лячэння. 2. Пышнае сцэнічнае відовішча з удзелам майстроў эстрады, цырка і інш. 3. Памяшканне, прызначанае для чытання лекцый, дакладаў. 4. Падарожны куфэрак круглаватай формы. 5. Прыправа, падліва для стравы. 6. Трохмінутны перыяд у боксе, на працягу якога вядзецца бой. 7. Сукупнасць усіх відаў жывёл якой-небудзь тэрыторыі або геалагічнага перыяду. 8. Конны пастух у стэпах Паўночнай Амерыкі. 9. Паселішча ў Сярэдняй Азіі і на Паўночным Каўказе. 10. Становішча ў спартыўных гульнях, калі мяч або шайба выходзіць за межы спартыўнай пляцоўкі.

Для даведкі: со(у / ў)с, а(у / ў)т, ка(у / ў)бой, а(у / ў)дыторыя, фа(у / ў)на, кансілі(у / ў)м, ра(у / ў)нд, ба(у / ў)л, а(у / ў)л, шо(у / ў).

## Тэст 11 для самаправеркі

**А1.** Адзначце словы, у якіх прапушчана літара *у*:

1) да ..рача
2) рады..с
3) ка..чук
4) беларуска-..краінскі
5) шо..

**А2.** Адзначце выпадкі, у якіх прапушчана літара *ў*:

1) фа..на
2) са..дат
3) слова «..поперак»
4) а..тограф
5) вуліца ..барэвіча

**А3.** Адзначце выпадкі, у якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1) фраў
2) Кавказ
3) сімпозіум
4) да Уладзіслава
5) вялікая ўрна

**А4.** Адзначце словы, пры перакладзе якіх з рускай мовы на беларускую адбываецца пераход *л* у *ў*:

1) Во*л*га
2) по*л*тысячи
3) шё*л*к
4) ко*л*хоз
5) ко*л*баса

**В1.** Як называецца буйная афрыканская птушка атрада бегуноў з прыгожым апярэннем?

# ПРАВАПІС МЯККАГА ЗНАКА І АПОСТРАФА

## Змякчальны мяккі знак як сродак абазначэння мяккасці папярэдняга зычнага

1. Мяккі знак пішацца пасля зычных *з*, *л*, *н*, *с*, *ц* (з мяккага *т*), *дз* (з мяккага *д*):

для абазначэння на пісьме мяккасці зычнага на канцы слова: *мядзведзь*, *мазь*, *соль*, *рунь*, *вучань*, *гусь*, *вось*, *штось*, *памяць*, *думаць*, *дзевяць*, *вішань*;

для абазначэння на пісьме мяккасці зычнага перад цвёрдым, а таксама перад мяккім зычным, які пры змене слова можа чаргавацца з цвёрдым: *рэдзька*, *барацьба*, *пісьменнік — пісьмо*, *на касьбе — касьба*, *дзьме — дзьмуць*;

пасля мяккага [л’] перад цвёрдым або мяккім зычным, за выключэннем падоўжанага [л’]: *бульба*, *вельмі*, *столькі*, *пальцы*, *больш* (але: *галлё*, *вяселле*);

2. Мяккі знак пішацца ў некаторых граматычных формах:

у дзеясловах загаднага ладу перад канчаткам 1-й асобы множнага ліку -*ма*, перад канчаткам 2-й асобы множнага ліку -*це*, перад постфіксам -*ся*: *кіньма*, *станьма*, *гляньма*; *гляньце*, *станьце*; *кінься*, *агледзься*, *застанься*;

у назоўніках перад канчаткам творнага склону множнага ліку -*мі*: *людзьмі*, *слязьмі*, *коньмі*;

у складаных лічэбніках *пяцьдзясят*, *шэсцьдзясят*, *шэсцьсот*, *дзевяцьсот*;

у прыслоўі *ледзьве* (як і ў слове *ледзь*);

у постфіксе -*сьці*: *хтосьці*, *штосьці*, *камусьці*, *дзесьці*, *чамусьці*.

перад суфіксам *-ск-* у прыметніках, утвораных ад назваў месяцаў на *-нь* і ад слова *восень*: *жнівень — жнівеньскі*, *восень — восеньскі*;

перад суфіксам *-чык*, калі слова без гэтага суфікса заканчваецца на мяккі знак: *камень — каменьчык*, *рэмень — раменьчык*, *агонь — агеньчык*;

у суфіксах прыметнікаў *-аньк-*, *-еньк-*, *-эньк-*: *малюсенькі*, *добранькі*, *прыгожанькі*, *старэнькі*, *маленькі*;

перад суфіксам *-к-* пасля мяккага [н’]: *вішанька*, *банька*, *песенька*;

3. Мяккі знак не пішацца:

пасля зацвярдзелых зычных, а таксама пасля губных *б*, *в*, *м*, *п*, *ф*: *нож*, *дождж*, *мыш*, *печ*, *купец*, *голуб*, *верф*, *насып*, *цар*, *сем*, *стэп*;

пасля мяккіх зычных *з*, *с*, *ц*, *дз* перад мяккімі, калі пры змене слова абодва зычныя застаюцца мяккімі або становяцца цвёрдымі: *звер — звяры*, *песня — песню*, *дзве — два*, *збіраць — зборы*, *дзверы — дзвярэй*;

паміж падоўжанымі зычнымі: *калоссе*, *стагоддзе*, *сумленне*, *голле*;

перад суфіксам *-ск-* у прыметніках, утвораных ад назоўнікаў на *-нь*, калі гэтыя назоўнікі не з’яўляюцца назвамі месяцаў: *конь — конскі*, *Разань — разанскі*, *Любань — любанскі* (але: *Чэрвеньскі раён*), *Цянь-Шань — цянь-шанскі*.

**102.** Прачытайце тэкст. Выпішыце з яго словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс змякчальнага мяккага знака».

За нашай вёскай былі калісьці ляскі, якія потым чамусьці высеклі. І паміж шэранькіх пянькоў буяла трава з *духмянасцю* кветак і звонам пчол.

З тых дзён мне з асаблівай *выразнасцю* помняцца маленькія блакітныя матылькі, якіх мы лавілі сачкамі для

школьнай калекцыі. А яшчэ больш — для *радасці*. Як аказалася — на ўсё *жыццё*.

(*Паводле Я. Брыля*)

Растлумачце адсутнасць мяккага знака ў выдзеленых словах.

î Назвы роднага краю

**ВІЦЬБА, ЯСЕЛЬДА**

*Віцьба* — прыток Заходняй Дзвіны. Назва ракі паходзіць ад слова *віць*, што ў старaславянскай мове азначала вільготную, волкую мясціну, твань.



*Ясельда* — прыток Прыпяці — Дняпра. У аснове назвы славянскае слова *яслі* — кармушка для свойскай жывёлы, куды закладваюць сена. Паплавы ўздоўж Ясельды даюць шмат сена, якое можна закладаць праз усю зіму ў яслі.

(*Паводле У. Юрэвіча*)

**103.** Вызначце, як абазначана мяккасць зычных у прыведзеных словах. Падкрэсліце зычныя, мяккасць якіх на пісьме не перадаецца.

Віцьба, далячынь, насенне, смех, цясляр, некалькі, нацыянальны, вільгаць, гляньце, наўцёкі, разбіць, возьмеш, дзверы, мітусня, чацвёрты, дзевяцьсот, жнівеньскі, восем, зацвісці, пасля, забудзьце, старасць, дзесьці, грудзьмі, ляснік, счарсцвець, малацьба, каменне, унікальны, разьбяр, даражэнькі, сцяблінкі, скрозь.

**104.** Утварыце ад прыведзеных дзеясловаў формы 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку загаднага ладу, запішыце іх.

Забрудзіць, кінуць, сустрэць, глянуць, глядзець, звесіць, злазіць, сядзець, стаяць, застацца, прыгледзецца, агледзецца, намыліцца, замазаць.

**105.** Утварыце і запішыце ад назоўнікаў прыметнікі з дапамогай суфікса -*ск*-.

Верасень, снежань, чэрвень, конь, Казань, Любань, Лепель, Капыль, Хатынь, Смаргонь, Астрахань, Фаніпаль, Разань, Чэрвень, Цюмень, Мядзел.

Правільнасць маўлення

**ЧЫТАЛЬНЫ – ЧЫТАЦКІ –**
**ЧЫТАЛЬНІЦКІ – ЧЫТЭЛЬНЫ – ЧЫТАБЕЛЬНЫ**

**Чытальны** — прызначаны для чытання, заняткаў з кнігамі, часопісамі: *чытальная зала.*

**Чытацкі** — які мае адносіны да чытача: *чытацкі білет.*



**Чытальніцкі** — які мае адносіны да чытальніка, дэкламатара: *чытальніцкія здольнасці.*

**Чытэльны, чытабельны** — які лёгка чытаецца, выразны: *чытэльны* (*чытабельны*) *почырк.*

**106.** Запішыце словы. Устаўце, дзе трэба, мяккі знак.

З..бірал..нік, дзевяц..сот, дз..ве, дз..ме, рэдз..ка, дз..весце, піс..мовы, пас..пешлівас..ц.., радас..цю, камен..чык, стан..це, вішан..ка, ледз..ве, камус..ці, растрэс..ці, любан..скі, восен..скі, барац..біт, чытал..ны, сляз..мі, дз..веры, карэн..не, карэн..чык, прыгожан..кі, свежас..цьб, завез..ці, людз..мі, застан..ся, прыгледз..ся, ц..віс..ці, мен..шы, мядз..ведзь, сем.., чац..вер, уз..нес..ціся.

**107.** Спішыце сказы, устаўляючы, дзе трэба, мяккі знак.

1. Заяц прабег з пару соцен.. метраў па полі і непрыкметна прылёг у зялёнай азіміне, стаіўся (*Р. Ігнаценка*). 2. Калі

ідзе дождж, да шыбін прыліпаюц.. буйныя серабрыстыя кроплі, зліваючыся затым у тонен..кія струмен..чыкі (*І. Навуменка*). 3. У гэты момант з-за шэрага кустоўя чырвоным колам выкацілася жнівен..скае сонца (*Р. Ігнаценка*). 4. Дз..ве с..вечкі адбіваліся ў вадзе і ц..мяным люстэрку (*У. Караткевіч*). 5. Сонечныя прамен..чыкі, вырваўшыся з палону паднябес..ся, здавалася, наскроз.. пранізвалі траву... (*А. Карлюкевіч*). 6. Яркай чырван..ню запалілася на захадзе восен..скае неба (*Р. Ігнаценка*). 7. Мен..шыя дзеці, вол..ныя ад хатніх работ, напаўнялі класы сваімі звонкімі галасамі (*Я. Колас*). 8. Увогуле ўзаемаадносіны паміж людз..мі на заводзе яму падабаліся (*І. Шамякін*).

**108.** Прачытайце тэкст. Выпішыце словы са змякчальным мяккім знакам, вусна растлумачце іх правапіс.

У снежан(?)скім лесе было вел(?)мі ціха. Хіба дзес(?)ці ў арэшніку нечакана неспакойная кедроўка закрычыц(?) ал(?)бо цін(?)кне нябачная сініца.

У адным месцы дзядз(?)ка Пракоп прысеў на кукішкі і чамус(?)ці ў моху поркаецца. Я нахіліўся і выцягнуў з сырога моху грыб з белен(?)кай ножкай. Гэта была радоўка асенняя. Я націснуў пал(?)цамі на карэн(?)чык. З яго тонен(?)кім струмен(?)чыкам пабегла халодная вадкасц(?), якая пахла с(?)негам. Шапачка грыба таксама моцна набыняла віл(?)гаццю.

(*Паводле Р. Ігнаценкі*)

## Правапіс раздзяляльнага мяккага знака і апострафа

1. Раздзяляльны мяккі знак пішацца пасля зычных *з*, *л*, *н*, *с*, *ц* (з мяккага *т*), *дз* (з мяккага *д*) і непрыставачнага *н* перад галоснымі *е*, *ё*, *ю*, *я*, *і*:

у словах іншамоўнага паходжання: *калье*, *медальён*, *канферансье*, *каньён*, *мільярд*, *рэльеф*, *парцьера*, *мільён*, *Лавуазье*; але: *булён*;

ва ўласных імёнах, утвораных ад імёнаў на *-ій* (*-ый*), перад суфіксальным *-еў-* (*-ев-*): *Савельеў*, *Савельевіч*, *Васільеў*, *Васільевіч*, *Арсеньеў*, *Арсеньевіч*, *Лаўрэнцьеў*, *Лаўрэнцьевіч*, *Анатольевіч*; пасля *г*, *к*, *х* і збегу зычных, акрамя *нц*, перад суфіксальным *-еў-* (*-ев-*) пішацца *і* (*ы*): *Георгіеў*, *Іраклііевіч*, *Ануфрыевіч*, *Дзмітрыеў* (але: *Вікенцьевіч*, *Лаўрэнцьеў*, *Лаўрэнцьевіч*, *Кліменцьевіч* і інш.);

у словах *Ілья*, *Ульяна*, *Касьян*, *Емяльян*, *Юльян*, *Юльяна* і вытворных ад іх: *Ільін*, *Ільіч*, *Ульянаў*, *Ульянаўск*, *ульянаўскі*, *Касьянавіч*, *Емяльянавіч* і інш.;

у словах, утвораных ад дзеяслова *ліць*: *налью*, *разалью*, *падалье*, *недалье*.

2. Апостраф пішацца перад галоснымі *е*, *ё*, *ю*, *я* і націскным *і*:

пасля прыставак, якія заканчваюцца на зычную: *аб'езд*, *пад'ехаць*, *аб'яднанне*, *раз'юшаны*, *аб'ява*, *аб'інець*, *з'едлівы*;

у сярэдзіне слова пасля зычных, акрамя *з*, *л*, *н*, *с*, *ц* (з мяккага *т*), *дз* (з мяккага *д*): *аб'ём*, *вераб'і*, *куп'істы*, *інтэрв'ю*, *п'еса*, *надвор'е*, *п'е*, *сям'я*, *бар'ер*, *Дзям'ян*, *Лук'янаў*, *Грыгор'еў*, *Пракоф'еў*, *В'етнам*, *Мар'іна Горка*;

у складаных словах пасля частак *двух-*, *трох-*, *чатырох-*, *шмат-*: *двух'ярусны*, *трох'ярусны*, *чатырох'ярусны*, *шмат'ёмісты*.

Апостраф не пішацца:

пасля *ў* (*у* нескладовага) перад літарамі *е*, *ё*, *ю*, *я*, *і*: *здароўе*, *салаўі*, *разнатраўе*, *праваслаўе*, *прыслоўе*, *любоўю*;

у складаных і складанаскарочаных словах на мяжы састаўных частак, у тым ліку калі іх часткі пішуцца праз злучок: *цэхячэйка*, *дзяржюрвыдавецтва*, *трэд-юніёны*.

**109.** Выпішыце спачатку словы, у якіх мяккі знак абазначае мяккасць зычных, а затым — словы з раздзяляльным мяккім знакам.

Заквітнець, кампаньён, кудысьці, медальён, касьба, пяцьдзясят, налью, мільярд, Вольга Васільеўна, Ілья Аркадзьевіч, Марэсьеў, грабеньчык, кінафільм, будзьце, дзядзька, каваль, канферансье, цырульня, шыльда, крыштальны.

**110.** Запішыце да слоў беларускія адпаведнікі, растлумачце правапіс.

Бильярд, объект, Нарочь, надпись, полынь, верфь, серьёзный, семья, пятьюдесятью семью, июльский, Григорьева, Кондратьев, Вьетнам, Ульянович, Арсеньев, соловьи, ведешь, пьеса, семьсот, колье, объезд, курьер, почтальон, Васильев, рельеф, сольфеджио, Сибирью, песенка, Двина, воробьи, миллиард.

**111.** Спішыце, устаўляючы апостраф або мяккі знак.

Бар..ер, інтэрв..ю, біл..ярд, раз..ехацца, разаб..ю, нал..ю, ад..езд, раз..юшаны, аб..ява, парц..еры, мадз..яр, рэл..еф, куп..істы, двух..ярусны, батал..ён, прэм..ер, в..етнамец, падз..муць, бракан..ер, Ул..яна, павіл..ён, аб..ездзіць, грыл..яж.

**112.** Спішыце сказы. Устаўце, дзе трэба, мяккі знак ці апостраф.

1. Няшчас..це здарылася на трэці дзен.. пас..ля Дашынага ад..езду (*А. Васілевіч*). 2. Прыйшла старая бабул..ка з сям..і, у якой было проз..вішча Звяругі, але дзе былі ледз..ве не самыя лепшыя людзі ва ўсім мястэчку (*У. Дубоўка*). 3. Пайшлі студэнты, а Пётр Іл..іч чамус..ці доўга не мог заснуць (*М. Гіль*). 4. Браты, як звар..яцелыя, тузаліся ля дз..вярэй. Ул..яна, заліваючыся сляз..мі, крычала, ламала рукі і спрабавала іх раз..няць (*Э. Ажэшка*). 5. Улетку гэты

шчупак парваў сетку ў аднаго бракан..ера, які лавіў уначы рыбу ў возеры (*Р. Ігнаценка*). 6. Раз..юшаны кон.. заўважыў новага ворага, стралою кінуўся да яго і ўскінуў у паветра страшныя пярэднія капыты (*У. Караткевіч*). 7. Ты, пэўна ж, бачыў у бабул..чынай аптэчцы цёмныя бутэлечкі з валяр..янкай (*Х. Гурыновіч*).

î Назвы роднага краю

**ПАДБУР'Е, АБАБ'Е**

Назва *Падбур'е* азначае, што паселішча было заснавана непадалёку ад сасновага бору (у мясцовым вымаўленні — *буру*).

(*Паводле В. Лемцюговай*)



*Абаб'е* — возера ў Браслаўскім раёне. Назва паходзіць ад грыба падбярозавіка, які тут называюць *абабкам*. Па берагах возера ў бярэзніках яны і растуць.

*(Паводле У. Юрэвіча)*

**113.** Устанавіце адпаведнасць паміж рускімі і беларускімі прыказкамі. Растлумачце іх сэнс.

а) Голодному Федоту и пустые щи в охоту.
б) Хвастала овца, что у нее хвост, как у жеребца.
в) Обжегшись на молоке, будешь дуть и на воду.
г) Глаза видали, что покупали.
д) В ногах правды нет.

1) Хвалілася рэдз..ка, што з мёдам смачная.
2) Сядз..ма на калодзе, пагаворым аб прыгодзе.
3) Апарыўся на капус..це ў гаршку, то і на гародзе дз..мухаў.
4) Быў кон.., ды з..езджаны, быў хлеб, ды з..едзены.
5) У вераб..я багатая сям..я: у кожнага верабейкі па тры капейкі.
6) З гора, з бяды пад..еў лебяды.

е) Богат Ермошка: завел кота да кошку.
ж) Был конь, да изъездился.

7) Бачылі вочы, што бралі, а цяпер плач..це, хоць павылаз..це.

Запішыце беларускія прыказкі, устаўляючы, дзе трэба, мяккі знак ці апостраф.

### Самадыктант

**114.** Спішыце тэкст, афармляючы яго ў адпаведнасці з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі.

КЛЁН

Д..якуючы сало..каму соку клён стаў нацы..нал(?)ным сімвалам Канады. Яго пунсовы ліст а(д / т)люстраваны на с(?)цягу гэтай дз..ржавы. (З / с) п..ці тыс..ч эскізаў кана..цы выбралі кл..новы ліст. Канада краіна цукр..вых клёнаў. Што(?)год з іх з(?)біраюц(?) каля ч..тырох міл(?)ёнаў кілаграм..аў цукру. Кл..новая гаспадарка ў гэтай краіне з(?)яўляецца сур(?)ёзнай галіной прамысловас(?)ці.

Клён не тол(?)кі «сало..кае» але і «с(?)пеўнае» дрэва. З яго робяц(?) музычныя інструменты. Яшчэ клён сапраўдны баром..тр. Калі ў тым месцы дзе ліс(?)цікі св..імі но(ж / ш)камі мацуюцца да галінак прасоч(?)ваюцца кропел(?)кі віл(?)гаці хутка по..дзе дож... «Плача» клён (не) забудз(?)це захапіц(?) на ..уліцу парасоны.

(*Паводле Х. Гурыновіча*)

Выканайце самаправерку (*гл. с. 174*).

• Як беларусы называюць кляновы сок?

### Тэст 12 для самаправеркі

**А1.** Адзначце словы, у якіх прапушчаны мяккі знак:

1) раз..яднаць
2) грудз..мі
3) мен..шы
4) сем..дзесят
5) глян..ма

**А2.** Адзначце словы, у якіх прапушчаны апостраф:

1) аб..есціся 3) двух..ярусны 5) б..юць
2) едз..це 4) кампан..ён

**А3.** Адзначце словы, у якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1) кубаньскі 3) ледзве 5) плысці
2) услоньчык 4) кудысьці

**А4.** Адзначце словы, пры перакладзе якіх з рускай мовы на беларускую мяккі знак не пішацца:

1) пьедестал 3) голубь 5) Свислочь
2) серенький 4) июньский

**В1.** Якое імя па бацьку мае сын, бацьку якога завуць *Віталій*?

# УЖЫВАННЕ ВЯЛІКАЙ І МАЛОЙ ЛІТАР

## Вялікая і малая літары ў асабовых назвах; у прыметніках, утвораных ад асабовых назваў; у геаграфічных і астранамічных назвах

**З вялікай літары пішуцца:**

прозвішчы, імёны, імёны па бацьку, псеўданімы, мянушкі, клічкі жывёл, птушак і інш.: *Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч* (*Якуб Колас*), *Доўнар-Запольскі*, *Марыя Захараўна*, *Кірыла Тураўскі*, *Жак Іў Кусто*, *кот Рудзік*, *папугай Гоша*;

прозвішчы, а таксама імёны ў множным ліку, калі яны выступаюць як назвы роду, групы асоб ці ўжываюцца ў значэнні агульнай назвы: *Луцэвічы*, *браты Міцкевічы*, *род Радзівілаў*, *бязродныя Іваны*; *Заслонавы* (але асабовыя імёны, прозвішчы ў форме множнага ліку, якія перадаюць пагардлівыя, зневажальныя адносіны, пішуцца з малой літары: *гарлахвацкія*, *кручковы*);

найменні найвышэйшых божастваў (боствaў) у рэлігійных культах, асабовыя імёны заснавальнікаў рэлігійных вучэнняў, біблейскіх асоб, імёны легендарных і міфічных асоб, уласныя назвы казачных істот і герояў літаратурных твораў, назвы культавых кніг: *Бог*, *Алах*, *Уладыка Нябесны*, *Святая Тройца*, *Прасвятая Дзева Марыя*; *Ісус Хрыстос*, *Буда*, *Святы Павел*; *Геркулес*, *Зеўс*, *Пярун*; *Чырвоная Шапачка*, *Калабок*, *Каза-дзераза*; *Біблія*, *Каран* (але: з малой літары пішуцца словы *бог* (*гасподзь*) ва ўстойлівых выразах тыпу *бог* (*алах*) *яго ведае*, *дай божа*, *дзякаваць богу*, *алах з ім*, а таксама агульныя назвы ўяўных істот: *анёл*, *херувім*, *муза*, *гном*, *троль* і інш.);

прыметнікі ва ўласных назвах, калі яны паказваюць прыналежнасць (утвораны з дапамогай суфіксаў *-ев-* (*-ёв-*,

-*ёў*-), -*ов*- (-*ав*-, -*оў*-, -*аў*-), -*ін*- (-*ын*-) ад уласных імён, мянушак, клічак жывёл) або ўваходзяць у склад назваў, сінанімічных словам *імя*, *памяці*: *Танін сшытак*, *Купалава паэма*, *Барсікава міска*; *Коласаўская прэмія*, *Купалаўскі сквер*, *Танкаўскія чытанні*;

геаграфічныя, дзяржаўныя, адміністрацыйна-тэрытарыяльныя і астранамічныя назвы (акрамя слоў з родавым значэннем *рака*, *горад*, *востраў*, *вуліца*, *плошча*, *вобласць*, *раён*, *зорка*, *мыс* і г. д.): *Гомель*, *Нёман*, *Новае Сяло*, *Аўстралія*, *Рэспубліка Беларусь*, *Расійская Федэрацыя*, *Венера*, *Балканскі паўвостраў*, *пустыня Сахара*, *возера Нарач*, *Гомельская вобласць*, *Гродзеншчына*, *Кастрычніцкая плошча*, *Дняпроўска-Бугскі канал*, *мыс Добрай Надзеі*, *Сібір*, *Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае*.

**З малой літары пішуцца:**

імёны і прозвішчы, якія ўжываюцца ў значэнні агульных назоўнікаў: *гарлахвацкія*, *плюшкін*, *донжуан*;

назвы міфалагічных істот, якія ператварыліся ў агульныя: *лясун*, *русалка*, *німфа*, *дамавік*;

артыклі і часціцы ў іншамоўных уласных імёнах: *Лопэ дэ Вега*, *Людвіг ван Бетховен*, *Леанардa да Вінчы*;

прыметнікі, утвораныя ад асабовых назваў, якія ўжываюцца ў складзе ўстойлівых спалучэнняў або ў складзе састаўных агульных назваў: *гордзіеў вузел*, *ахілесава пята*, *дамоклаў меч*, *пірава перамога*, *напалеонаўскія планы*, *рэнтгенаўскі здымак*, *гегелеўская дыялектыка*;

прыметнікі, утвораныя ад уласных назваў з дапамогай суфіксаў -*аўск*-, -*еўск*-, -*анск*-, -*інск*- (-*ынск*-), акрамя назваў, сінанімічных словам *імя*, *памяці*: *коласаўскія мясціны*, *купалаўскія персанажы*, *мележаўскія раманы*, *нёманскія краявіды*, *сочынскія курорты*, але: *Купалаўскія чытанні*, *Мележаўская прэмія*;

назвы парод жывёл: *балонка*, *дог*, *лайка*, *пудзель*;

словы *сонца*, *месяц*, *зямля*, калі яны не з'яўляюцца назвамі нябесных цел;

назвы нацыянальнасцей, плямёнаў, а таксама словы, якія паказваюць на месца пражывання: *грузіны*, *армяне*, *дрыгавічы*, *крывічы*, *беларус*, *мінчанін*;

назвы чалавека, утвораныя ад асабовых імёнаў, якія паказваюць на яго прыналежнасць або прыхільнасць да чагонебудзь ці каго-небудзь: *купалавец*, *магаметанін*, *дзянікінец*, *талстовец*.

### Мова і нацыянальная культура

**115.** Прачытайце тэкст. Вусна пракаменціруйце правапіс вялікай і малой літар.

«(Н / н)овая (З /з)ямля» (Я / я)куба (К / к)оласа ва ўдзячнай памяці ўжо некалькіх пакаленняў (Б / б)еларусаў. Касманаўт (П / п)ётр (К / к)лімук, вярнуўшыся з палёту вакол (П / п)ланеты (З / з)ямля, расказваў, як з касмічных вышынь ён спасцігаў не толькі веліч (Р / р)адзімы, але і хараство гучання роднага слова, чытаючы па памяці раздзелы з «(Н / н)овай (З /з)ямлі», што запалі яму ў душу са школьнай парты.

Любіў «(Н / н)овую (З / з)ямлю» (К / к)узьма (Ч / ч)орны. У гады (В / в)ялікай (А / а)йчыннай (В / в)айны ён для падтрымкі настрою ўспамінаў найбольш вясёлыя здарэнні і прыгоды, апісаныя ў (К / к)оласавай паэме. (К / к)узьма (Ч / ч)орны рыхтаваўся да грунтоўнага даследавання (К / к)оласаўскай эпапеі.

Высока цаніў «(Н/н)овую (З/з)ямлю» выдатны (Р/р)ускі паэт (А / а)ляксандр (Т / т)вардоўскі, неаднойчы выказваючы сваё захапленне жыццёвай сілай (К / к)оласаўскага твора.

(*Паводле В. Віткі*)

Запішыце любімыя вамі радкі з паэмы «Новая зямля» Я. Коласа. Памятайце, што кожны новы радок у вершаваных тэкстах пачынаецца з вялікай літары.

### Арфаграфія і фразеалогія

**116.** Растлумачце сэнс фразеалагізмаў.

Гордзіеў вузел, ахілесава пята, дамоклаў меч, аўгіевы стайні, танталавы пакуты, мамаева пабоішча, як сідараву казу.

Складзіце і запішыце сказы з гэтымі фразеалагізмамі.

**117.** Устанавіце адпаведнасць паміж назвамі міфічных істот і іх характарыстыкамі.

| | |
|---|---|
| а) багнік | 1) уладар лесу; можа набываць аблічча любога звера; уяўлялі ў выглядзе вялізнага старога чалавека, парослага мохам, з белым, як бяроста, тварам і доўгай барадой |
| б) лясун | 2) жыве ў хаце (пад печчу ці за печчу) або ў сенцах, каморы, клеці; уяўлялі ў выглядзе старога чалавека ў белай вопратцы, з сівой барадой |
| в) ваўкалак | 3) уладар вадаёмаў; уяўлялі ў выглядзе старога чалавека, пакрытага водарасцямі і цінай, з расплывістым тварам, зялёнай барадой, доўгімі валасамі на клінападобнай галаве |
| г) вадзянік | 4) жыве ў тарфяным балоце; вельмі брудны; яго цёплае дыханне абагравае багну, не дае ёй замерзнуць |
| д) дамавік | 5) чалавек, які набыў на некаторы час аблічча воўка; у адрозненне ад звычайнага воўка мае больш высокі рост, вялікую галаву з чатырма вачамі |

На аснове прыведзенай інфармацыі складзіце і запішыце сказы, растлумачце правапіс вялікай і малой літар.

> î Назвы роднага краю
>
> **БЕЛАЕ ВОЗЕРА, БЕЛАЕ БАЛОТА**
>
> *Белае* — пашыраная назва азёр на Гродзеншчыне, Віцебшчыне, Брэстчыне. У адрозненне ад тых, што ўтвараліся на цёмных тарфяніках, гэтыя мелі адносна чыстую, празрыстую праточную ваду.
>
> 
>
> Каля вёскі Вялікія Чучавічы ў Лунінецкім раёне ёсць *Белае балота*, на якім расце бярэзнік. Але не па бярозах назвалі яго Белым, а па тым, што балота гэта з сухім дном і пакрыта светлым, белым мохам — сфагнумам.
>
> (*Паводле У. Юрэвіча*)

**118.** Спішыце тэкст, выбіраючы з дужак патрэбныя літары.

«КАЛЯРОВЫЯ» НАЗВЫ РЭК

Прыток (Д / д)руці, паблізу вёскі (С / с)тарое (З / з)аліцвінне ў (К / к)іраўскім раёне, — рака (Б / б)елая. (Ч / ч)ырвоная (К / к)анава — прыток ракі (У / у)за на (Г / г)омельшчыне. На (П / п)ухавіччыне ёсць рака (С / с)іняўка. А па суседстве, у (А / а)сіповіцкім раёне, рака (С / с)іняя, што ўпадае ў (С / с)віслач. А рэк, азёр з назвай (Ч / ч)орнае — безліч па ўсёй (Б / б)еларусі!

(*Паводле А. Карлюкевіча*)

Растлумачце правапіс вялікай літары.

**119.** Спішыце сказы, выбіраючы з дужак патрэбныя літары.

1. Тут я ўбачыў упершыню жыхароў (З / з)аходняй (А/а)фрыкі, прадстаўнікоў карэннага насельніцтва (С /с)енегала (*В. Вольскі*). 2. За (Н / н)оўгарадам, за сучасным

(Б / б)алтыйскім (М / м)орам жылі розныя (Г / г)ерманскія плямёны (*У. Бутрамееў*). 3. Дарэчы, будзеце вандраваць па (В / в)іцебшчыне, (Б / б)раслаўшчыне — абавязкова зазірніце ў (Д / д)рую (*А. Карлюкевіч*). 4. Пасля нашэсця (М/м)ангола-(Т/т)атараў і распаду (К/к)іеўскай (Р / р)усі як дзяржавы, калыскі трох славянскіх народнасцей — (Р/р)ускай, (У/у)краінскай і (Б/б)еларускай, — на (Б/б)елай (Р/р)усі і суседніх старажытных (Л/л)ітоўскіх землях утвараецца новая дзяржава — (В / в)ялікае (К / к)нягства (Л / л)ітоўскае са сталіцай у горадзе (Н / н)аваградку (*В. Вітка*).

**120.** Запішыце выразы з прыведзенымі словамі.

Месяц — месяц, Цётка — цётка, Глыбокае — глыбокае, Брэсцкая — брэсцкая, Ціхі — ціхі, Купалава — Купалаўская — купалаўская.

## Вялікая і малая літары ў назвах дзяржаўных органаў і іншых арганізацый; у найменнях пасад і званняў

**З вялікай літары пішуцца:**

назвы дзяржаўных органаў і іншых арганізацый:

а) усе словы ў найменнях вышэйшых органаў заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады: *Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўная Дума Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі, Нацыянальны Кангрэс* (у ЗША);

б) першае слова ў найменнях рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых арганізацый: *Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, Еўрапейскі саюз, Міжнародны алімпійскі камітэт, Мінскі*

*абласны выканаўчы камітэт*, *Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі*;

в) простыя і састаўныя ўласныя назвы ў складзе ўласных найменняў дзяржаўных органаў і іншых арганізацый: *Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь*, *Парламенцкая асамблея Савета Еўропы*, *Міжнародны суд Арганізацыі Аб'яднаных Нацый*, *Таварыства Чырвонага Крыжа*, *Арганізацыя Паўночнаатлантычнага дагавору* (НАТА);

г) слова *Савет* у значэнні органа ўлады: *Мінскі абласны Савет дэпутатаў*, *сельскі Савет дэпутатаў* (але: *сельсавет*);

д) словы *Дом, Палац* у пачатку наймення ўстановы: *Дом культуры*, *Дом народнай творчасці*, *Палац спорту*, але: *Лядовы палац, дом адпачынку*;

складанаскарочаныя словы, утвораныя ад афіцыйных назваў дзяржаўных устаноў (калі першая частка ў поўным слове пішацца з вялікай літары): *Белтэлерадыё*, *Мінфін*, *Дзяржплан*;

словы або спалучэнні слоў, якія з'яўляюцца афіцыйнымі назвамі асобы па вышэйшых дзяржаўных і рэлігійных пасадах: *Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь*, *Старшыня Савета Міністраў*, *Галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі Рэспублікі Беларусь*, *Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь*, *Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі*, *Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі*, *Папа Рымскі*; у неафіцыйным ужыванні словы *прэзідэнт*, *кароль*, *старшыня*, *імператар* пішуцца з малой літары: *візіт прэзідэнта*, *прыём у каралевы.*

**121.** Спішыце сказы, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс вялікай і малой літар.

1. (Н / н)ацы..нальны (А / а)кад..мічны (Т / т)..атр імя (Я / я)нкі (К / к)упалы трад..цыйна а..крые новы с..зон

(К / к)упалаўскай «(П / п)аўлінкай». 2. У сталічным (П / п)алацы (С / с)порту адбыўся хак..ейны матч каманды (П / п)рэзід..нта (Р / р)эспублікі (Б / б)еларусь і каманды (Б / б)рэс..кай ..обласці. 3. Сёння на пасяджэнні (М / м)іжнароднага (А / а)лімпійскага (К / к)амітэта былі названы віды спорту, якія будуць уваходзіць у алімпійскую праграм..у з 2016 года. 4. Створаныя ў нас мас..авыя маладзёжныя грама..кія аб'яднанні — (Б / б)еларускі (Р / р)эспубліканскі (С / с)аюз (М / м)оладзі і (Б / б)еларуская (Р / р)эспубліканская (П / п)і..нерская (А / а)рганізацыя — даюць ма..чымасць падлеткам і юна..тву праявіць сябе, рэ..лізаваць мары, атрымаць ..опыт лід..рства і работы ў камандзе.

(*Паводле інтэрнэт-рэсурсаў*)

### Мова і нацыянальная культура

**122.** Спішыце тэкст, рашаючы арфаграфічныя задачы.

У канцы другога тыс..чаго..дзя ўдзельнікаў духоўнага хору «(К / к)рынічка» (М / м)інскага (П / п)алаца дз..цей і моладзі запрасіў на а..дыенцыю (П / п)апа (Р / р)ымскі. Сустрэча пра..шла на (П / п)лошчы (С / с)в..тога (П / п)..тра ў (Р / р)ыме. Пантыфік вітаў дз..цей на беларускай мове, яны спелі для яго нек..лькі духоўных твораў. (Я / я)н (П / п)авел (Д / д)ругі быў уражаны спевамі, сказаў, што яму здалося, быц..ам гэта сп..ваюць (А / а)нёлы, і блаславіў дз..цей і ўвесь беларускі народ.

(*Паводле Я. Сіпакова*)

Растлумачце правапіс вялікай і малой літар.

### Пераклад тэксту

**123.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову, запішыце, раскрываючы дужкі.

(С / с)овет (М / м)инистров (Р / р)еспублики (Б / б)еларусь — центральный орган государственного управления

(Р / р)еспублики (Б / б)еларусь. Он осуществляет в соответствии с (К / к)онституцией (Р / р)еспублики (Б / б)еларусь исполнительную власть. В своей деятельности (С / с)овет (М / м)инистров (Р / р)еспублики (Б / б)еларусь подотчетен (П / п)резиденту (Р / р)еспублики (Б / б)еларусь. Правительство (Р / р)еспублики (Б / б)еларусь состоит из (П / п)ремьер-(М / м)инистра, его заместителей и (М / м)инистров.

(«*Кто есть кто в Республике Беларусь*»)

**124.** Запішыце выразы з прыведзенымі словамі.

Беларускі — беларускі, Савет — савет, Нацыянальны — нацыянальны, Дом — дом, Таварыства — таварыства, Старшыня — старшыня.

## Вялікая і малая літары ў назвах дзяржаўных і нацыянальных сімвалаў, рэліквій, дзяржаўных узнагарод; у назвах дакументаў, унікальных прадметаў, твораў

**З вялікай літары пішуцца:**

усе словы ў назвах дзяржаўных і нацыянальных, ваенных і культурных рэліквій: *Сцяг Перамогі*, *Крыж Ефрасінні Полацкай*, *Помнік Перамогі*, *Востраў Слёз*, *Курган Славы*;

усе словы ў поўных назвах ордэнаў, медалёў (акрамя слоў *ордэн*, *медаль*, *ступень*): *ордэн Францыска Скарыны*, *ордэн Славы І ступені*, *ордэн Пашаны*, *Георгіеўскі Крыж* (але: *ордэн Дружбы народаў*);

першае слова ў назвах дзяржаўных сімвалаў, прэмій, грамат, прызоў і інш.: *Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь*, *Ганаровая грамата Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь*, *Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь*, *Нобелеўская прэмія*, *Кубак свету*, *Каралеўскі кубак*;

аднаслоўныя ўласныя назвы і першае слова ў састаўных назвах кніг, газет, часопісаў, устаноў, арганізацый, заводаў, караблёў, машын пішуцца з вялікай літары і бяруцца ў двукоссе: *часопіс «Беларусь»*, *аўтамабіль «Масквіч»*, *опера «Кастусь Каліноўскі»*, *танец «Лявоніха»*, *верш М. Багдановіча «Слуцкія ткачыхі»*, *медыцынская служба «Хуткая дапамога»*, *перыядычнае даведачнае выданне «Летапіс друку»*, *выдавецтва «Народная асвета»*, *кафэ «Вясна»*, *набор мэблі «Вязынка»*, *хлеб «Водар»*; назвы саміх вырабаў (акрамя назваў, што супадаюць з асабовымі і геаграфічнымі назвамі) пішуцца ў двукоссі з малой літары: *«масквіч»*, *«вольва»*, *«боінг»*, *«гарызонт»* (тэлевізар), але: *«Мінск»* (халадзільнік), *«Волга»* (аўтамабіль).

**125.** Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс вялікай і малой літар.

1. Беларус Жарэс Алфёраў атрымаў (Н / н)обелеўскую (П / п)рэмію па фізіцы. 2. З самай раніцы на (В / в)остраў (С / с)лёз пачалі прыходзіць сваякі і калегі воінаў(?) інтэрнацы..налістаў. 3. У 1976 годзе на (М / м)інскім (Р / р)ады..заводзе быў зроблены трох(?)міл..ённы тэлевізар «(Г / г)арызонт». 4. У а..паведнас(?)ці з законам «(А / а)б дз..ржаўных узнагародах (Р / р)эспублікі (Б / б)еларусь» (О / о)рд..нам (Ф / ф)ранцыска (С / с)карыны ўзнагароджваюцца грамадзяне «за значныя поспехі ў галіне нацы..нальна(?)дз..ржаўнага адраджэн..я, а таксама за прапаганду культурнай спа..чыны беларускага народа». 5. У а..паведнас(?)ці з артыкулам 19 (К / к)анстытуцыі (Р / р)эспублікі (Б / б)еларусь (Д / д)з..ржаўны (С / с)цяг, (Д / д)з..ржаўны (Г / г)ерб і (Д / д)з..ржаўны (Г / г)імн з..яўляюцца сімваламі яе (Д / д)з..ржаўнага сувер..нітэту.

(*Паводле інтэрнэт-рэсурсаў*)

**126.** Спішыце тэкст, рашаючы арфаграфічныя задачы.

Юв..лір (Л / л)азар (Б / б)огша ў 1161 годзе ств..рыў ш..дэўр — (К / к)рыж (Е / е)ўфрасінні (П / п)олацкай. Гэту надзвычай а..казную працу майст..р рабіў пад наглядам ігуменні (С / с)пасаўскага (М / м)анастыра.

Крыж выконваў ролю каўчэга для атрыманых з (К / к)анстанцінопаля і (І / і)ерусаліма хр..сці..нскіх св..тыняў.

Ш..сціканцовая форма (К / к)рыжа (Е / е)ўфрасінні (П / п)олацкай сімвалізавала створаны (Б / б)огам за ш..сць дзён свет.

(*Паводле У. Арлова*)

• Хто ўзнавіў беларускую нацыянальную рэліквію?

**127.** Прачытайце тэкст, дайце яму загаловак. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі.

Ёсць у нашага народ.. добры звычай — збірацца «на б..седу», гэта значыць на сустрэчу родных, блізкіх, знаёмых людзей, каб разам адзначыць с..мейнае свята, пагутарыць, пав..с..ліцца і пасумаваць, пасп..ваць і патанчыць. Словам, імя ансамбль абраў с..бе вельмі трапнае — «(Б / б)..седа».

Н..зменны мастацкі кіраўнік ансамбля — в..домы кампазітар, (З / з)аслужаны (Д / д)зе..ч (М / м)астацтваў, (Л / л)аўр..ат (Д / д)з..ржаўнай (П / п)рэміі (Б / б)еларусі Леанід Захлеўны. У кал..ктыве працуюць як (З / з)аслужаныя (А / а)ртысты (Б / б)еларусі, так і н..даўнія выпускнікі (Б / б)еларускай (Д / д)з..ржаўнай (А / а)кад..міі (М / м)узыкі. «Усе ўдзельнікі нашага кал..ктыв.. шчыра любяць беларускі фальклор, выдатна валодаюць народнай манерай выканання, — гаворыць Л. Захлеўны. — Асноўная мэта нашай працы — запіс(?) н..в..домых ці мала(?)в..домых беларускіх народных песен(?). Галоўнае ў апрацоў-

ках — ід..альна захаваць пры аранж..роўцы м..ладычную лінію песні».

У шчырасці і шчодрасці «(Б / б)..седы» пераканаліся не толькі (Б / б)еларускія слухачы, але і аматары і знаўцы фальклору ў (Ш / ш)вецыі, (Г / г)ерманіі, (П / п)ольшчы, (К / к)арэі, дзе ансамбль з поспехам удзельнічаў у (М / м)іжнародных (Ф / ф)альклорных (Ф / ф)..стывалях.

(*Паводле Т. Песнякевіч*)

Растлумачце ўжыванне вялікай і малой літар у словах.

• Назавіце вядомыя вам песні з рэпертуару ансамбля «Бяседа».

• Растлумачце розніцу ў лексічных значэннях беларускага слова *бяседа* і рускага *беседа*. Як называюцца падобныя пары слоў?

• Раскрыйце сэнс прыказкі «Без кавалачка хлеба кепская бяседа».

## Вялікая і малая літары ў назвах знамянальных падзей і дат, перыядаў і эпох, свят

**З вялікай літары пішуцца:**

аднаслоўныя ўласныя назвы і першае слова ў састаўных назвах знамянальных падзей і дат, перыядаў і эпох, свят: *Адраджэнне*, *Варфаламееўская ноч*, *Лядовае пабоішча*, *Першая* (*Другая*) *сусветная вайна*; *Каляды*, *Радаўніца*, *Новы год*, *Таццянін дзень*, *Дзень ведаў*, *Вялікая субота*, але: *грамадзянская вайна*, *імперыялістычная вайна*, *лютаўская рэвалюцыя*, *кайназойская эра*, *эпоха феадалізму*, *неаліт*, *залаты век*, *высакосны год*, *санітарны дзень*, *месячнік пажарнай бяспекі*.

**128.** Спішыце тэкст, рашаючы арфаграфічныя задачы.

Для (С / с)в..тланы, вучаніцы (С / с)елішчанскай школы (С / с)луцкага ра..на, як і для ўсёй яе сям(?)і, пам..тнай рэч..у стала дзедава салда..кая гімнасцёрка. Яе (з / с) шасц(?)ю м..далямі дзед заўсёды надз..ваў у (Д / д)зень (П / п)ерамогі. І цяпер, калі ўжо дз..дулі няма, што(?)год 9 (М / м)ая яго гімнасцёрка (з / с) пашанай дастаецца (з / с) шафы і вешаецца на крэсла, у якім ён с..дзеў і ра..казваў пра (?)огнен..ыя гады (В / в)ялікай (А / а)йчын..ай (В / в)айны.

(*Паводле В. Віткі*)

Растлумачце правапіс вялікай літары.

### Мова і нацыянальная культура

**129.** Устанавіце адпаведнасць паміж датамі і дзяржаўнымі святамі, святочнымі і памятнымі днямі. Запішыце, раскрываючы дужкі.

| | |
|---|---|
| а) 15 сакавіка | 1) (Д / д)зень (П / п)ерамогі |
| б) 2 красавіка | 2) (Д / д)зень (Ж / ж)анчын |
| в) другая нядзеля мая | 3) (Д / д)зень (К / к)анстытуцыі |
| г) 9 мая | 4) (Д / д)зень (Д / д)зяржаўнага (С / с)цяга (Р / р)эспублікі (Б / б)еларусь і (Д / д)зяржаўнага (Г / г)ерба (Р / р)эспублікі (Б / б)еларусь |
| д) 3 ліпеня | 5) (Р / р)адаўніца |
| е) 23 лютага | 6) (Д / д)зень (А / а)баронцаў (А / а)йчыны і (У / ў)зброеных (С / с)іл (Р / р)эспублікі (Б / б)еларусь |
| ж) 8 сакавіка | 7) (Д / д)зень (У / у)сенароднай (П / п)амяці (А / а)хвяр (В / в)ялікай (А / а)йчыннай (В / в)айны |
| з) 1 мая | |
| і) 22 чэрвеня | |
| к) 9-ы дзень пасля праваслаўнага (В / в)ялікадня | |

8) (Д / д)зень (Я / я)днання (Н / н)ародаў (Б / б)еларусі і (Р / р)асіі
9) (С / с)вята (П / п)рацы
10) (Д / д)зень (Н / н)езалежнасці

**130.** Запішыце па пяць слоў, якія абазначаюць:

1) назвы беларускіх газет і часопісаў;
2) геаграфічныя назвы;
3) назвы гістарычных эпох і падзей;
4) назвы беларускіх міфічных істот;
5) назвы адукацыйных устаноў Беларусі.

### Тэст 13 для самаправеркі

**А1.** Адзначце выпадкі, у якіх пішацца вялікая літара:

1) (В / в)алодзеў брат
2) (М / м)агілёўшчына
3) (Х / х)рысціянін
4) Мікалай (Д / д)ругі
5) (С / с)карынаўскія пераклады

**А2.** Адзначце выпадкі, у якіх пішацца малая літара:

1) (Б б)альзакаўскі ўзрост
2) (Б / б)іблія
3) (М / м)іністэрства ўнутраных спраў
4) (Б / б)алгары
5) мяккая (З / з)ямля

**А3.** Адзначце выпадкі, у якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1) Пушкінскія чытанні
2) Вадзянік
3) Гарлахвацкія
4) аўчарка
5) курган Славы

**А4.** Адзначце выпадкі, у якіх усе словы пішуцца з вялікай літары:

1) (Н / н)обелеўская (П / п)рэмія
2) (П / п)апа (Р / р)ымскі
3) (В / в)ялікае (К / к)няства (Л / л)ітоўскае
4) (О / о)рдэн (М / м)аці
5) (Д / д)зень (Н / н)астаўніка

**В1.** Укажыце, колькі слоў пішацца з вялікай літары ў словазлучэнні *(Б / б)еларускі (Д / д)зяржаўны (П / п)едагагічны (У / ў)ніверсітэт (І / і)мя (М / м)аксіма (Т / т)анка.*

# АГУЛЬНЫЯ ПРАВІЛЫ НАПІСАННЯ СЛОЎ РАЗАМ І ПРАЗ ЗЛУЧОК

1. Пішуцца **разам**:

складанаскарочаныя словы і вытворныя ад іх: *філфак, прадмаг, сельсавет, газпрам, газпрамавец, газпрамаўскі* і інш.;

складаныя словы і вытворныя ад іх з пачатковымі іншамоўнымі часткамі *авія-*, *агра-*, *аўта-*, *аўдыя-*, *аэра-*, *бія-*, *відэа-*, *вела-*, *геа-*, *грам-*, *заа-*, *кіна-*, *макра-*, *мота-*, *неа-*, *радыё-*, *сацыя-*, *спорт-*, *стэрэа-*, *тэле-*, *танц-*, *фота-*, *электра-* і інш.: *авіяпалёт*, *аўтастанцыя*, *веласпорт*, *відэакасета*, *геапалітычны*, *заапарк*, *радыёхваля*, *танцклас*, *тэледэбаты* і інш.;

словы са скарочанай пачатковай часткай *поў-* (*паў-*): *поўнач*, *паўгоддзе*, *паўчвэрці*, *паўсвету* (але з уласнымі назвамі: *паў-Мінска, паў-Камароўкі*);

словы з прыстаўкамі і падобнымі да прыставак пачатковымі часткамі: *а-*, *анты-*, *архі-*, *гіпер-*, *дыс-*, *дэз-*, *звыш-*, *інтэр-*, *інфра-*, *контр-*, *між-*, *мілі-*, *мета-*, *пан-*, *пост-*, *псеўда-*, *супер-*, *транс-*, *ультра-*, *экс-*, *экстра-* і інш.: *алагізм*, *антычалавечы*, *звышгукавы*, *інтэрнацыянальны*, *дэзактывацыя*, *контрагент* (але: *контр-адмірал*), *міжпланетны*, *пастфактум*, *супергерой*, *ультрановы*, *экстэрытарыяльны* (але: *экс-чэмпіён*) і інш.;

складаныя словы, першай часткай якіх з'яўляюцца лічэбнікі: *першакурснік*, *двухмоўе*, *двукоссе*, *сямітысячны*, *васьмімільённы*, *трохразовы*, *чатырохпрацэнтны*, *саракатрохгадовы.*

2. Пішуцца **праз злучок**:

спалучэнні, утвораныя з двух аднолькавых (або з адной асновай) слоў: *белы-белы*, *ледзь-ледзь*, *бегалі-бегалі*, *што-што*, *як-ніяк*, *дзе-нідзе*, *раз-пораз*;

спалучэнне блізкіх або супрацьлеглых па значэнні слоў: *шум-гам*, *хлеб-соль*, *шыта-крыта*, *больш-менш*, *сям-там*, *жыў-быў*, *бокам-скокам*, а таксама *пусці-павалюся*, *гуляй-вецер*, *узвей-вецер*;

складаныя словы, першай (або апошняй) часткай якіх з'яўляюцца лічбы любога злічэння, літары ці літарныя абрэвіятуры любога алфавіта: *80-годдзе, 9-павярховы, XX-вяковы, α-часцінка (альфа-часцінка), П-падобны, МАЗ-60.*

Назоўнікі з прыназоўнікамі і два назоўнікі, адзін з якіх ужыты ў назоўным склоне, а другі ў творным, пішуцца асобна: *з вока на вока, дзень у дзень, раз за разам; век вяком, чалавек чалавекам* і інш.

î Назвы роднага краю

**БУДА-КАШАЛЁВА**

Былі некалі побач дзве вёскі — *Буда* і *Кашалёва*. Першая назва, пашыраная ў Беларусі, паходзіць ад слова *буда* — лясная вартоўня, часовая будоўля, у якой мелі прытулак тыя, хто працаваў у лесе. Іх называлі буднікі. Яны выпальвалі дзёгаць, смалу, драўняны вугаль. А побач, скарыстоўваючы карчы, дралі лыка і плялі кошыкі, кашалі. У канцы XIX стагоддзя дзве вёскі паядналіся, і ўзнікла назва *Буда-Кашалёва*. Так называецца цяпер горад, раённы цэнтр.



(*Паводле У. Юрэвіча*)

**131.** Адзначце радкі, у якіх усе словы напісаны правільна.

1) велапрабег, агра-тэхніка, 50-годдзе, мотакрос, год-два, трох-бор'е;

2) лясгас, аўдыяапаратура, грам-запіс, бія-энергетыка, 9-працэнтны;

3) заасад, 5-павярховы, паўвёскі, авіяпошта, геахімія, антысептык;

4) рыбнагляд, гуляйвецер, відэасігнал, аэрафлот, сёйтой, псеўда-мастацтва;

5) аўтапілот, прыма-балерына, суперэкспрэс, макраклімат, двухмоўе.

Запішыце словы, у якіх дапушчаны памылкі, згодна з арфаграфічнымі нормамі.

📖 Правільнасць маўлення

**ДЫС... – ДЭЗ...**

**Дыс-** — прыстаўка, якая абазначае парушэнне, разлад, страту чаго-небудзь; адпавядае па значэнні прыстаўкам *раз-*, *не-*: *дыскамфорт*, *дысгармонія*.



**Дэз-** — прыстаўка, якая абазначае выдаленне, знішчэнне, спыненне або адсутнасць чаго-небудзь: *дэзарыентацыя*, *дэзарганізацыя*, *дэзынфармацыя*.

⏩ Арфаграфія і лексікалогія

**132.** Устанавіце адпаведнасць паміж назоўнікамі і іх значэннямі.

| | |
|---|---|
| а) дысгармонія<br>б) дэзарганізацыя<br>в) дыспрапорцыя<br>г) дыскамфорт<br>д) дэзынтэграцыя | 1) несуразмернасць паміж часткамі цэлага, адсутнасць прапарцыянальнасці<br>2) умовы жыцця, знаходжання, якія не забяспечваюць зручнасцей і спакою<br>3) распадзенне, расчляненне цэлага на састаўныя часткі<br>4) парушэнне гармоніі, адсутнасць сугучнасці; немілагучнасць; разлад, няўзгодненасць, парушэнне адпаведнасці чаго-небудзь чаму-небудзь |

5) разлад арганізаванасці, парушэнне парадку, нармальнай дзейнасці каго-небудзь, чаго-небудзь

**133.** Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі.

1. Весела застр..катала ў вёсцы бенза(?)піла: дровы на зіму нарыхтоўваюць (*Р. Ігнаценка*). 2. Нарад..ілася яна [яліна] ў гэтым лесе даўным(?)даўно (*А. Васілевіч*). 3. Агонь у печы яшчэ гарэў, і ў хаце панавала рухомае паў(?)св..тло (*Э. Ажэшка*). 4. Спражка пачала драпаць скуру і пакідаць сякі(?)такі след (*Я. Маўр*). 5. Ёсць у мяне ў лесе свае любімыя сцежкі(?)дарожкі, па якіх я хаджу як са стрэльбай, так і без яе, назіраю за жыц..ём лесу (*Р. Ігнаценка*). 6. Аленчына маці працуе на завод..е шкл..валакна ап..ратарам цэха электра(?)печаў (*А. Савіцкі*). 7. Лаз(?)ню будавалі звычайна з тонкіх б..рвёнаў, з двух(?)схільным дахам, у сц..не рабілі адно(?)два (?)акенцы (*М. Маляўка*). 8. Шмат вады збегла(?)сплыло пасля той в..снавой раніцы на глушцовым такавішчы (*Р. Ігнаценка*). 9. С..род л..сных п..рша(?)цветаў самым прыгожым, н..сумненна, з..яўляецца сон(?)трава (*Х. Гурыновіч*).

**134.** Прачытайце тэкст. Растлумачце сэнс загалоўка.

## БЕЗ ПАМЯЦІ НЕМАГЧЫМА АБНАЎЛЕННЕ СВЕТУ...

Чыгунок з маладой бульбай стаіць на стале пад сіне(?)зялёным клёнам. Напоўнены духмянасцю жніўня вечар сабраў нашу сям'ю на вячэру ў сад...

Успаміны агарнулі мяне, адно ўзяўся я за адпаліраваную да светла(?)блакітнага бляску клямку на варотцах каля дома, дзе я вырас. Яна захавала цеплыню дзедавай рукі. Зусім простая, звычайная рэч — клямка... А колькі

прыемна(?)шчымлівых успамінаў дорыць адзін дотык да яе!

Новы гаспадар дома перафарбаваў і ашаляваў яго. Так што, каб паказалі мне фота(?)здымак, я не пазнаў бы свайго дома. А вось клямка засталася берагчы памяць... Памяць, у якой не толькі тая далёкая(?)далёкая вячэра ў садзе. У якой — вайна. Спаленыя хаты. Засеяная асколкамі зямля(?)пакутніца... Таму няма для мяне больш важнай справы, чым справа міру.

Гэта толькі адзін з клопатаў мірнага жыцця — зберагчы нашу нацыянальна(?)культурную спадчыну, служыць памнажэнню яе багацця. Жаданне аднавіць страчаныя гістарычныя помнікі, пабудаваць новыя мікра(?)раёны з улікам традыцый старажытна(?)беларускай культуры — шчырае пачуццё, якім кіруюцца беларускія мастакі.

Без любві да сваёй зямлі, да той маленькай клямкі, што беражэ памяць пра бацькоў і дзядоў, немагчыма абнаўленне свету.

(*Паводле А. Анікейчыка*)

Выпішыце з тэксту словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс слоў разам і праз злучок», раскрыйце дужкі, растлумачце правапіс.

### Тэст 14 для самаправеркі

**А1.** Адзначце словы, якія пішуцца разам:

1) спорт(?)лата
2) хто(?)ніхто
3) ультра(?)гукавы
4) пяці(?)значны
5) экс(?)чэмпіён

**А2.** Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок:

1) звыш(?)праваднік
2) контр(?)адмірал
3) паў(?)Віцебска
4) інтэр(?)нацыянальны
5) хлеб(?)соль

**А3.** Адзначце правільна напісаныя словы:

1) тэле-глядач  3) звыш-хуткі  5) раз-пораз
2) паўмаска  4) электракіпяцільнік

**А4.** Адзначце выпадкі, у якіх дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1) двух-вежавы  3) інфрачырвоны  5) контратака
2) белы-белы  4) паў-гадзіны

**В1.** Ад словазлучэння *прафсаюзны камітэт* утварыце і запішыце складанаскарочанае слова.

# ПРАВІЛЫ ПЕРАНОСУ СЛОЎ

1. З аднаго радка на другі слова пераносіцца па складах, калі ў сярэдзіне яго няма спалучэння зычных: *во-ля, тра-ва, за-яц, га-ла-ва, ка-ва-лак, стра-ка-ты, пра-ве-рыць, пе-ра-кі-нуць*.

Калі ў сярэдзіне слова паміж галоснымі маецца спалучэнне зычных, то пераносіцца на наступны радок або ўсё гэта спалучэнне, або любая яго частка. Можна пераносіць: *ся-стра, сяс-тра, сяст-ра; во-стры, вос-тры, вост-ры; пту-шка, птуш-ка; кро-пля, кроп-ля; ма-ста-цтва, мас-тац-тва, мас-тацт-ва*.

2. Пры пераносе нельга:

пакідаць або пераносіць на наступны радок адну літару, нават калі яна адпавядае складу: *аса-ка, лі-нія, ра-дыё, еха-лі, па-кoі*. Немагчыма ажыццявіць перанос некаторых слоў, хоць яны і неаднаскладовыя: *аса, яна, юнак, мая, арыя, алея, Азія, якая* і пад.;

разбіваць пераносам спалучэнні літар *дж* і *дз*, калі яны абазначаюць на пісьме гукі [дж], [дз], [дз’]: *ура-джай, са-джаць, ра-дзі-ма, ха-дзіць*. Спалучэнні *дж* і *дз* можна разбіваць пераносам, калі *д* належыць прыстаўцы, а *з, ж* — кораню слова: *пад-жары, ад-жаць, пад-земны, ад-значыць*;

аддзяляць ад папярэдняй галоснай літары *й* і *ў*: *сой-ка, бой-кі, май-стар, дай-сці, зай-маца, праў-да, слоў-нік, маў-чаць, заў-тра, праў-нук*;

аддзяляць мяккі знак і апостраф ад папярэдняй зычнай: *буль-ба, прось-ба, вазь-му, бур’-ян, сем’-яў, мыш’-як*.

3. З дзвюх аднолькавых літар, што стаяць побач, адна звычайна пакідаецца на папярэднім радку, а другая пераносіцца на наступны радок: *па-абапал, двац-цаць, насен-не,*

*калос-се, сол-лю, памяц-цю, мыц-ца*. Але дапускаюцца і пераносы: *паа-бапал, два-цццаць, насе-нне, кало-ссе, со-ллю, памяцццю, мы-цца*.

4. У складаных словах кожная частка пераносіцца згодна з правіламі пераносу асобных слоў: *се-на-ўбо-рка, збо-жжа-зда-ча, ка-рня-пло-ды*.

5. Не дзеляцца пры пераносе абрэвіятуры, якія пішуцца вялікімі літарамі або з’яўляюцца спалучэннем літар і лічбаў, а таксама графічныя скарачэнні слоў і выразаў: *ААН, АБСЕ, ДАІ, А-78, г. д., г. зн., стст.*; не адрываюцца пры пераносе ад лічбаў далучаныя да іх злучком канчаткі або часткі канчаткаў: *а 19-й* (*гадзіне*), *1-га* (*студзеня*); не адрываюцца ад прозвішчаў ініцыялы: *Я. Брыль, К. М. Міцкевіч, Я. Ф. Карскі, М. І. Гурскі*; не пераносіцца на наступны радок працяжнік; не адрываецца ад лічбы скарочаныя назвы адзінак вымярэння: *1990 г., XXI ст., 100 кг, 50 га, 2 км*.

**135.** Падзяліце словы для пераносу. Укажыце ўсе магчымыя варыянты пераносу.

Найдрабнейшы, назбіраць, пад’ёмны, сенсацыя, стагоддзе, па-брацку, пунктуацыя, жніўвеньскі, засквaрыць, паслядоўны, гукаўтварэнне, зацвісці, малацьба, самаўпэўнены, ін’екцыя, святлафор, заўтрашні, народжаны, якасны.

### Мова і нацыянальная культура

**136.** Прачытайце тэкст.

*Старажытныя* беларускія гарады былі буйнымі цэнтрамі *рамяства*. *Археолагі* падлічылі, што ў Полацку жылі майстры больш чым *шасцідзесяці спецыяльнасцей*: ганчары, *бондары*, шаўцы, *краўцы*, замочнікі, ткачы, меднікі, гарбары-кажамякі... *Жарнасекі* выштукоўвалі з каменю жорны, з *пясчаніку* — *вастрыльныя* брускі, з мяккіх каменных

парод — *абразкі* і крыжыкі. *Касцярэзы* рабілі грабяні, гузікі, *шахматныя* фігуры. Далёка славіліся полацкія ювеліры. З асаблівай павагаю продкі ставіліся да *збройнікаў*. Пра іх *майстэрства* сведчыць, напрыклад, тое, што страла, зробленая добрым лучнікам, нават праляцеўшы сотню *метраў*, лёгка прабівала дубовую дошку *таўшчынёю* з палец.

(*Паводле У. Арлова*)

Выпішыце з тэксту выдзеленыя словы, падзяляючы іх для пераносу (укажыце ўсе магчымыя варыянты пераносу слоў).

Якія словы з тэксту нельга падзяліць для пераносу?

# ПАДАГУЛЬНЕННЕ ВЫВУЧАНАГА

**137.** Адзначце радкі, у якіх усе словы напісаны правільна.

1) хуткасны, наезднік, абвесны, абласны, роднасны, прадвестнік;

2) сур'ёзны, узгор'е, прэмьера, мадэльер, павільён, парц'ера;

3) авіябілет, спецыяліст, рэактар, піяніна, дыялог, сеанс;

4) манументальны, зеленаваты, адвячорак, абмяркоўваць, уцякаць, абеліск;

5) тыраж, экзацічны, традыцыя, сціхія, плаціна, сатырычны.

Якім правілам адпавядае напісанне слоў у кожным радку?

Запішыце словы, у якіх допушчаны памылкі, згодна з арфаграфічнымі нормамі. Растлумачце іх правапіс.

Мова і нацыянальная культура

**138.** Прачытайце тэкст, дайце яму загаловак.

За тры..цаць гадоў служэн..я песен..аму мастацтву (З/з)аслужаная (А/а)ртыстка (Б/б)еларусі Надзея Мікуліч набыла сваё н..паўторнае абліч..а. Пасля заканчэн..я (Г/г)родзенскага (М/м)узычна(?)педагагічнага (В/в)учылішча юная артыстка трапіла ў вакальна(?)інструм..нтальны ансамбль «В..расы» (Б/б)ел(?)дзярж(?)філармоніі. Сярод сваіх маладых кал..ег(?)сяброўак Надзея вызначалася яркімі музычнымі здольнасцямі. Атрымаўшы сп..цыяльнасць дырыжора(?)харавіка, у ансамблі яна хутка навучылася сумяшчаць ігру на электра(?)гітары з вакалам.

Сён..я Надзея Мікуліч — сапраўдны музыкант(?)прафес..іянал са сваім нацы..нальным рэп..ртуарам. «Спеўная душа» Надзеі Мікуліч з году ў год радуе і зачароўвае прыхільнікаў айчын..ай эстрады новымі песнямі.

(*Паводле Г. Загародняга*)

Выпішыце з тэксту па тры-чатыры прыклады слоў (словазлучэнняў), згрупаваўшы іх у адпаведнасці з наступнымі правіламі: 1) «Правапіс галосных *е*, *ё*, *я*»; 2) «Правапіс падоўжаных зычных»; 3) «Правапіс вялікай і малой літар»; 4) «Правапіс слоў разам і праз злучок».

**139.** Запішыце сказы ў адпаведнасці з арфаграфічнымі нормамі, растлумачце правапіс.

1. Шумелі струменчыкі фантана, і дзіцячыя далоні цягнуліся да іх. 2. Брамай даўно не карысталіся — замок стаў чырвоным ад ржы. 3. У твар дзьмуў цёплы паўднёва-усходні вецер. 4. Васілю давялося працаваць каррэспандзентам франтавой газеты. 5. У Мінску створаны Дзяржаўны Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі. 6. Безшумны палёт кажаноў часам палохае людзей. 7. У празрыстай вазёрнай вадзе адлюстроўвалася чэрвенскае солнца.

**140.** Прачытайце тэкст, дайце яму загаловак. Спішыце, рашаючы арфаграфічныя задачы.

Першы помнік зубру ў тыс..ча в..семсот ш..сцідз..сятым год..е паставіў у (Б / б)елаве..скай (П / п)ушчы (Р / р)асійскі імп..ратар (А / а)л..ксандр (Д / д)ругі ў гонар удалага *пал..вання* на нашых асілкаў.

У (В / в)аложыне помнік к..ню ўстанавіў у св..ім парк.. граф (Ю / ю)заф (Т / т)ышкевіч.

У трэц(?)ім тыс..чаго..дзі ў (М / м)інск.., на плошч.. перад (К / к)амароўскім (Р / р)ынкам, так(?)сама з..явіўся бронзавы (К / к)онь. Вунь птушкі паа(б / п)селі бронзавую (Г / г)андлярку: дз(?)ве ў яе на пл..чы, адна на пал..ц села, а чац(?)вёртая ўжо (з / с)пырхнула на м..шок (з / с) семкамі. Вось(?)вось воз(?)мецца іх *дз..ўбаць*.

У (Б / б)абруйск.. помнікам ув..кавечылі бабра. А ў (Б / б)аранавічах помнічкам ушанавалі в..рабейку. І напісалі на пом-

нічку *пя..чотныя* словы: «Да вас я (на) заўсёды прыл..цеў. Не вырай вабіць, а рад..іма».

(*Паводле Я. Сіпакова*)

На якім прынцыпе арфаграфіі грунтуецца напісанне выдзеленых слоў?

**141.** Прачытайце тэкст. Растлумачце паходжанне фразеалагізма *вомегам вылазіць*.

ВОМЕГАМ ВЫЛАЗІЦЬ

Беларускі фразеалагізм *вомегам вылазіць* ужываецца са значэннем ‘адпомсціцца, не праходзіць бясследна’, калі кажуць пра расплату за які-небудзь кепскі ўчынак.

Паходжанне фразеалагізма становіцца зразумелым, калі высветліць сэнс яго першага кампанента. Вомег — другая назва балігалову, двухгадовай расліны з сям’і парасонавых. Пра страшэннай сілы яд, выціснуты з вомегу, ведалі яшчэ ў Старажытнай Грэцыі і карысталіся ім для знішчэння палітычных сапернікаў. Вядома, напрыклад, што філосаф Сакрат быў атручаны вомегам. Лісты і плады вомегу, калі трапяць у ежу, выклікаюць атручванне, знешнім паказчыкам якога з’яўляюцца ваніты.

З цяжкім станам хворага і звязана ўзнікненне спачатку свабоднага словазлучэння *вомег вылазіць*, а потым пераасэнсаванага, у якім пад уплывам фразеалагізма *бокам вылазіць* першы кампанент змяніў форму.

Выслоўе на пачатку свайго жыцця ўжывалася, відаць, толькі ў кленічах і было зламоўным пажаданнем цяжкай хваробы і смерці ад атручвання вомегам.

(*Паводле І. Лепешава*)

Знайдзіце ў тэксце словы, напісанне якіх можа выклікаць у вас цяжкасці, вусна растлумачце іх правапіс.

Закрыйце першы варыянт тэксту і спішыце яго другі варыянт, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі.

## ВОМЕГАМ ВЫЛАЗІЦЬ

Беларускі фраз..лагізм *вомегам вылазіць* ужываецца са значэ(н / нн)ем ‘а(д / т)помсціцца, (не) праходзіць бя..следна’, калі кажуць пра ра..плату за які(?)небудзь кепскі ўчынак.

Паходжа(н / нн)е фраз..лагізм.. становіцца зразумелым, калі высв..тліць сэнс яго першага кампанент.. . Вомег — другая назва балігалов.., двух(?)гадовай расліны з сям..і парасо(н / нн)авых. Пра страшэ(н / нн)ай сілы яд, выц..снуты з вомег.., ведалі яшчэ ў (С / с)тара(?)жытнай Грэцыі і карысталіся ім для знішчэ(н / нн)я палі(ты / ці)чных сапернікаў. В..дома, (на) прыклад, што філосаф Сакрат быў атруча(н / нн)ы вомегам. Лісты і плады вомег.., калі трапяць у ежу, выклікаюць атручва(н / нн)е, знешнім пака..чыкам якога з..яўляюцца ваніты.

З ця..кім станам хворага і (з / с)вяза(н / нн)а ўзнікне(н / нн)е (з / с) пачатку свабоднага сл..вазлучэ(н / нн)я *вомег вылазіць*, а потым пераас..нсава(н / нн)ага, у якім пад уплывам фраз..лагізм.. *бокам вылазіць* першы кампанент (з / с)м..ніў форму.

Выслоўе (на) пачатку свайго жыц..я ўжывалася, відаць, толькі ў кленічах і было зл..моўным пажада(н / нн)ем ця..кай хваробы і смерці ад атручва(н / нн)я вомегам.

Выканайце самаправерку.

### Падагульняльны тэст

**А1.** Напісанне якіх слоў заснавана на марфалагічным прынцыпе арфаграфіі?

1) ляшчына
2) княства
3) жолуд
4) адсутнічаць
5) зменшыць

**А2.** Адзначце словы, у якіх прапушчана літара *э*.

1) распр..гчы
2) інж..нер
3) пр..парат
4) адр..с
5) крат..р

**А3.** Адзначце словы, у якіх прапушчана літара *я*.

1) с..рабро 3) ц..снаваты 5) п..ргамент
2) сц..мнець 4) зав..зь

**А4.** Адзначце словы, у якіх прапушчана літара *е*.

1) в..лікагаловы 3) сярэдн..гадавы 5) гус..гадоўля
2) вугл..кіслы 4) рады..актыўны

**А5.** Адзначце словы, у якіх прапушчана спалучэнне літар *ыя*.

1) д..метр 3) акард..ніст 5) р..німацыя
2) рад..цыйны 4) рац..нальны

**А6.** Адзначце выпадкі, калі пішацца літара *і*.

1) коні ..мчацца 4) капот ..ржавы
2) малы ..лгун 5) вока..мгненна
3) за..мшэлы камень

**А7.** Адзначце словы, у якіх прапушчана літара ы.

1) уз..шоў 3) контр..гра 5) пад..граць
2) спад..лба 4) звыш..мклівы

**А8.** Адзначце правільна запісаныя словы.

1) налатчык 3) бешчалавечны 5) баскетбол
2) лёччык 4) касьба

**А9.** Адзначце словы, у якіх прапушчана літара ц.

1) парахо..тва 3) узбе..кі 5) аген..тва
2) студэн..кі 4) баранаві..кі

**А10.** Адзначце словы, у якіх пішацца спалучэнне літар дз.

1) (ды / дзі)ктар 4) по(д / дз)віг
2) брыга(ды / дзі)р 5) (Д / Дз)віна
3) пе(ды / дзі)ятр

**А11.** Адзначце словы, у якіх прапушчана літара.

1) двукос..е 3) кал..ектыў 5) Жан..а
2) (з) упартасц..ю 4) піц..а

**А12.** Адзначце словы, у якіх пішацца літара *в*.

1) на..обмацак 3) ..углаваты 5) на..огул
2) ..востраў 4) ..астравок

**А13.** Адзначце словы, у якіх пішацца літара *ў*.

1) краіны ..сходу 3) гучнае «..ра» 5) са..на
2) со..с 4) каля ..нівермага

**А14.** Адзначце словы, у якіх пішацца мяккі знак.

1) чэрвен..скі 3) ц..вік 5) восем..сот
2) любан..скі 4) дз..мухавец

**А15.** Адзначце выпадкі, калі пішацца вялікая літара.

1) (О / о)рдэн Францыска Скарыны
2) (К / к)упалаўскі тэатр
3) (Н / н)апалеонаўскія планы
4) (П / п)лошча Перамогі
5) (П / п)алац мастацтваў

**А16.** Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок.

1) спарт(?)клуб 4) паў(?)Гомеля
2) крыж(?)накрыж 5) анты(?)фашысцкі
3) паў(?)лыжкі

**В1.** Ад назоўнікаў *жыццё* і *радасць* утварыце і запішыце складаны прыметнік, што мае значэнне 'які радуецца жыццю, не ведае тугі'.

**В2.** Ад назоўніка *крыўда* з дапамогай прыстаўкі і суфікса ўтварыце і запішыце прыметнік, што мае значэнне 'які не робіць крыўды, не прыносіць непрыемнасцей або шкоды'.

**В3.** Запішыце згодна з арфаграфічнымі нормамі слова, у якім дапушчана памылка.

1) хуткасны 3) пырснуць 5) масштаб
2) шчаслівы 4) посны

**В4.** Падбярыце і запішыце беларускі адпаведнік да слова *трехъярусный*.

# ТЭКСТЫ ДЛЯ САМАПРАВЕРКІ

## РУСАЛЬНЫ ТЫДЗЕНЬ (*с. 71—72*)

Прыйшоў Русальны тыдзень.

Азярышчанскія дзяўчаты звівалі вянкі і вешалі іх на бярозах. А хлопцы неслі на зялёных насілках у бярозавы гай абраную ўсімі русалку — самую ладную дзяўчынку, якая знайшлася ў Азярышчы. Гэта была трынаццацігадовая Янька Кагут.

З распушчанымі валасамі, яна пагойдвалася ў сінім небе. І свежы, пяшчотны тварык дзяўчыны ўсміхаўся сонцу, нівам і зялёным гаям. А за ёю ішла ў вянках яе прыгожая світа.

...Палілі агні. Кідалі ў іх вянкі. Дзяўчаты ўцякалі ад Янькі, а яна лавіла іх і казытала.

## «ПЕСНЯРЫ» (*с. 93—94*)

На высокі ўзровень беларускую народную песню паднялі «Песняры» — вакальна-інструментальны ансамбль пад кіраўніцтвам Уладзіміра Мулявіна. Усюды ансамбль прымалі сардэчна і з захапленнем, з воплескамі. Як зайграюць і заспяваюць «Песняры» дзе-небудзь у Індыі ці Францыі «Скрыпяць мае лапці», зала адразу ўзрывалася апладысментамі.

Яны вазілі па свеце песні нашых выдатных кампазітараў на словы беларускіх паэтаў: «Спадчыну» Я. Купалы, «Мой родны кут» Я. Коласа, «Вераніку» М. Багдановіча, «Алесю» А. Куляшова, «Жураўлі на Палессе ляцяць» А. Ставера.

Абвінаваціць іх у нацыяналізме было немагчыма, бо Уладзімір Георгіевіч Мулявін — карэнны сібірак рускі па нацыянальнасці.

«Песняры» аб’ехалі амаль увесь свет. Дзякуючы ім людзі адкрывалі Беларусь і яе песенную культуру... «Пес-

няры» дванаццаць разоў атрымлівалі гран-пры на прэстыжных міжнародных фестывалях і конкурсах. Дыскі з запісамі іх песень выдаваліся мільённымі тыражамі.

## АДЗНАКІ ЗА КАНТРОЛЬНУЮ (*с. 115—116*)

Грыша, якому вучоба давалася без асаблівых цяжкасцей, меў у сваім характары адну дрэнную рысу. Ён быў упэўнены, што выдатныя адзнакі заслужана ўпрыгожваюць толькі яго дзённік, а астатнім вучням яны ставяцца проста так...

Усё адбылося ў суботу, пасля раздачы кантрольных па алгебры. Быццам у насмешку, амаль палова класа атрымала пяцёркі, а Грышу паставілі няшчасную чацвёрку!

Пяцёрку атрымаў і Лёня. Не хаваючы свайго расчаравання, Грыша ўзяў Лёнеў сшытак і, насмешліва разглядаючы яго, голасна сказаў:

— Цікава выходзіць! Хто спісваў, у таго пяцёрка...

— А хто ў цябе спісваў? — раззлаваўся Лёня.

Тут умяшаўся настаўнік і спыніў спрэчку.

## КЛЁН (*с. 141*)

Дзякуючы салодкаму соку клён стаў нацыянальным сімвалам Канады. Яго пунсовы ліст адлюстраваны на сцягу гэтай дзяржавы. З пяці тысяч эскізаў канадцы выбралі кляновы ліст. Канада — краіна цукровых клёнаў. Штогод з іх збіраюць каля чатырох мільёнаў кілаграмаў цукру. Кляновая гаспадарка ў гэтай краіне з'яўляецца сур'ёзнай галіной прамысловасці.

Клён не толькі «салодкае», але і «спеўнае» дрэва. З яго робяць музычныя інструменты. Яшчэ клён — сапраўдны барометр. Калі ў тым месцы, дзе лісцікі сваімі ножкамі мацуюцца да галінак, прасочваюцца кропелькі вільгаці, хутка пойдзе дождж. «Плача» клён — не забудзьце захапіць на вуліцу парасоны.

# КАРОТКІ АРФАГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК

авантпосны
адажыа
андэграўнд
аўтсайдар
аўтсайдарскі
баласны
бартар
бартарны
васьмідзясяты
васямнаццаты
васямнаццаць
Ватэрлоа
Гумбальт
джоўль
дзявяты
дзяржаўны ўніверсітэт
дзясятка
дзясятнік
дзясяты
дэзынтэгратар
дэзынтэграцыя
дэзынфармаваць
дэзынфармацыйны
дэзынфармацыя
дэзынфекцыйны
дэзынфіцыраванне
дэзынфіцыраваны
дэзынфіцыраваць
дэкодар
есавул
есавульскі
каля ўніверсама
кампосны
камп’ютар
камп’ютарны
камп’ютаршчык
кантрасны
клоўн
Кранштат
лакаўт
менеджар
на ўнікальным матэрыяле
ноўтбук
Нью-Ёрк
пакгаўз
панэль
партфоліа
прынтар
прынтарны
пяцідзясяты
пяцьдзясят
раўнд
раўт
рэзюмэ
Рэмбрант
сальфеджыа
саўна
світар
субынспектар
сямідзясяты
сямнаццаты
сямнаццаць
Токіа
тунэль
трыа
фарватар
фарватарны
фарпосны
фаўна
царква ўніяцкая
цянь-шанскі
чань-чунскі
шасцідзясяты
Шміт
шніцаль
шоўмен
шэсцьдзясят
экзэмпляр
эспандар

# ЗМЕСТ

Вучэбная праграма . . . 3
Метадычныя рэкамендацыі . . . 9
Прыкладнае тэматычнае планаванне вучэбнага матэрыялу . . . 9
Уводзіны . . . 11
Правапіс галосных . . . 14
Правапіс зычных . . . 28
Правапіс мяккага знака і апострафа . . . 41
Ужыванне вялікай і малой літар . . . 44
Агульныя правілы напісання слоў разам і праз злучок . . . 48
Правілы пераносу слоў . . . 50
Падагульненне вывучанага . . . 50
Адказы да тэставых заданняў . . . 52
Літаратура . . . 53
Дыдактычныя матэрыялы . . . 55
Уводзіны . . . 55
Правапіс галосных . . . 60
Правапіс зычных . . . 95
Правапіс мяккага знака і апострафа . . . 133
Ужыванне вялікай і малой літар . . . 143
Агульныя правілы напісання слоў разам і праз злучок . . . 158
Правілы пераносу слоў . . . 164
Падагульненне вывучанага . . . 167
Тэксты для самаправеркі . . . 173
Кароткі арфаграфічны слоўнік . . . 175